Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 КРАСАВІКА 2009 г.
АЎТОРАК
№ 69
(26427)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

Адрасная сацыяльная дапамога, падтрымка маламаёмных грамадзян, ветэранаў і інвалідаў — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ, начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО і начальніка аддзела па справах ветэранаў Івана Пятровіча НАГІБІНА. «Прамая лінія» пройдзе сёння з 11 да 12 гадзін па тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Беларусь запрашае катарскі бізнэс да супрацоўніцтва ў сферы інвестыцый і іншых галінах

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з Эмірам Дзяржавы Катар шэйхам Хамадам бен Халіфой аль-Тані.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў, што паміж Беларуссю і Катарам намеціліся добрыя перспектывы супрацоўніцтва. «Мы можам прапанаваць шэраг варыянтаў, па якіх вы можаце інвеставаць у Беларусь. Мы хочам, каб пасля вашага візіту канкрэтныя прадпрымальнікі, бізнэсмены вывучылі сітуацыю. І калі гэта вам выгадна, прыязджайце, мы створым добрыя ўмовы для работы вашых кампаній у Беларусі».

Вітаючы высокага госця, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не так часта даводзіцца сустракаць у Беларусі кіраўнікоў арабскіх краін. Ён таксама з задавальненнем успомніў свой візіт у Катар у лютым 2001 года, калі змог уважліва азнаёміцца з эканомікай, выдатнымі мясцінамі, патэнцыялам гэтай дзяржавы.

У сваю чаргу Эмір Катара падкрэсліў зацікаўленасць сваёй краіны ў развіцці двухбаковых адносінаў у такой сферы, як інфармацыйныя тэхналогіі.

«Рады, што мы дасягнулі згоды працаваць разам у трэціх краінах, рэалізоўваць канкрэтныя праграмы, асабліва ў тых дзяржавах, у якія вы інвестуеце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Супрацоўніцтва «на аснове беларускіх тэхналогій, тэхнікі з удзелам фінансаў катарскага боку прынясе нам вельмі вялікія дывідэнды», — падкрэсліў ён.

Інтарэс катарскага боку можа быць таксама рэалізаваны ў энергетыцы, тэлекамунікацыях, будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, у стварэнні сумесных вытворчасцяў прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання, камерцыялізацыі існуючых у Беларусі высокіх тэхналогій, а таксама ў сферы турызму, гасцінічнага бізнэсу.

«Лічу, што далейшае паглыбленне супрацоўніцтва з нашай краінай можа адкрыць перад Катарам добрыя магчымасці для развіцця адносінаў з усім рэгіёнам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, усёй постсавецкай прасторы. Бо Беларусь тут з'яўляецца важным эканамічным і палітычным фактарам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сустрэча з Эмірам Катара з'яўляецца чарговым пацвярджэннем сапраўды дружалюбных адносінаў паміж дзвюма краінамі. У Беларусі ўважліва сочаць за поспехамі Дзяржавы Катар, яе імклівым эканамічным развіццём, а таксама высока цэняць намаганні і дасягненні Катара ў знешняй палітыцы, адзначаючы яго важную ролю ў падтрыманні рэгіянальнай бяспекі.

Беларусь і Катар заключылі міжурадавае пагадненне аб заснаванні Сумеснага Камітэта.

Высокі госць падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за плённае супрацоўніцтва дзвюх краін у рамках міжнародных арганізацый, за падтрымку ў вылучэнні кандыдатуры Катара на пастаянныя члены Савета Бяспекі ААН і выказаў надзею на прадаўжэнне такога канструктыўнага дыялога.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

БЛАСЛАЎЛЁНЫЯ КВЕТКІ

Жыхар г.п. Поразава Свіслацкага раёна Юрый ШКУЛЕПА і яго маленькая суседка Лізавета БАЛЮК з вербачкамі, якія асвяцілі ў мінулую нядзелю ў мясцовай царкве.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шматфункцыянальны комплекс «Мінск-Арэна» павінен быць поўнасцю здадзены ў эксплуатацыю да 7 лістапада

Такую задачу паставіў 11 красавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы будаўніцтва гэтага аб'екта.

Комплекс «Мінск-Арэна» — унікальны аб'ект, які не мае аналагаў па складанасці і функцыянальнасці не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Ён уключае ў сябе шматфункцыянальную спартыўна-відовішчную арэну з трыбунамі на 15 тыс. гледачоў, канькабежны стадыён, разлічаны на 3 тыс. гледачоў, веладром на 2 тыс. гледачоў, шматузроўневую аўтастаянку.

«Па маштабах будаўніцтва, па складанасці работ, што выконваюцца, архітэктуры, задуме «Мінск-Арэна» на парадак вышэй, чым Нацыянальная бібліятэка», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся таксама тым, як сёння задзейнічаны велатрэк комплексу «Мінск-Арэна», адкрыты ў снежні мінулага года. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што велатрэк павінен быць максімальна загружаны. «Мы пабудавалі яго не для таго, каб ён пуставаў», — сказаў Прэзідэнт. Ён жорстка крытыкаваў будаўнікоў за тое, што ў першым квартале 2009 года яны не ўстаранілі ўсе недахопы, якія засталіся, і даручыў да 1 мая выправіць сітуацыю.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся таксама з планамі па будаўніцтве яшчэ аднаго шматфункцыянальнага комплексу ў Мінску, які размесціцца ў мікрараёне Чыжоўка. Плануецца, што новы аб'ект — лядовы палац — будзе ўмяшчаць амаль 8 тыс. гледачоў. Як далажылі Прэзідэнту, калі будаўнічыя работы пачнуцца ў бліжэйшы час, то ў пачатку 2011 года там ужо можна будзе праводзіць першыя мерапрыемствы. Як лічыць кіраўнік дзяржавы, будаўніцтва гэтага комплексу дасць магчымасць беларускай сталіцы прыняць чэмпіянат свету па хакеі 2014 года. Але галоўнае, што ў буйным сталічным мікрараёне, параўнальным па колькасці жыхароў з сярэднім горадам, з'явіцца такі неабходны буйны спартыўны аб'ект.

Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб планах па ўзвядзенні ў сталіцы воднаспартыўнага цэнтра на праспекце Пераможцаў, які зможа прымаць міжнародныя спаборніцтвы самага высокага ўзроўню і будзе ўключаць у сябе некалькі басейнаў рознага прызначэння.

Потым Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у рэспубліканскім суботніку. У гэтым годзе кіраўнік дзяржавы займаўся ўкладкай бетону ў падмурак будучай алеі Спартыўнай славы, якая будзе фарміравацца галоўны ўваход на тэрыторыю комплексу. У будучым тут установяць памятныя знакі з імёнамі алімпійскіх чэмпіёнаў.

У складзе брыгады, у якой працаваў Прэзідэнт, быў кіраўнік штаба па будаўніцтве комплексу Уладзімір Навумаў, генеральны дырэктар ТАА «Трайпл» Юрый Чыж, а таксама вядомыя спартсмены і трэнеры, рабочыя, занятыя на будаўніцтве «Мінск-Арэны».

Завяршыўшы работу, кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні журналістаў.

Прэзідэнт лічыць неабходным захаваць традыцыю правядзення суботнікаў. «Можа, штосьці ў ідэі правядзення суботнікаў і ўстарэла, але справа ж добрая. Увесь народ выйшаў на суботнік, робіць карысную справу, значыць, гэта трэба захаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што «іншай формы іх правядзення пакуль не прыдумалі».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Будзе ўмерана цёпла

15 красавіка на ўсходзе, а ў пятніцу, 17 красавіка, на паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 6, а днём ад 7 да 15 градусаў цяпла. На паўднёвым захадзе — да 18 градусаў. У суботу, 18 красавіка, пройдзе кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ў ноч на суботу, 18 красавіка, — 2—8 градусаў цяпла, па поўначы каля нуля градусаў. Днём 8—15 градусаў.

БЕЛТА.

Новая хваля інтэрнэт-пірацтва

Будзь у курсе!

Больш як 20 мінчан — абанентаў «Белтэлекам» — будуць вымушаны аплачваць у растэрміноўку рахункі на буйныя грашовыя сумы. Усе яны сталі ахвярамі ўдачнага «палявання» на іх інтэрнэт-піратаў і, як ні сумна, уласнай няўважлівасці. Між іншым, размова ідзе пра сотні тысяч рублёў...

Як тлумачаць у РУП «Белтэлекам», усе пацярпелыя карыстаюцца камутуемым доступам у Сусветную павуціну, для якога патрабуецца мадэм, які набірае нумар аператара для выхаду ў інтэрнэт. Такі ж прынцып спалучэння выкарыстоўваюць і інтэрнэт-піраты, ствараючы спецыяльныя праграмы — так званыя «званілкі», якія самі набіраюць патрэбныя нумары. І калі выпадкова скачаць у інтэрнэце такую праграму, то ў момант падключэння да інтэрнэта адбываецца разрыў спалучэння з мясцовым інтэрнэт-аператарам і ажыццяўляецца міжнароднае спалучэнне з серверам, устаноўленым у іншай краіне. Вы працягваеце працаваць у інтэрнэце, не падазраючы, што аплачваць знаходжанне ў Сусветнай павуціне давядзецца па тарыфах міжнародных правайдараў, значна больш высокіх. Як правіла, праграмы-«званілкі» размяшчаюцца на сайтах, зместе якіх вельмі сумніўны ў маральным і этычным плане. Вясной 2009 года «Белтэлекам» зафіксаваў новую хвалю званкоў, здзейсненых беларусамі на платныя нумары ў Балгарыю, Сьера Леоне і ў іншыя краіны.

Для таго, каб пазбегнуць непажаданага спалучэння з іншай краінай, трэба ўважліва чытаць паведамленні, якія з'яўляюцца на экране перад загрузкай нейкай праграмы з інтэрнэта. Калі вы бачыце прапанову «паскорыць спалучэнне» ці «набраць выдалены нумар», ні ў якім разе на яе не пагаджайцеся. Калі паведамленне размяшчаецца на замежнай мове, і вы не ведаеце дакладна, што яно можа азначаць, не націскайце ОК або разарвіце спалучэнне, выключыўшы мадэм. Калі на экране вашага камп'ютара з'яўляецца дыялогавае акенца з інфармацыяй пра тое, што ідзе набор нумара, які вы не даручалі яму набіраць, анулюйце такое спалучэнне.

Абавязкова ўключыце гук у настройках вашага мадэма. Калі вы пачулі па характэрным гуку, што мадэм самаадвольна ўстанаўлівае спалучэнне, перарвіце працэдуру, адключыўшы мадэм ад тэлефоннай сеткі. Пасля гэтага абавязкова праверце настройкі «выдаленага спалучэння па замоўчванні», наяўнасць новых спалучэнняў і наяўнасць праграм (спасылак, ярлыкоў), якія вамі не ствараліся і не ўстанаўліваліся. Патлумачце дзецям небяспеку загрузкі невядомых праграм і кантралюйце знаходжанне вашых дзяцей у інтэрнэце, правяраючы гісторыю наведвання вэб-сайтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

УНП 806000232

Республиканского унитарного предприятия «Белорусская национальная перестраховочная организация» за 2008 год

млн руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
Основные средства	220,2	Источники собственных средств — всего	412269,7
Нематериальные активы	14,1	В том числе: уставный фонд	407487,7
Финансовые вложения — всего	352031,5	резервный фонд	7,7
В том числе: инвестиции в дочерние общества		добавочный фонд	234,6
инвестиции в другие организации	350000,0	фонд накопления	
облигации и другие долговые обязательства	2031,5	фонд потребления	
прочие финансовые вложения		целевое финансирование	
Доля перестраховщиков в страховых резервах	3474,5	нераспределенная прибыль прошлых лет	
Дебиторы — всего	21,6	нераспределенная прибыль отчетного года	4539,7
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	0,5	Страховые резервы и фонды — всего	8455,2
		В том числе: страховые резервы	8455,2
депо премий по рискам, принятым в перестрахование		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	
		гарантийные фонды	
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	21,1	Кредиторы — всего	609,2
Прочие активы — всего	65961,5	В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	
В том числе: незавершенное строительство	26,2	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	
материальные ценности и затраты	198,0	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	
денежные средства	65737,3	заемные средства	
собственные акции (доли)		кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	609,2
прочие активы			
Непокрытые убытки прошлых лет		Прочие пассивы	389,3
Непокрытые убытки отчетного года			
БАЛАНС	**421723,4**	**БАЛАНС**	**421723,4**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ

Республиканского унитарного предприятия «Белорусская национальная перестраховочная организация» за 2008 год

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
1. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	010	
Страховые выплаты	020	
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	
Отчисления в гарантийный фонд	040	
Расходы на ведение дела	041	
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	
2. Страхование иное, чем страхование жизни Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	10033,2
Изменение резерва незаработанной премии – нетто-перестрахование (+ или -)	067	-2300,6
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто-перестрахование	082	1859,2
Изменение резервов убытков – нетто-перестрахование (+ или -)	092	-1228,1
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	
Расходы на ведение дела	120	1772,1
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	350,6
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	1668,3
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	1555,5
3. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы 1 и 2		
Операционные доходы	140	7664,7
Операционные расходы	145	0,3
Внереализационные доходы	150	674,8
Внереализационные расходы	155	1070,6
Финансовый результат	157	8824,1
Использовано прибыли	158	4284,4
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	4539,7

Генеральный директор **С.П. Мисюров**

Главный бухгалтер **А.Ю. Черная**

ИТОГОВАЯ ЧАСТЬ АУДИТОРСКОГО ЗАКЛЮЧЕНИЯ

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность Государственного предприятия «Белорусская национальная перестраховочная организация», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Государственного предприятия «Белорусская национальная перестраховочная организация» на 01.01.2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год, при этом совершенные Государственным предприятием «Белорусская национальная перестраховочная организация» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Директор ОДО «ГлобалАудит» **Матюшонок С.А.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 825,00
▲ 1 еўра	3 728,44
1 латвійскі лат	5 263,65
1 літоўскі літ	1 080,84
1 чэшская крона	141,38
1 польскі злоты	858,27
▲ 1 расійскі рубель	84,36
1 украінская грыўня	353,35

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,4863
10 UAH	41,7535
1000 BYR	11,8076
EUR	44,1986

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Рынак працы

«Песімістычны варыянт» не спрацаваў?

Службы занятасці Беларусі не маюць звестак аб масавых скарачэннях работнікаў у найбліжэйшай будучыні — аб гэтым паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай КОХАНАЎ.** Паводле заканадаўства, такія звесткі павінны падавацца найманымі работнікамі загадзя — за два месяцы да меркаваных звальненняў.

Разам з тым даводзіцца канстатаваць: з пачатку года колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных павялічылася з 37,3 да 43,9 тысячы чалавек, адначасова за гэты ж час у краіне зменшылася (з 50,7 да 41,6 тысячы) колькасць вакансій. Праўда, агульная сітуацыя на рынку працы не пайшла па песімістычным сцэнарыі. Чакалася, што па выніках першага квартала сёлета ўзровень беспрацоўя будзе вагацца ў межах 1,1-1,2 %. На справе ж па стане на пачатак красавіка гэты паказчык быў меншым — 1 % ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі.

Дарэчы, адзначылі ў міністэрстве, утрымаць сітуацыю пад кантролем дапамаглі актыўныя захады на рынку працы. З пачатку года праз службы занятасці ўдалося ўладкаваць 38,4 тысячы чалавек, 5,7 тысячы беспрацоўных прайшлі прафесійнае перанавучанне, а 120 сем'яў пераехалі на новае месца жыхарства і працы — як правіла, у сельскую мясцовасць.

Сяргей ГРЫБ.

Твае правы

Лепш пераносіць, чым водпуск без аплаты

Няпоўны працоўны тыдзень, прастоі, магчымыя скарачэнні — вось ці не самыя папулярныя тэмы для размоў апошняга часу. Сапраўды, даводзіцца канстатаваць, што масавых звальненняў работнікаў, а тым больш закрыцця прадпрыемстваў у Беларусі пакуль не было. І разам з тым ведаць, як паводзіць сябе ў «форс-мажорных» сітуацыях, справа таксама нялішняя. Каго і на якіх умовах могуць часова перавесці на іншую працу, як змяняюцца ўмовы аплаты, а таксама калі магчыма накіраванне ў водпуск без захавання зарплаты? Разабрацца з усім гэтым мы паспрабуем з дапамогай загадчыка юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарата Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзіміра Іванавіча ШАЛКОВІЧА.

Іншае месца — не назаўсёды

Няма заказаў — і няма работы. На жаль, сёння для многіх прадпрыемстваў гэта сітуацыя стала амаль звычайнай. Між тым, ці магчыма ў такіх варунках... даручэнне персаналу выканання якіх-небудзь «дадатковых» работ?

— У выпадку вытворчай неабходнасці наймальнік можа перавесці супрацоўніка на іншую, не абумоўленую працоўным дагаворам, работу — у тым ліку па іншай спецыяльнасці, кваліфікацыі, на іншую пасаду. Апроч таго, магчымы нават часовы перавод да іншага наймальніка, — адзначае Уладзімір Шалковіч. — Прычым пад вытворчай неабходнасцю тут маецца на ўвазе неабходнасць папярэджання катастрофы ці аварыі, ліквідацыі іх наступстваў, наступстваў стыхійнага бедства, папярэджання няшчасных выпадкаў, прастою, знішчэння маёмасці наймальніка або іншай маёмасці, астатнія выключныя выпадкі, а таксама замена работніка, які часова не можа выконваць свае абавязкі.

Разам з тым трэба памятаць некалькі нюансаў. Па-першае, супрацоўніка нельга пераводзіць на работу, якая супрацьпаказана яму па стане здароўя. Па-другое. Часовы перавод у сувязі з вытворчай неабходнасцю без згоды работніка робіцца максімум на месяц, а ў сувязі з неабходнасцю замены калегі, які не можа выконваць свае абавязкі, такі перавод не можа быць большым за месяц на працягу каляндарнага года — з 1 студзеня па 31 снежня. Праўда, па пагадненні бакоў гэтыя тэрміны могуць быць павялічаныя.

Трэці цікавы момант. Часовы перавод у сувязі з вытворчай неабходнасцю ў іншую мясцовасць дапушчальны выключна са згоды работніка. І ці не галоўнае. Пры часовым пераводзе зарплата на новым месцы можа быць большай, чым на месцы ранейшым. Аднак атрымліваць менш работнік не павінен.

— Асобная размова аб часовым пераводзе ў выпадку прастою, адсутнасці работы на працягу да 6 месяцаў, — працягвае Уладзімір Шалковіч. — У «сваёй» арганізацыі падчас прастою перавод работніка з улікам прафесіі, спецыяльнасці ці пасады можа рабіцца на ўсе 6 месяцаў. А вось перавод да іншага наймальніка ўжо абмежаваны месяцам. Прычым ні ў адным, ні ў другім выпадку перавод у сувязі з прастоем у іншую мясцовасць не дапускаецца. Што ж да аплаты, то пры ўмове выканання ўсіх нормаў зарплата работнікаў-«пагадзіннікаў» пасля пераводу зноў-такі не можа быць меншай, чым зарплата на ранейшым месцы. А работнікам, якія нормы не выконваюць, аплата робіцца паводле фактычных вынікаў працы, але яна не ніжэйшая за іх тарыфную стаўку.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ВТБ

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.11.2007 г. № 23, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 101165625

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	27 619,6	8 754,5
3	Средства в Национальном банке	1102	95 466,5	18 678,1
4	Ценные бумаги:	1103	47 870,4	41 127,1
	для торговли	11031	47 870,4	38 123,0
	удерживаемые до погашения	11032	—	3 004,1
	в наличии для продажи	11033	—	—
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	307 755,5	281 519,0
6	Кредиты клиентам	1106	994 977,4	511 416,9
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	470,7	450,6
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	47 192,6	23 512,4
9	Прочие активы	1109	10 340,4	3 238,2
10	ИТОГО активы	110	1 531 693,1	888 696,8
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	23 577,6	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	410 837,2	319 798,8
14	Средства клиентов	1206	862 537,6	437 269,4
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	19 499,0	0,1
16	Прочие обязательства	1209	21 282,4	7 801,9
17	ВСЕГО обязательства	120	1 337 733,8	764 870,2
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	84 264,6	40 005,6
20	Эмиссионный доход	1212	34 320,3	34 320,3
21	Резервный фонд	1213	16 891,6	13 553,6
22	Накопленная прибыль	1214	46 041,9	27 736,5
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	12 440,9	8 210,6
24	ВСЕГО капитал	121	193 959,3	123 826,6
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	1 531 693,1	888 696,8
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	643 537,3	186 396,7
28	Обязательства	1302	471 080,9	217 134,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	38 898,1	13 276,0
2	Процентные расходы	2012	21 350,8	7 059,4
3	Чистые процентные доходы	201	17 547,3	6 216,6
4	Комиссионные доходы	2021	6 479,6	3 720,2
5	Комиссионные расходы	2022	966,7	341,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	5 512,9	3 379,1
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	(-3 384,6)	2 482,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	86,3	14,2
9	Доход в форме дивидендов	205	—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	9 318,4	(-116,0)
11	Прочие доходы	207	18 812,9	63,6
12	Операционные расходы	208	12 097,1	7 455,2
13	Прочие расходы	209	7 895,6	375,8
14	Налог на прибыль	210	2 590,9	682,6
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	6 672,8	3 758,6

Председатель Правления **В.В. Иванов**

Главный бухгалтер **М.В. Дудко**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЭМ'ЕР ТАЙЛАНДА ЗАЯВІЎ АБ ПАДАЎЛЕННІ МАСАВЫХ БЕСПАРАДКАЎ

Па словах прэм'ера, у панядзелак, 13 красавіка, пацярпелі дзясяткі маніфестантаў.

Паліцэйскія адкрылі па іх агонь, пакалекі ўдзельнікі антыўрадавых акцый пачалі шпурляць у вартавых парадку камяні і бутэлькі з запальнай сумессю. Падчас беспарадкаў ля будынка ўрада раненні атрымалі 94 чалавекі, з іх чатыры дэманстранты атрымалі агнястрэльныя раненні. У будынку ўрада пачаўся пажар, верагодна, з-за кінутай самаробнай бомбы. Нагадаем, у красавіку 2009 года ў Тайландзе аднавіліся масавыя выступленні прыхільнікаў былога прэм'ера краіны Таксіна Чынавата, звергнутага ў 2006 годзе ў выніку ваеннага перавароту. Дэманстранты патрабавалі адстаўкі ўрада Апхісіты Ветчачывы. Хваляванні закранулі больш за 29 правінцый. 12 красавіка 2009 года ў Бангкоку было ўведзена надзвычайнае становішча. У горад увайшлі войскі і танкі, і паміж ваеннымі і маніфестантамі адбыліся сутыкненні.

ПАЖАР У ПОЛЬШЧЫ Ў ПРЫТУЛКУ ДЛЯ БЯЗДОМНЫХ ЗАБРАЎ ЖЫЦЦІ 21 ЧАЛАВЕКА

У выніку пажару ў прытулку для бяздомных і малазабяспечаных у горадзе Камень-Паморскі на паўночным захадзе Польшчы загінуў па меншай меры 21 чалавек, больш за 20 чалавек пацярпелі.

Пажар пачаўся ў ноч з нядзелі на панядзелак у прытулку, дзе начавалі па меншай меры 77 чалавек. Многія людзі атрымалі пераломы, калі выскоквалі з вокнаў падпаленага будынка. Пажарнікам даводзілася падхопліваць дзяцей, якіх бацькі выкідвалі з вокнаў. Колькасць загінулых можа вырасці. Выратавальнікі працягваюць пошукі людзей у разбураным будынку. Прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі абвясціў у краіне жалобу ў сувязі з трагедыяй.

ЛЕДЗЯНОЕ ВЕЛІКОДНАЕ ЯЙКА — 500 КГ

На Вялікдзень у Маскве зробяць ледзяное яйка вагой у 500 кілаграмаў. Вышыня яго складзе 2 метры.

Вырабам яйка зоймуцца скульптары з «Галерэі рускай лёдавай скульптуры». Спецыялісты будуць арыентавацца на знакамітыя працы Карла Фабержэ. Скульптары маюць намер падаць заяўку на ўключэнне ледзянога велікоднага яйка ў Кнігу рэкордаў Гінэса. Гэтае яйка ўстановяць 19 красавіка, у нядзелю, у парку культуры і адпачынку «Чырвоная Прэсня», які размешчаны ў цэнтры горада.

Ліміт росту цэнаў на прадукты

Рост адпускных цэнаў на айчынныя прадукты харчавання сёлета не павінен перавышаць 0,8-0,9 % у месяц. Аб гэтым паведаміла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына ГУСЕВА.

Цана на прадукцыю, вызначаная з перавышэннем прагнозу, будзе праходзіць спецыяльную экспертызу. Апроч таго, як адзначыла Ірына Гусева, у канцэрне маюць намер кантраляваць кошт імпартных інгрэдыентаў у прадуктах харчавання, а таксама зніжаць выдаткі вытворчасці. Адначасова вызначана: у выпадках неабгрунтаванага павелічэння адпускных цэнаў на прадукцыю айчыннай харчовай прамысловасці ў дачыненні да кіраўнікоў прадпрыемстваў будуць ужывацца меры дысцыплінарнай адказнасці — аж да скасавання кантрактаў.

Сяргей ГРЫБ.

ПАД КОЛЫ ТРАПІЛІ ТРЫ ПЕШАХОДЫ

У Мінску ў нядзелю 28-гадовая кіроўца «Фольксвагена Гольф» на вуліцы Нарачанскай пасля наезду на «Сітраен», што стаяў ля краю праезнай часткі, учыніла наезд на трох пешаходаў, якія перасякалі праезную частку.

Аднаго з пешаходаў, маладога чалавека 1987 года нараджэння, ад удару адкінула на аўтамабіль «Мазда», якія стаяў ля краю праезнай часткі: сваім целам пацярпелы разбіў задняе ветравое шкло. У яго пералом галоўкі левай лучавой косці. У 17-гадовай дзяўчыны і 21-гадовага маладога чалавека сінякі і драпіны.

Ігар ГРЫШЫН.

У РАЦЭ ЗНОЙДЗЕНА ЦЕЛА ВАЙСКОЎЦА

У мінулую суботу ў Мінску было знойдзена цела вайскоўца, які знік сёлета ў лютым.

Цела 24-гадовага вайскоўца адной з вайсковых часцей было знойдзена раніцай у рацэ Свіслач ля дома 2 па вуліцы Кастрычніцкай і выцягнутае з вады. Паводле звестак ГУУС, бачных прыкмет гвалтоўнай смерці пацярпелага не было.

Ігар ГРЫШЫН.

АВАРЫЙНЫЯ ВЫХАДНЫЯ

Пра зімовы галалёд вадзіцелі ўжо забыліся, але не варта забывацца на асцярожнасць і ўважлівасць. Прэс-служба ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама паведаміла пра аварыі, якія адбыліся ў вобласці за два выхадныя дні.

11 красавіка раніцай у Бабруйскім раёне паблізу вёскі Дойнічава 23-гадовы мінчанін на аўтамабілі «Мазда» на закругленні дарогі не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет і абрынуўся ў сажалку, дзе машына патанула. У выніку пасажыркі, 50-гадовая жанчына і 3-гадовая дзяўчынка, ледзь не патанулі і цяпер шпіталізаваныя.

12 красавіка ў Асіповіцкім раёне паблізу пасёлка Ялізава 29-гадовы бабруйчанін, які ехаў на аўтамабілі «Аўдзі-80», не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет і перакуліўся. У выніку 18-гадовы пасажыр ад атрыманых траўмаў памёр на месцы.

У гэты ж дзень надвячоркам на аўтадарозе «Магілёў — Мінск» паблізу раённага цэнтра Бялынічы 30-гадовая магіляўчанка за рулём аўтамабіля «Фальксваген Пасат» наўдалую пайшла на абгон там, дзе ён быў забаронены, і стварыла аварыйную сітуацыю. Але пацярпеў не «Фальксваген Пасат», а іншыя аўтамабілі, якія ехалі побач. «Фальксваген Пола», які імкнулася абагнаць магіляўчанка, сутыкнуўся з сустрэчнай «Маздай»: 25-гадовая вадзіцель «Мазды» і дзве пасажыркі атрымалі траўмы і шпіталізаваныя.

У нядзелю ў Магілёве 21-гадовая гараджанка на аўтамабілі «Фальксваген Гольф» на вуліцы Першамайскай у цэнтры горада сутыкнулася з машынай «хуткай дапамогі», якая рухалася з уключанай гукавой і светлавой сігналізацыяй. Пасля гэтага «Фальксваген» сутыкнуўся яшчэ з двума «Фордамі». Траўмы атрымала 19-гадовая дзяўчына, якая ехала пасажыркай у «Фальксвагене».

Таксама 12 красавіка ў абласным цэнтры 37-гадовы вадзіцель маршрутнага таксі на вуліцы Алтайскай наехаў на 2-гадовую дзяўчынку. Маці з двума дзецьмі ехала ў маршрутцы і на прыпынку спачатку вывела з салона дзяўчынку, а потым пацягнулася за іншым дзіцем. Пакуль маці была занятая, малая стала перад мікрааўтобусам. Вадзіцель не заўважыў яе і крануўся з месца. У дзіцяці — чэрапна-мазгавая траўма і пералом нагі.

Алена КАЗЛОВА.

Шматфункцыянальны комплекс «Мінск-Арэна» павінен быць поўнасцю здадзены ў эксплуатацыю да 7 лістапада

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што, арганізуючы суботнікі, народ здзяйсняе высакародную справу. «Грошы ад іх пойдуць дзецям, вяскоўцам. Лічу, што іх трэба правадзіць», — сказаў ён.

У год 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 50 працэнтаў сродкаў, зароблены на рэспубліканскім суботніку, будзе накіравана на рамонт, рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне і добраўпарадкаванне мемарыяльных комплексаў, мясцінаў баявой і воінскай славы, пахаванняў воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны, пахаванняў у месцах масавай гібелі грамадзянскага насельніцтва. Грошы таксама пойдуць на падрыхтоўку загарадных аздараўленчых лагераў да летняга сезона. Амаль 50 працэнтаў зароблены сродкаў пойдзе на фінансаванне мерапрыемстваў па развіцці дзеючай і стварэнні дадатковай інфраструктуры аграгарадкоў, а таксама на добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан населеных пунктаў.

«Гэта добрае, карыснае і патрэбнае мерапрыемства. Таму я — за захаванне добрых традыцый», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт па просьбе журналістаў расказаў аб праведзенай напярэдадні ў Маскве сустрэчы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што галоўным вынікам гутаркі з Патрыярхам стала ўпэўненасць у неабходнасці павышэння ролі Праваслаўнай царквы ў беларуска-расійскіх адносінах.

«Руская праваслаўная царква павінна больш актыўна і адкрыта падключыцца да пытанняў яднання Беларусі і Расіі, а можа, і ўсёй славянскай цывілізацыі», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, Патрыярх бачыць перспектыву праваслаўя ва ўмацаванні ўсяго хрысціянскага свету.

Гутарка Аляксандра Лукашэнкі з Патрыярхам Кірылам замест запланаванай гадзіны доўжылася больш за тры з паловай гадзіны. Як адзначыў Прэзідэнт, ён расказаў аб беларуска-расійскіх адносінах, «аб тых праблемах, якія не вартыя выедзенага яйца і якія перашкаджаюць яднанню, перашкаджаюць адбыцца, як гэта калісьці было, адзінаму цэнтру славянскай праваслаўнай цывілізацыі». Ён праінфармаваў таксама аб прынятых на лонданскім саміце «вялікай дваццаткі» рашэннях адмяніць пратэкцыянісцкія меры і не блакіраваць пастаўкі тавараў, аб тым, як гэта вырашаецца ў беларуска-расійскіх адносінах. «Патрыярх гэта вельмі цікавіла. Ён прызнаўся, што для сябе адкрыў вочы на многія рэчы», — сказаў беларускі лідар. Патрыярх таксама выказаў перакананне, што царква не павінна быць убаку ад гэтых пытанняў.

У час гутаркі была закранута таксама тэма ўзаемаадносінаў каталіцкай і праваслаўнай канфесій, развіцця ў цэлым міжканфесіянальнага дыялога, ролі хрысціянства. Аляксандр Лукашэнка расказаў аб узаемаадносінах Беларускай праваслаўнай царквы з кіраўніцтвам краіны, аб тым, як разам вырашаюцца многія важныя для грамадства пытанні.

Паводле яго слоў, гутарка мела вельмі адкрыты характар, і нягледзячы на яе даволі вялікую працягласць, удалося абмеркаваць не ўсе пытанні, а таму Прэзідэнт Беларусі і Патрыярх дамовіліся сустрэцца яшчэ раз у бліжэйшы час.

Каментуючы вынікі сустрэчы ў Маскве 10 красавіка з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што з расійскага боку ёсць разуменне неабходнасці вырашэння многіх праблемных пытанняў двухбаковых адносінаў Беларусі і Расіі.

Як удакладніў Прэзідэнт, размова, у прыватнасці, ідзе аб цане на газ для Беларусі, пастаўках беларускай прадукцыі на расійскі рынак, удзеле беларускіх прадпрыемстваў у лізінгавых пастаўках, дзяржзакупках у Расіі, а таксама некаторых іншых. «Па пытаннях, па якіх мною былі выказаны прэтэнзіі, мы намецілі рух наперад, — сказаў ён. — Радуе, што ёсць разуменне таго, што гэтыя пытанні трэба вырашаць».

«Гэта рашэнне на сотні мільёнаў долараў», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што расійскі бок пайшоў Беларусі насустрач у пытанні аплаты газу па сярэднегадавой цане, а таксама па праблеме, звязанай з тым, што Беларусь не выбірае поўнасцю прадугледжаныя кантрактам аб'ёмы газу.

Успамінаючы лютаўскае пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тады было знойдзена ўзаемаразуменне з Прэзідэнтам Расіі. «Абодва прэзідэнты падпісаліся пад тымі рашэннямі, і яны падлягаюць няўхільнаму выкананню і ў Расіі, і ў Беларусі. Уся праблема ў расійскім урадзе, і тут мы жорстка і сур'ёзна гаварылі, — сказаў Прэзідэнт. — Не павінна быць сітуацыі, калі нашага прэм'ер-міністра пасылаюць да Набіулінай (Эльвіра Набіуліна — міністр эканамічнага развіцця і гандлю Расіі. — Заўвага БЕЛТА) ісці вырашаць праблемы».

Кіраўнік дзяржавы таксама паведаміў, што за час яго знаходжання 10 красавіка ў Маскве Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін «сустрэўся з патрэбнымі расійскімі міністрамі і катэгарычна папярэдзіў іх аб выкананні дамоўленасцяў ВДС». «У бліжэйшыя дні будуць праходзіць канкрэтныя сустрэчы міністраў, і, як мне было абяцана, у бліжэйшыя месяцы будуць знятыя ўсе праблемы, якія існуюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар падкрэсліў, што не настолькі важны самі сустрэчы двух прэзідэнтаў, колькі той сігнал, «штуршкі», якія яны даюць для тых, хто павінен выконваць рашэнні. «У гэтым важнасць нашых сустрэч з Прэзідэнтам Расіі, няхай яны нават будуць кароткачасовыя, мімалётныя», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што сустрэча з Прэзідэнтам Расіі прайшла ў дружалюбнай і цёплай атмасферы. Шмат увагі было ўдзелена знешняй палітыцы, пытанням абароны Саюзнай дзяржавы, маючаму адбыцца вучэнню «Захад-2009», ваенна-тэхнічнаму супрацоўніцтву, праграме «Усходняе партнёрства». «Абмяркоўваючы тую ці іншую праблему, мы пастаянна выходзім на новыя пытанні», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў свайму расійскаму калегу наведаць Беларусь. «Я прапанаваў Дзмітрыю Мядзведзеву прыехаць у Мінск, можа, да Дня Незалежнасці і, магчыма, у гэты час правесці Вышэйшы Дзяржсавет», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы асобна закрануў тэму роўнай прысутнасці беларускіх і расійскіх СМІ ў інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. У прыватнасці, па даручэнні прэзідэнтаў будзе распрацоўвацца нарматыўна-прававая база аб функцыянаванні беларускіх і расійскіх СМІ на тэрыторыях, адпаведна, Расіі і Беларусі. Пакуль жа беларускія сродкі масавай інфармацыі фактычна не маюць доступу ў расійскую медыяпрастору, аб чым было раней заяўлена Аляксандрам Лукашэнкам. Гэта работа пачалася ўжо на ўзроўні кіраўнікоў прэзідэнцкіх адміністрацый. Паводле слоў беларускага Прэзідэнта, знойдзена «вельмі правільнае і прымальнае рашэнне» аб тым, што беларускія тэлеканалы павінны прысутнічаць у Расіі, так як і расійскія — у Беларусі.

Журналісты папрасілі кіраўніка дзяржавы пракаментаваць апасенні, якія часта гучаць у Расіі, што ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства» супярэчыць цесным адносінам Беларусі з Расіяй, канцэпцыі Саюзнай дзяржавы.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, «ведучы перагаворы з Захадам, Беларусь ніколі не вядзе перагаворы супраць Расіі». «Гэта нам не выгадна, гэта шкодна з любой пазіцыі. Чаму мы павінны адмаўляцца ад Расіі? З любога пункту гледжання мы не збіраемся адмаўляцца ад дасягнутага на расійскім напрамку, а наадварот, мы будзем нарошчваць намаганні адносна Расіі, што мы і робім: у эканоміцы, знешняй палітыцы і гэтак далей», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, калі расійскі бок наконт гэтага выказвае заклапочанасць, то ім неабходна больш уважліва вывучыць дакументы па «Усходнім партнёрстве».

Як адзначыў Прэзідэнт, на Еўрасаюз прыпадае амаль палавіна знешняга гандлю Беларусі — столькі ж, колькі і на Расійскую Федэрацыю. «Мы што, павінны гэта ігнараваць? Не, — заўважыў ён. — Мы павінны падтрымліваць добрыя адносіны з Еўропай, а без палітычнага дыялога і дыпламатыі не можа быць такога тавараабароту».

Ведучы дыялог па праграме «Усходняе партнёрства», Беларусь прапануе, каб у праектах гэтай ініцыятывы прымала ўдзел і Расійская Федэрацыя. «Што такое «Усходняе партнёрства»? Гэта не нейкі пакт, накіраваны супраць некага. Каго гэта можа насцярожваць?» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Калі сёння лічаць, што мы адвярнуліся ад Расіі і пайшлі ўрачыстым маршам у іншым напрамку, то гэта поўнае глупства: ніхто такіх мэтаў не ставіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён дадаў, што ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства» не павінен праваказваць антырасійскія настрои. «Расія і Беларусь назаўсёды звязаны. Але і адмаўляцца ад супрацоўніцтва з Еўропай мы ні ў якім выпадку не павінны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У час гутаркі з журналістамі Прэзідэнт закрануў тэму будаўніцтва ў Беларусі новых спартыўных аб'ектаў. Паводле яго пераканання, іх узвядзенне неабходна прадаўжаць нават ва ўмовах крызісу.

«Тое, што будаваць трэба, — безумоўна. Ужо і ў нас людзі перасталі бурчаць наконт гэтага. Спартыўныя аб'екты — гэта здароўе людзей. Гэта будзе служыць народу многія гады. Таму гэта трэба рабіць, як бы ні было складана і цяжка», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы будзем будаваць — гэта дакладна. Думаю, мы адшукаем крыніцы фінансавання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы, што рашэнне аб будаўніцтве многіх з іх было прынята год таму, калі ў свеце яшчэ не было фінансава-эканамічнага крызісу.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што «будаўніцтва такіх аб'ектаў — гэта ўкладанне грошай у сваю эканоміку». «Такім чынам мы падганяем будаўнічую галіну, вытворчасць. Гэта выратаванне эканомікі: чым больш мы будуем, тым больш прадпрыемстваў працуе на гэту будоўлю. А ў нас практычна ўсе прадпрыемствы могуць вырабляць сваё для такіх аб'ектаў», — адзначыў ён. «Таму будаваць будзем. Вядома, з розумам. Тое, што можа пачакаць, — будзе чакаць. Хоць я і не прыхільнік гэтага», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў цяперашняй складанай сусветнай сітуацыі неабходна ўстаяць, выратаваць вытворчасць. «У нас няма крызісу. Мы павінны выходзіць з гэтага. Ён сам прыйдзе. А калі і мы яшчэ будзем плакацца, то ён прыйдзе ў яшчэ горшых маштабах, — сказаў кіраўнік дзяржавы, звярнуўшы ўвагу на псіхалагічны складальнік гэтай глабальнай сусветнай праблемы. — Пэўныя цяжкасці ёсць, але яны прыйшлі звонку. Цяпер трэба напружвацца і працаваць. Калі мы будзем працаваць, як трэба, то і крызісу не адчуем».

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ПАЛЯВАЯ ТРАЎМА

11 красавіка ўдзень прама з поля паблізу вёскі Траецкае Асіповіцкага раёна была дастаўлена ў бальніцу 24-гадовая рабочая калгаса «Лапічы». Жанчына атрымала шматлікія пераломы на працоўным месцы: яе прыціснула платформа трактарнага прычэпа, калі яна запраўляла механізм салетрай для апрацоўкі глебы ўгнаеннямі.

ПАДНЕСЛА ЗАПАЛКУ ДА ГАЗУ...

10 красавіка ў Магілёўскую бальніцу № 1 з кватэры была дастаўлена ў бальніцу са шматлікімі тэрмічнымі апёкамі 78-гадовая пенсіянерка. Жанчына знаходзілася ў апёкавым шоку і не выжыла: у гэты ж дзень увечары яна памерла. Высветлілася, што прычынай яе стану стала неасцярожнае абыходжанне з кухоннай газавай плітой.

Алена КАЗЛОВА.

Абзац

■ У Беларусі паступова павялічваецца сярэдні ўзрост пры ўступленні ў паўторны шлюб, паведамілі БЕЛТА ў Дзяржкамстаце. Летась узрост жанчыны на момант рэгістрацыі паўторнага шлюбу складаў 37,4 года, мужчыны — 40,1 года. У 2000 годзе было адпаведна 36,7 і 39,1 года. У мінулым годзе разведзеныя мужчыны і жанчыны стварылі 9,3 тыс. новых сем'яў.

■ **Супрацоўнікі міліцыі за мінулыя выхадныя затрымалі больш за 500 вадзіцеляў, якія ў нецвярозым стане кіравалі аўтамабілем. Усяго з пачатку года на дарогах Беларусі было затрымана больш за 13 тыс. п'яных кіроўцаў.**

■ Лідскія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі спынілі спробу перамяшчэння праз мяжу партыі амфетаміну. У ходзе рэалізацыі аператыўнай інфармацыі ў пункце пропуску «Беняконі-1» быў затрыманы аўтамабіль «Мерседэс». Вадзіцель, 23-гадовы жыхар Гродна, спрабаваў правезці пад падкладкай курткі 10 г амфетаміну, выкарыстоўваючы ў якасці кантэйнера прэзерватыў. Наркакур'ер перададзены супрацоўнікам Гродзенскага УУС.

Поўны абзац

■ **Жыхар амерыканскага штата Мічыган не выплаціў аліменты 13 былым жонкам на 14 дзяцей. Суд прыгаварыў яго да 3 месяцаў турмы. За шэсць гадоў яго запазычанасць склала 530 тыс. долараў. У турму ён адправіцца, калі не знойдзе тэрмінова 28 тыс. долараў.**

■ Урачы з Іжэўска падчас аперацыі выявілі ў мужчыны ў лёгкіх праслую яловую галінку. Першапачаткова ў 28-гадовага Арцёма Сідоркіна падазравалі рак. У яго былі мацныя прыступы, ён кашляў крывёю. Падчас аперацыі, перш чым выразаць палову лёгкага, хірург анкадыспансэра вырашыў пераканацца ў правільнасці дыягназу, у якім ніхто не сумняваўся. На тэрміновае даследаванне было вырашана аддаць кавалачак органа. Зрабіўшы надрэз, урач натыкнуўся на зялёныя іголкі. Вельмі здзіўленыя медыкі дасталі з цела 5-сантыметровую елачку. Стала зразумелым, чаму хворы адчуваў моцныя болі і адкуль узялася кроў — іголкі закраналі капіляры. Як маркуецца, хлопец удыхнуў вельмі маленькую пупышку, якая прарасла ў целе. Неверагодны выпадак даследуецца.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

Сообщаем Вам, что выплата дивидендов по привилегированным акциям по итогам работы ОАО «Технобанк» за 2008 год будет производиться в кассе Банка с 26 мая 2009 года по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44.

Получить дивиденды Вы можете ежедневно (кроме выходных и праздничных дней) с 9.00 до 16.00 по предъявлению паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Более подробную информацию можно получить по телефонам в г. Минске: (017) 237 43 80, 283 15 10

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г., УНП 100706562

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

НАСТОЯЩИМ ИЗВЕЩАЕМ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ТЕХНОБАНК» В ОЧНОЙ ФОРМЕ

Дата проведения: 20 апреля 2009 года.

Место проведения (адрес): г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», III этаж.

Регистрация участников Общества для участия в собрании: с 10.00 до 10.30 по месту проведения собрания.

Время проведения заседания: с 10.30 до 11.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:

1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), удостоверение руководителя и печать (для юридических лиц) либо иной документ, подтверждающий полномочия!!!

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:

г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.

Лепш перанос, чым водпуск без аплаты

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Не пагадзіўся — плаціць будуць

Даволі распаўсюджаны крок у цяжкіх эканамічных умовах — вымушаны водпуск. Ён можа быць як з захаваннем, так і без захавання зарплаты. Ад чаго залежыць той ці іншы варыянт?

— Накіраванне ў водпуск без захавання зарплаты магчыма толькі пры адной умове — са згоды самога работніка, — падкрэслівае Уладзімір Шалковіч. — Адпаведна, калі работнік такой згоды не дае, наймальнік будзе абавязаны аб'явіць прастой. І плаціць падчас яго не менш за 2/3 ад тарыфнай стаўкі.

Дарэчы, у выпадку адсутнасці работы ёсць яшчэ адно, ужо больш прымальнае для ўсіх выйсце. Замест водпуску без захавання зарплаты ў няпросты для арганізацыі перыяд могуць даць частку «звычайнага» працоўнага водпуску. Аднак на тое патрэбна ўзаемная згода наймальніка і работніка.

Менш толькі з папярэджаннем за месяц

Змяненне ўмоў аплаты працы — мера непапулярная. Але часам зноў-такі вымушаная.

— Пайсці на ўвядзенне новых або змяненне цяперашніх умоў аплаты працы наймальнік можа, — кажа Уладзімір Шалковіч. — Аднак абавязак таго ж наймальніка — папярэдзіць работніка аб новаўвядзеннях не пазней як за месяц і атрымаць згоду. Сапраўды, калі такой згоды няма, праз месяц работніка могуць проста звольніць з выплатай двухтыднёвай выхаднай дапамогі. Аднак таксама трэба падкрэсліць: калі папярэджанне зроблена не было, новыя ўмовы аплаты прымацца не павінны. А абскардзіць іх увядзенне можна ў камісіі па працоўных спрэчках, судзе, дзяржаўнай інспекцыі працы ці прававой інспекцыі прафсаюзаў.

Перавод у сувязі з прастоем на новае месца працы ў іншую мясцовасць не дапускаецца.

Вольны час для пошукаў

Безумоўна, самая непрыемная сітуацыя — скарачэнне штату. Разам з тым, пэўныя правілы ёсць і ў гэтым выпадку. Скажам, звальненне тут магчыма ў выпадку, калі работніка нельга перавесці на іншае месца, і ў тым ліку перавесці з перанавучаннем. Забараняецца таксама звальненне работнікаў, якія знаходзяцца на «бальнічных» ці ў водпуску, цяжарных жанчын, жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў і адзінокіх жанчын, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 або дзіцяня-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Плюс да ўсяго наймальнік абавязаны пісьмова папярэдзіць работніка аб скарачэнні не пазней чым за два месяцы або, як варыянт, замяніць тэрмін папярэджання выплатай сярэдняга заробку.

Накіраваць работніка без яго згоды ў водпуск «за свой кошт» нельга.

Дарэчы, нагадвае Уладзімір Шалковіч, пры скарачэнні работніку павінны выдзяляць адзін свабодны дзень у тыдзень для пошуку варыянтаў далейшага працаўладкавання без захавання, а паводле дамоўленасці з наймальнікам — і з захаваннем сярэдняй зарплаты.

Тры зарплаты як кампенсацыя

Варта заўважыць, што ў выпадку скарачэння штатаў, ліквідацыі арганізацыі ці спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка работніку павінна выплачвацца выхадная дапамога — як мінімум 3 сярэднямесячныя зарплаты. Прычым памер выплат можа быць і большым — калі гэта прадугледжана калектыўным дагаворам. Разам з тым трэба заўважыць, што права на выхадную дапамогу ў гэтым выпадку атрымаюць не ўсе — у прыватнасці, яго не маюць сумяшчальнікі.

А што далей?

Калі захаваць працоўнае месца ўсё ж не ўдалося, застаецца адно — шукаць новае. І ў тым ліку праз службу занятасці. Пры гэтым усе паслугі па падборы вакансій, атрыманні інфармацыі, кансультацыі, прафесійная перападрыхтоўка ці павышэнне кваліфікацыі тут будуць бясплатнымі. Плюс да таго, будуць магчымасці атрымліваць дапамогу па беспрацоўі і часовыя заробкі — за ўдзел у грамадскіх работах.

— Трэба таксама нагадаць, што грамадзяне, якія маюць працяглы стаж і былі звольненыя да дасягнення агульнавызначанага пенсійнага ўзросту, могуць выйсці на датэрміновую пенсію, — заўважае Уладзімір Шалковіч. — Аднак для гэтага такім грамадзянам неабходна зарэгістравацца ў службе занятасці. А ў сваю чаргу служба занятасці павінна канстатаваць адсутнасць магчымасцяў для іх працаўладкавання.

Забараняецца звальненне работнікаў, якія знаходзяцца на «бальнічных» ці ў водпуску, а таксама цяжарных жанчын, жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў і адзінокіх жанчын, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 14 або дзіцяня-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў.

Сяргей ГРЫБ.

УПАЛА З БЕРАГА

На вадаёме ў в. Люсіна Ганцавіцкага раёна ўтапілася 5-гадовае дзіця. Малое гуляла на беразе, з якога і ўпала ў ваду. Побач нікога з дарослых не было, і дапамагчы няшчаснаму дзіцяці не было каму.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ЗАГІНУЛА ЧАЦВЁРА ДЗЯЦЕЙ І ДВОЕ ДАРОСЛЫХ

Трагедыі здарыліся, як гаворыцца, з-за нядбайнасці асобных людзей. Напрыклад, у маладой сям'і з вёскі Забалоцце Рагачоўскага раёна не было часу для сваіх малых дзетак — дзяўчынкі 2006-га і хлопчыка 2007 года нараджэння. Бацькоў іхніх, якіх не выхоўвала грамадскасць, ніхто не мог адвучыць ад выпівак і антысанітарыі. Стаяла пытанне аб перадачы дзяцей у прытулак. Ды не паспелі мясцовыя органы ўлады гэта зрабіць. У адсутнасць бацькоў малыя, відаць, забаўляліся з запалкамі.

А што гаварыць аб адказнасці жыхаркі гарадскога пасёлка Карма, калі яна пайшла ў госці з двухгадовай дачкой і пакінула яе на вуліцы без нагляду. Да самага вечара. Кіноліся шукаць малую, калі апусціўся змрок на зямлю. Знайшлі трупік у пограбе новабудоўлі, запоўненым вадой. У той жа дзень узнік пажар у адным доме ў Мазыры, дзе ў кватэры знаходзілася дзяўчынка 2004 года нараджэння. Ратавальнікі выцягнулі яе з вогненнага пекла, але яна памерла ў бальніцы.

Смерць напаткала таксама і дзвюх жанчын з гарадоў Рэчыца і Светлагорск. Прычынай стала адно і тое ж: курылі ў ложку ды заснулі. Нагогул жа за мінулыя выхадныя ў вобласці «чырвоны певень» 25 разоў «прагульваўся» па населеных пунктах некалькіх раёнаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«МІНЁРА» ЗАТРЫМАЛІ

Калі ноччу на парозе сваёй кватэры ў доме па вул. Міцкевіча ў Брэсце гаспадары ўбачылі сапёраў са службовым сабакам, то не маглі ўцяміць, у чым справа. Перапалоханым людзям растлумачылі, што ў іх кватэры закладзена міна, і папрасілі пакінуць дом.

У кватэры нічога не знайшлі, а выезд сапёрна-піратэхнічнай групы справакаваў жыхар Брэста, які патэлефанаваў у міліцыю і даў ілжывае паведамленне. «Мінёра» затрымалі.

ЗАТРЫМАЛІ КАРАВАН

Каля в. Пецькі Кобрынскага раёна глыбокай ноччу супрацоўнікі міліцыі затрымалі пяць аўтамашын, якімі кіравалі беспрацоўныя.

Пры аглядзе транспарту было канфіскавана адзенне на 130 млн рублёў: на тавар не было дакументаў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У эліце!

На юніёрскім чэмпіянаце свету па хакеі ў групе А першага дывізіёна, які прайшоў з 6 па 12 красавіка ў мінскім Палацы спорту, пяць перамог у пяці матчах (з іх чатыры ў асноўны час) атрымала зборная Беларусі.

У заключнай сустрэчы каманда Сяргея Пушкова разграміла зборную Казахстана з лікам 6:1. Гэтая гульня не мела турнірнага сэнсу. Напярэдадні гаспадары чэмпіянату датэрмінова заваявалі пуцёўку ў вышэйшы дывізіён. Гэта адбылося пасля таго, як Казахстан прайграў Венгрыі і страціў шанцы пазмагацца з беларусамі за першае месца. Да перамогі над Казахстанам Беларусь узяла верх над Венгрыяй (5:4, па булітах), Польшчай (4:1), Украінай (5:0) і Літвой (3:0). «Матч з Казахстанам быў для нас найлепшым на турніры, — адзначыў на прэс-канферэнцыі С. Пушкоў. — Ён не быў ужо вырашальным, але праходзіў бы па такім жа сцэнарыі і завяршыўся б з такім жа лікам, калі б разыгрывалася першае месца. Мы прыбаўлялі ад гульні, да гульні і ва ўсіх матчах былі мацнейшымі. Пры такой падтрымцы балельшчыкаў хлопцы не маглі дрэнна гуляць. У наступным сезоне беларусам па сілах утрымацца ў эліце».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	г. Баранович

ТЫЛ СЯЎБЫ

Вясной усе спяваюць оду таму, хто сее зерне, восенню — таму, хто збірае ўраджай. Але чамусьці ніколі ніхто не ўзгадвае пра жонак трактарыстаў і камбайнераў. А хто сказаў, што ў тыле лягчэй, чым на полі?

Вёска Цэнтральная. Новенькі дом з белай цэглы. Дзверы адчыніла худзенькая дзяўчына. Калі б не ведала, ні за што не сказала б, што яна маці дваіх дзяцей.

— Праходзьце, калі ласка, — запрасіла ў хату Таццяна Ёдзь. — Але ж мы з Палінай спяшаемся. Андрушу з садка трэба забраць.

Пакуль Таня апранала 9-месячную дачушку, я паспела атрымаць адказы на некалькі пытанняў.

— Кажуць, механізатары ў полі зараз ад святла да цямна грошы зарабляюць. Ці бачыце хоць мужа?

Ну зразумела, бачу (*усміхаецца*). Раніцай на працу адпраўляю, а вечарам пасля васьмі сустракаю. У мужа складаная праца, ды і мне не лягчэй. З раніцы да вечара трэба варыць есці, мыць. Ды і дзеці маленькія столькі сілаў забіраюць. Жанчыны мяне зразумеюць.

— А гаспадарка ці ёсць?

— Што вы, пакуль дзеці малыя — і не думаем. Вось толькі курэй мне хочацца завесці. Віталік (муж) не пярэчыць. Вунь вальер ужо пачаў будаваць.

— Дык вы ўсе прадукты ў краме набываеце? Напэўна, муж шмат грошай зарабляе?

— Дзе там шмат. Яшчэ ў сезон больш-менш. А зімой добра калі 300 тысяч заплацяць. І я на Паліну атрымліваю 187 тысяч у месяц. Вось і ўвесь наш бюджэт. Каб зімой плацілі так, як летам. А так што заробіш у гарачую пару, тое і ёсць. Добра што хоць яго бацькі жывуць у суседняй вёсцы. То яйкам, то малаком дапамогуць. А калі кабанчыка заколюць, то і нам сала дадуць. Мы з мужам, у сваю чаргу, і з сенам упраўляцца ім дапамагаем, і агарод пасадзіць. Бульбу капаем усёй сям'ёй, спачатку мы ім дапамагаем, пасля — яны нам. Адным словам, пашанцавала мне са свёкрам і свякроўю.

— А муж ці добры?

— Віталік калі ўбачыць, што я занятая, то і сам можа сабе яйка пасмажыць. З дзецьмі дапамагае. Увечары, пакуль я на кухні ўпраўляюся, ён за малымі прыглядае.

Поле становіцца для Віталя ЁДЗЯ другім домам, пачынаючы з вясны і — аж пакуль зямля не замерзне.

Віталь на полі да цёмнага, таму з садзіка Андрушку штодзень забіраюць Таня з Палінай.

А раніцай Андрушу па дарозе на працу ў сад водзіць.

Таня прызналася, што па-добраму зайздросціць тым жанчынам, якія маюць магчымасць хоць дзень на тыдзень правесці ўсёй сям'ёй. Віталій жа працуе ў гарачую пару без выхадных. Віталя Ёдзя мы з галоўным аграномам гаспадаркі **Віктарам КЛІМАШЭЎСКІМ** знайшлі на полі ў вёсцы Ляйкі. Ён якраз падкормліваў азімыя.

— Ужо 18-ты год працую на трактары, — сказаў Віталь.

— Дзе там 18, — перабівае Віктар Клімашэўскі. — Гэта ён прыбядняецца. Усё дзяцінства правёў на полі разам з бацькам. Без яго ні адна пасяўная і ўборачная не абыходзілася.

— А вы свайго сына з сабой на працу не бераце, як вас некалі бацька браў?

— Бяру. Але паездзіць гадзіну і дадому просіцца. Падрасце і сам вырашыць, кім яму быць. Я ж хацеў бы, каб Андрэй вывучыўся і атрымаў больш аплачваемую прафесію. Бо зімой мне налічваюць 390 тысяч. З іх трэба 30 тысяч аддаць за хату, 10 — за ваду, пенсійны падатак не маленькі вылічваюць. Вось і атрымліваецца чыстымі недзе 300 тысяч. Пражыві, як хочаш. Летам, праўда, больш плацяць. Я на камбайне летась паўтара мільёна заробіў. Акрамя таго, сена і зерне выдзелілі. Бацькам аддаў.

— А з жонкай памятаеце, як пазнаёміліся?

— Чаму ж не? Таня скончыла Навагрудскі тэхнікум. І па размеркаванні прыехала ў СВК «Каменчане» працаваць аграномам. Як зараз памятаю, я ў той дзень уносіў яды на полі, а прыгожая дзяўчына прыехала з Віктарам Браніслававічам на УАЗіку правяраць мяне. І вось ужо амаль пяць гадоў разам. Ажаніліся — нам Аляксандр Фаміч домік выдзеліў. Сад пасадзілі. Машыну купілі. Маці кажа «заводзь свіней», гатовая хоць сёння дваіх даць. Але мне Тані шкада. Ёй і так складана з дзецьмі ўпраўляцца. А я цэлы дзень на працы.

— Аб чым думаеце, калі едзеце па полі?

— Як быў халасцяком, дык пра дыскатэкі думаў, музыку па прыёмніку слухаў. А зараз, як ажаніўся, і музыкі той не хачу. Трэба думаць, як дзяцей гадаваць (*усміхаецца*).

— На такіх, як Віталь Ёдзь, зямля трымаецца, — сказаў па дарозе назад Віктар Браніслававіч. — Добры чалавек, адказны работнік. Калі яму нешта даручылі — ведаем, што будзе зроблена не пахапкам, а як мае быць.

...

Таццяне сапраўды пашанцавала з мужам. Пасля працы імкнецца вярнуцца дадому, а не распіць з сябрамі бутэльку «чарніла». Але ж ёсць жонкі, якім даводзіцца цягнуць на сваіх кволых плячах не толькі дзяцей і гаспадарку, але і п'янага мужа з машыннага двара.

Падчас рэйду, арганізаваным Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання, мне выпала магчымасць пазнаёміцца з праблемамі, якія сёння хвалююць гаспадаркі Іўеўскага раёна.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Іўеўскага раёна Аляксея МЕЛЕНЦА, сёлета на раён выдзелілі 7 энерганасычаных трактароў. Яшчэ ў сакавіку выплацілі першы ўзнос. І што вы думаеце, пасяўная восевось фінішуе, а мы атрымалі толькі два трактары! І ў такой сітуацыі апынуўся не толькі наш раён.

Старшыня СВК «Каменчане» чакаў нас у сваім кабінеце. Аляксандр АРЫКА ўзначальвае гаспадарку ўжо 13 гадоў. Летась яна заняла першае месца ў раёне па ўраджайнасці збожжа.

— Пасяўная ў сувязі з надвор'ем пачалася значна пазней, чым летась. Час падціскае. А тут праблемы ставяць палкі ў колы. Вось сеялка падвяла ў самы адказны момант. Зараз, дзякуй Богу, усё нармальна, бо хлопцы аператыўна замянілі рэдуктар. Вы, напэўна, прыкмецілі, што на палях раёна шмат камянёў. А на тэрыторыі нашай гаспадаркі іх найболей. Недарэмна і гаспадарка завецца «Каменчане». Перад сяўбой па полі ездзяць 2 каменеўборачныя машыны, за кожнай ходзіць па 6 чалавек. Не хапае фосфарных угнаенняў, гаспадарка забяспечана толькі на 26 %. Падобная сітуацыя ва ўсім раёне. Заключылі дамову з абласным аграсервісам. Чакаем, што сітуацыя палепшыцца. Людзі просяць выхадны. Але ў нас няма столькі механізатараў, каб працаваць па зменах. Вось і выходзяць работнікі ў поле штодзень.

Старшыню СВК «Баума» Віктара КАНЕЦКАГА знайшлі на полі. Загарэлы (колькі было таго сонца), ён углядаўся праз бінокль удалечыню.

— Механізатары ў мяне добрыя, — гаворыць Віктар Адольфавіч, — з 49 механізатараў двое з трэцім класам, і то толькі таму, што маладыя, восем — з другім класам, а ўсе астатнія з першым класам. Усе маюць катэгорыі ў правах. Але ўсё адно дысцыпліну трэба падтрымліваць, каб не распусціліся.

Пад'ехала машына з абедамі. Але, убачыўшы, што трактар яшчэ далёка, узяла курс на іншае поле.

— З сакавіка да лістапада ўсіх працаўнікоў у полі кормім. Гэта недзе 200 чалавек штодзень. Усе абеды гатуюцца ў калгаснай сталоўцы і развозяцца двума аўтамабілямі на абодва надзелы. Раней у абед толькі гарачым кармілі, а ўвечары выдавалі сухі паёк. Зараз і вечарам кормім гарачым. Ёсць гаспадаркі, якія вылічваюць за абеды сімвалічную суму з зарплаты. А мы кормім сваіх работнікаў бясплатна. Летась на абеды было выкарыстана 98,4 млн рублёў. Я лічу, што людзі, якія сёння працуюць па 13-15 гадзін, павінны два разы паўнавартасна харчавацца.

Сярэдняя зарплата па гаспадарцы — 461 тысяча. Калі ў палявода вясной зарплата 300 тысяч, то ў механізатара — большая за мільён. Усе, хто задзейнічаны ў вясенне-палявых работах, атрымліваюць асноўную зарплату, якая залежыць ад аб'ёму выкананай працы, акрамя таго, плацім прыбаўку за якасць, за класнасць, і кожнага чакае натуральная аплата ў выглядзе збожжа. Штогод аддаём людзям больш за 100 тон збожжа.

На машынным двары **СВК «Суботнікі»** ніводнага трактара — 100% выхад у поле. Нас сустрэлі два браты: старшыня гаспадаркі і галоўны аграном — **Ліхарад Уладзімір і Валерый**.

— Хлопцы ведаюць, што чым больш зробіш, тым больш прынясеш грошай у сям'ю, гаворыць Валерый Ліхарад. — Спаборнічаюць паміж сабой, кожны імкнецца быць першым. Зарабляюць да 100 тысяч у дзень. Найменшая аплата за работу — 60-70 тысяч. Усе маладыя механізатары жывуць у новых дамах. І жывуць, паверце, не горш, як у горадзе. Дамы ў цэнтральных вёсках гаспадаркі газіфікаваныя. У кожным з крана цячэ гарачая вада. Прыходзіш дадому брудны, дык не трэба ваду грэць у каструлі. Калгасная лазня таксама ў распараджэнні механізатараў.

— Клапоцімся пра сваіх работнікаў, — уступае ў размову Уладзімір Ліхарад. — Чалавечнае стаўленне дае ім стымул для працы. Прадаём ім па льготным кошце грэчку, муку. Маем у гаспадарцы і невялікую свінаферму. Многія хочуць завесці ўласную гаспадарку, таму па льготным кошце прадаём работнікам парасят, кароў. У год прадаём 20-30 кароў, а парасят дык у 10 разоў больш.

❐ ❐ ❐

Перад тым як здаваць матэрыял у друк, завітала ў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

— 9 красавіка 719 з 2100 энерганасычаных трактароў, якія задзейнічаны ў пасяўной у рэспубліцы, працавалі ў адну змену, — гаворыць **прэс-сакратар Міністэрства Дар'я КАЗЛОЎСКАЯ**. — І гэта ў той час, як міністр даў распараджэнне арганізаваць працу нагутнай тэхнікі ў дзве змены. Такое масавае парушэнне звязана з недахопам сваіх добрых механізатараў у многіх гаспадарках. Сямён Шапіра рэкамендуе ў такім выпадку прыцягваць да работы ў полі людзей з мясцовых прамысловых прадпрыемстваў. Міністр распарадзіўся дакладваць яму асабіста, калі ў нейкай гаспадарцы больш за суткі будзе прастойваць хоць адзін энерганасычаны трактар. Ён лічыць, што нельга страчваць ні адной хвіліны і пры гэтым выконваць усе тэхналогіі земляробства. Акрамя таго, Сямён Барысавіч распарадзіўся прыпыніць размеркаванне энерганасычанай тэхнікі ў тыя рэгіёны, дзе не могуць забяспечыць трактар двума механізатарамі.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Іўеўскі раён.

«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220 20 25

14 красавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Іванавіч СЯДЫХ. **15 красавіка** — галоўны ўрач Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Алег Анатольевіч ЖЫВАЕЎ. **16 красавіка** — галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла Анатольеўна АНДРЭЕВА. **17 красавіка** — загадчык паліклінікі Мінскай ЦРБ Таццяна Георгіеўна РУЛЬКЕВІЧ.

Графік дзяжурства на «гарачай» лініі — з 9.00 да 17.00. Перапынак на абед — з 13.00 да 14.00. У графіку магчымыя змяненні.

У «ІНТЭРНАТ». АЛЕ З УЛАСНЫМ ДОМАМ

Больш нізкі, чым у цэлым па краіне, узровень нараджальнасці, больш высокі сярэдні ўзрост насельніцтва, значная доля пажылых людзей. Усё гэта традыцыйна з'яўляецца асаблівасцямі Міншчыны — рэгіёна без буйных гарадоў. Ужо зараз на пенсіі знаходзіцца амаль трэць жыхароў вобласці, прычым лічба паступова ўзрастае. Як узрастае і іншае — попыт на дамы-інтэрнаты.

Мядзельскі раён не стаўся выключэннем. Тут 10,3 тысячы чалавек, практычна трэць усяго насельніцтва — пенсіянеры. Пры гэтым сярод іх 830 чалавек лічацца цалкам адзінокімі, а яшчэ 4300 жывуць асобна ад дзяцей і іншых працаздольных сваякоў.

— Зразумела, лепш за ўсё ўсяляк дапамагаць гэтым людзям заставацца дома, сёння 847 пенсіянераў і інвалідаў наведваюць сацыяльныя работнікі, прычым у большасці выпадкаў аплата за паслугі прымальная — 12-18 тысяч рублёў у месяц, — кажа **начальнік управлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мядзельскага райвыканкама Валерый ВАЛЫНЕЦ**. — Аднак, на жаль, варыянт сацыяльнага абслугоўвання спрацоўвае далёка не заўсёды. Некаторым пажылым людзям патрэбны не часовы, а пастаянны догляд. Бо ў такім узросце ў кожнага ўжо цэлы «букет» хваробаў, часцяком — абмежаваныя рухальныя магчымасці, і, як вынік, далёка не ідэальныя ўмовы жыцця ва ўласнай хаце.

Таксама не аптымальнае выйсце — і перасяленне ў дом-інтэрнат. Магчымасці для гэтага ёсць. А вось жаданняў амаль няма — летась у раёне пагадзіліся з'ехаць толькі 3 чалавекі. Зрэшты, здзіўляцца тут не выпадае, найбліжэйшы дом-інтэрнат, куды можна атрымаць накіраванне, знаходзіцца за многія дзясяткі кіламетраў — на Стаўбцоўшчыне.

— Каб вырашыць гэту праблему, два гады таму было прынятае рашэнне стварыць пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва аддзяленне кругласутачнага знаходжання, — працягвае Валерый Валынец. — Прычым вызначылі: ён павінен з'явіцца не ў райцэнтры, а за дваццаць кіламетраў ад яго, у вёсцы Вузла.

Прычын было некалькі, напрыклад, добрая прырода ці наяўнасць сацыяльнай інфраструктуры. Але не толькі. З-за рэзкага змяншэння колькасці вучняў у Вузле зачынілася базавая школа. Моўчкі назіраць, як будзе паступова прыходзіць у заняпад яе будынак, было шкада. Да таго ж узнікла праблема... уладкавання былых супрацоўнікаў навучальнай установы. Падлічылі: новае аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пенсіянераў і інвалідаў дазволіць захаваць 17 працоўных месцаў. Што гэта значыць для вёскі з насельніцтвам у 180 чалавек, казаць не трэба.

— Урэшце, быў яшчэ адзін аргумент, — зазначае Валерый Валынец. — Усім, хто трапляе ў аддзяленне, зараз па 70-85 гадоў, прычым амаль усе жылі ў вёсках. А гэта ўжо чыста псіхалагічны момант — рэзкага змянення ладу жыцця тут быць не павінна.

Вонкава аддзяленне ў нечым нагадвае невялікі, але стандартны інтэрнат — звычайныя «спальныя» пакоі, пакой адпачынку, сталовая, працэдурны кабінет, душ. Але адрозненне, істотнае зноў-такі ў псіхалагічным плане, усё ж ёсць. Тэрмін пражывання тут абмежаваны 6 месяцамі ў год. За жыхарамі аддзялення захоўваецца іх жыллё, пры жаданні можна вярнуцца дадому практычна ў любы момант.

— Каб адчыніць аддзяленне кругласутачнага знаходжання, стварыць тут нармальныя ўмовы, давялося ўкласці немалыя грошы ў пераабсталяванне будынка былой школы — праект абыходзіцца ў 1,8 млрд рублёў, — распавядае Валерый Валынец. — Тым не менш, з эканамічнага пункту гледжання справа таксама апраўданая: дзень пражывання тут абыходзіцца танней, чым у доме-інтэрнаце. Пры гэтым частку выдаткаў кампенсуюць самі жыхары аддзялення — за кошт пералічэння 80 % сваёй пенсіі. Адпаведна, толькі 20 % выдаецца «на рукі».

Аддзяленне кругласутачнага знаходжання ў Мядзельскім раёне, якое разлічана на 30 месцаў, сёння запоўнена крыху больш чым напалову. Але толькі пакуль. Попыт на яго будзе, і асабліва ў найбольш складаны для выскоўцаў-пенсіянераў зімовы час. Прынамсі, аб гэтым сведчыць практыка іншых рэгіёнаў. Аналагічныя «міні-інтэрнаты» ўжо працуюць у Любанскім, Бярэзінскім, Чэрвеньскім, Мінскім раёнах. Зусім хутка падобная ўстанова з'явіцца на Случчыне, а пасля — на Клеччыне. Так, зараз звычайныя дамы-інтэрнаты для пенсіянераў і інвалідаў Міншчыны валодаюць пэўным «рэзервам» у 67 месцаў. Аднак стварэнне аддзяленняў кругласутачнага знаходжання можна назваць своеасаблівай «гульнёй на апярэджанне» — насельніцтва вобласці працягвае «старэць».

— Паралельна трэба вырашаць і другую праблему — месцаў у дамах-інтэрнатах для асобаў з псіханеўралагічнымі захворваннямі, — адзначае **старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Ала МІКАЛУЦКАЯ**. — На Міншчыне ў чарзе на пасяленне ў спецыялізаваныя ўстановы знаходзіцца 26 чалавек. У параўнанні з папярэднімі гадамі лічба зменшылася ў 10 разоў, зараз яна нібыта невялікая, але ўсе прагнозы сведчаць, што дэфіцыт будзе ўзрастаць. Таму цяпер узнікла задума прыстасаваць пад дом-інтэрнат для псіханеўралагічных хворых на 150-200 чалавек адзін з прафілакторыяў, які цяжка ўтрымліваць яго ўласніку-прадпрыемству. У прыватнасці, мы перакананыя — з улікам сітуацыі ў эканоміцы, сёння лепш за ўсё ісці менавіта шляхам пераабсталявання незапатрабаваных па тых або іншых прычынах сацыяльных аб'ектаў.

Сяргей ГРЫБ.

Мядзельскі раён.

Адраджэнне гаспадара

«Малочныя рэкі» Гарлінскіх

Летась гэтыя руплівыя гаспадары здалі 36,5 тоны малака

«Сонейка прыпякае — настаў час у полі завіхацца», — такімі словамі мяне сустрэла на сваім падворку Валянціна Гарлінская. І гасцінна запрасіла ў хату — крыху адпачыць з дарогі, пагутарыць «за жыццё». Валянціна Казіміраўна тлумачыць: цяпер добрая пара, каб траву падсеяць. Трэба ўсё па гаспадарцы выконваць у вызначаны тэрмін, інакш назбіраецца столькі работы, што і не адолееш. А яны з усім прывыклі спраўляцца толькі ўласнымі сіламі.

Валянціне ГАРЛІНСКАЙ уласная гаспадарка надае больш упэўненасці ў заўтрашнім дні.

Гэта сярэдняя сям'я па сённяшніх мерках — у Гарлінскіх двое дзяцей. Старэйшы Мікалай вучыцца на першым курсе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта на факультэце машынабудавання. Сюды хлопец спрабаваў паступіць яшчэ летась, і прайшоў, але трапіў толькі на платную форму навучання. Ад такога варыянту адмовіўся, паколькі палічыў, што такая нагрузка будзе занадта вялікая для сямейнага бюджэту. Уладкаваўся ў мясцовае сельгаспрадпрыемства трактарыстам і сёлета зноў паспрабаваў «прабіцца» ў БНТУ. І атрымалася. Цікава, што сваю будучыню Мікалай звязвае толькі з вёскай — у родных мясцінах, заўважае, неяк і дыхаецца лягчэй. Навошта шукаць нешта лепшае? Такога ж меркавання прытрымліваецца і малодшая дачка Ірына, якая цяпер вучыцца ў сёмым класе (дарэчы, яна адна з лепшых вучаніц — займаецца на «дзявяткі» і «дзясяткі»).

Дзеці не ўяўляюць свайго жыцця без працы на зямлі. І гэта, паверце, зусім не высокія словы, паколькі з дзяцінства яны ва ўсім дапамагаюць сваім бацькам. А як жа інакш, хто іх падтрымае? Мікалаю асабліва падабаецца тэхніку да ладу даводзіць. У Гарлінскіх ёсць уласны трактар з усім прычапным абсталяваннем. Няхай старэнькі, аднак сын старанна даглядае «механізацыю», таму спісваць яе зарана. Тым больш што без тэхнікі сапраўды як без рук. Увогуле апрацоўваюць каля трох гектараў зямлі — сваіх каля 1,5 га ды яшчэ суседзі просяць дапамагчы на прысядзібных участках. У такім разе запрагаюць каня, бо з трактарам на «сотках» проста не развернешся. Таксама засталася і бацькоўская сядзіба, якую Гарлінскія старанна даглядаюць.

Яны вырошчваюць усё для сваіх патрэб: збожжавыя, буракі, вялікія плошчы адводзяць пад бульбу. Гэта акрамя ўласна агарода, дзе садзяць увесь магчымы «набор» агародніны і зеляніны. На зіму робяць вялікую колькасць нарыхтовак — хапае не толькі самім, яшчэ родных і суседзяў нярэдка вясковымі прысмакамі частуюць. Адметнасць гэтай, на першы погляд зусім звычайнай, сям'і ў тым, што асноўны даход яны атрымліваюць у прамым сэнсе гэтага слова з уласнага падворка.

Валянціна Казіміраўна 20 гадоў адпрацавала ў мясцовым саўгасе — моцнай гаспадаркі, якая традыцыйна з'яўлялася адным з лідараў сельгасвытворчасці Вілейскага раёна. Апошнім часам Гарлінская была лабарантам на жывёлагадоўчай ферме. Яе муж Пётр Фёдаравіч на працягу двух дзесяцігоддзяў — вадзіцель Вілейскага гармалзавода. Ад сельгаспрадпрыемства сям'я атрымала дом у Вязыні. У новае жыллё пераехалі шаснаццаць гадоў таму.

— Спачатку з усёй гаспадаркі была толькі адна карова, — узгадвае Валянціна Гарлінская.

— На вяселле падарылі?

— Не, — усміхаецца Валянціна Казіміраўна, — самі з мужам набылі. Я мясцовая жыхарка — усе дзяды адсюль. У нашай сям'і было трое дзяцей: брат — палкоўнік у адстаўцы (цяпер жыве на Байкале), а сястра загадчыцай на мясцовай ферме працуе. З дзяцінства даглядалі вялікую гаспадарку, але ж і ў школе паспявалі нядрэнна. Займалася я добра, але неяк не атрымалася пасля школы паступіць і працягнуць вучобу. Так і засталася ў роднай вёсцы, аб чым зусім не шкадую. Трэба ж і на зямлі некаму працаваць.

Гарлінскія жывуць на вуліцы Маладзёжнай, у гэтай частцы Вязыні амаль усе месцічы трымалі вялікую гаспадарку. Не сталі выключэннем і Валянціна Казіміраўна з Пятром Фёдаравічам. Праўда, цяпер тут ёсць свая адметнасць — на пэўнай колькасці падворкаў значна паменшала свойскай жывёлы, а Гарлінскія трымаюць бадай што самы вялікі сярод вяскоўцаў на Вілейшчыне «статак». У іх сем кароў, было нават восем, толькі ад адной давялося адмовіцца, паколькі яна была «нерэнтабельная».

Валянціна Казіміраўна нездарма адпрацавала дваццаць гадоў у жывёлагадоўлі — гэтую справу ведае дасканала, да дробязяў. Побач з хатай — «міні-ферма», дзе навязаныя сем кароў. Ёсць і конь. Вядома, трымаць такое пагалоўе вельмі няпроста. Яны нікога не наймаюць на дапамогу, спраўляюцца самастойна.

— Узімку яшчэ цяжэй, чым летам, калі выганяеш кароў на пашу і займаешся іншымі справамі, — кажа Валянціна Гарлінская. — А так толькі адной вады колькі трэба нанасіць, карміць, гной выкідваць. Муж цэлы дзень каля хлява таўчэцца.

У той частцы вёскі, дзе жывуць Гарлінскія, у статку 40 кароў. Так што кожны месяц ім выпадае роўна тыдзень пасвіць радоўку. Цяжка, але спраўляюцца. Трымаць меншую гаспадарку проста не могуць сабе дазволіць. Пётр Фёдаравіч цяпер працуе малаказборшчыкам ад Вілейскага гармалзавода. Яго заробак напрамую залежыць ад аб'ёму нарыхтовак. За кожную тону малака, якую прымае ад вяскоўцаў, атрымлівае 35 тысяч рублёў. Звычайна за месяц месічны здаюць каля 2-3 тон. Вось і выходзіць дзесьці 100-120 тысяч рублёў. А што гэта цяпер за грошы? Валянціна Фёдараўна працуе лабарантам ад ГМЗ і ў яе заробак яшчэ меншы, чым у мужа — 60 тыс. рублёў. Такім чынам, сямейны бюджэт Гарлінскіх складае 160-180 тыс. руб — роўна па 40-45 тыс. на кожнага члена сям'і. Так што ўсе спадзяванні толькі на ўласны падворак.

Яны ніколі не скардзяцца, паколькі самі абралі для сябе такі лад жыцця — цяжкі, але затое калі папрацуеш, то і вынік заўважны. Дакладней кажучы, канчатковы вынік Гарлінскія «вярстаюць» самі і, здаецца, гэта ім падабаецца. «Я сама сабе гаспадыня, — заўважае Валянціна Казіміраўна. — Іншыя нават зайздросцяць: маўляў, нядрэнна «ўладкавалася». А я ў адказ заўсёды заўважаю, што кожны можа паспрабаваць такога хлеба».

«Такі хлеб» — гэта штодзённая праца ад цёмнага да цёмнага. Раней гаспадыня восем кароў даіла ўручную, спраўлялася даволі хутка — за 40 хвілін, але праз пэўны час пачалі рукі моцна балець. Набылі за свае грошы даільны апарат і цяпер стала намнога лягчэй. Цяпер штодня здаюць па 80-90 літраў малака, а летам — па 130-140 л. За мінулы год Гарлінскія рэалізавалі рэкордную не толькі для Вілейшчыны колькасць — больш чым 36,5 тоны. Ад продажу малака атрымліваюць свой асноўны даход. Сёння вяскоўцам плацяць 665 рублёў за літр. Таксама існуюць «бонусы» за тлустасць. Базавы паказчык складае 3,4 працэнта, за перавышэнне на 0,1 % на кожныя здадзеныя 100 літраў «набягае» яшчэ 4. У Гарлінскіх тлустасць малака звычайна складае каля 4 працэнтаў. Няцяжка падлічыць, які аб'ём ім даюць за перавышэнне базавага нарматыву.

Зразумела, што для таго, каб было добрае малако, у кароў павінен быць адпаведны рацыён. Удосталь корму і не абы-якога, а збаланаванага. Гарлінскія гатуюць «мешаніну» (так тут называюць сумесь збожжавых і бабовых). Сеюць і шматгадовыя травы. На кожную карову на зімоўку неабходна назапасіць не менш за тры тоны сена. Большасць гэтага нарыхтоўваюць самі, закупляюць па мінімуму, каб зменшыць затраты на ўтрыманне.

Рэалізацыя малака прыносіць нядрэнны даход — за мінулы год Гарлінскія зарабілі больш чым 24 мільёны рублёў. Акрамя таго, поўнасцю забяспечваюць сябе гароднінай і мясам. Трымаюць дзвюх свіней, вырошчваюць бройлераў і індычак. Раней былі трусы, чарада авечак (якіх, праўда, давялося збыць, паколькі ў сям'і больш прывыклі да свініны і да птушынага мяса). На стале практычна ўсё сваё — смачныя натуральныя прадукты, у якасці якіх заўсёды ўпэўненыя. Хіба толькі хлеб у краме набываюць ды салодкія прысмакі. Так што багаты падворак сябе апраўдвае.

Мясціны тут маляўнічыя — непадалёк рэчка, каля якой няхай не так часта, аднак Гарлінскія выбіраюцца на адпачынак разам з дзецьмі, роднымі і сябрамі. Калі правільна арганізаваць справу, то часу на ўсё хопіць.

— Свая гаспадарка — у задавальненне, — заўважае Валянціна Казіміраўна. — Так больш надзейна сябе адчуваеш. Калі ў хляве трымаеш жывёлу, то ўжо ўпэўнены ў заўтрашнім дні.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.

Вілейскі раён.

«Опель» адкінула на сустрэчную

Каля шасці гадзін вечара каля Маладзечна ў дарожна-транспартнае здарэнне трапілі тры аўтамабілі.

Паводле звестак упраўлення дзяржаўтаінспекцыі МУС, 53-гадовая кіроўца, якая знаходзілася за рулём аўтамабіля «Опель», пры выездзе на галоўную дарогу сутыкнулася з аўтамабілем «Форд». Затым «Опель» адкінула на паласу сустрэчнага руху, па якой ехаў аўтамабіль «Лексус» — машыны таксама не змаглі разминуцца. У выніку гэтага ДТЗ кіроўца «Опеля» і яе муж загінулі, а пасажырка «Лексуса» атрымала раненні. Вадзіцель жа іншага «Опеля» трапіў у аварыю на аўтадарозе Слабада — Навасады — Людка з-за таго, што няправільна выбраў скорасць руху: аўтамабіль з'ехаў у кювет і перакуліўся. Для вадзіцеля гэтае здарэнне стала ракавым, а пасажыр з цяжкімі траўмамі быў шпіталізаваны.

Ігар ГРЫШЫН.

Рукамі і сэрцам

Работнікі апарата кіравання Навагрудскага лясгаса працавалі на добраўпарадкаванні тэрыторыі Курачкінай гары ў Налібоцкай пушчы — месцы ўвекавечання памяці чырвонаармейцаў, якія загінулі ў «Навагрудскім катле» ў ліпені 1941 года. У вёсцы Нізяны Ваўкавыскага раёна адрамантаваны помнік мясцовым камсамольцам-падпольшчыкам. Праводзіцца добраўпарадкаванне вайсковых могілак у Карэлічах, навучэнцы Мірскага мастацкага прафесійна-тэхнічнага каледжа аднаўляюць надпісы на плітах мемарыяльнага комплексу. Прыведзены ў парадак вайсковыя пахаванні Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у Астравецкім раёне. А ў Слоніме валанцёры БРСМ пасадзілі 150 бяроз у скверы, закладзеным у гонар 55-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і ў памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў у мікрараёне «Энка».

У Смаргоні 120 чалавек займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі дзіцячага аздараўленчага цэнтра «Лясная паляна». Свіслацкая, Ваўкавыская, Слонімская, Шчучынская раённыя арганізацыі «Белай Русі» за свае сродкі купілі саджанцы дрэваў для іх пасадкі на вуліцах, у парках і скверах. У Гродне прыведзены ў парадак старадаўнія каталіцкія могілкі на вуліцы Прыгараднай, у Лідзе — прыбярэжная тэрыторыя каскада азёраў, у Слоніме адрамантавалі і пафарбавалі масты цераз Шчару і канал Агінскага.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Парадак на кожным кавалку зямлі

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік у суботу працаваў на будаўніцтве Дзіцячай вёскі-SOS у абласным цэнтры. Разам з калегамі ён пасадзіў дрэвы і выканаў бетонныя работы на ўзвядзенні дома.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Кіраўнік вобласці лічыць суботнік за свята, карыснае для ўсяго грамадства.

— Сёння цудоўнае надвор'е, мы выйшлі з добрым настроем і робім патрэбную справу, — сказаў журналістам Пётр Міхайлавіч. — Кожны чалавек на сваім участку працуе і будзе старацца, каб мы не толькі навялі парадак на сваёй зямлі, але і пасля ставіліся да яго з увагай і павагай.

Супрацоўнікі аблвыканкама з раніцы працавалі на добраўпарадкаванні тэрыторыі і пасадцы дрэваў. Цяпер каля Дзіцячай вёскі-SOS будуць расці туі, рабіны і шарападобныя вербы.

— Суботнікі — гэта адна з найлепшых савецкіх традыцый, — упэўнены намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка. — Гэта абуджэнне вясны і генеральнае прыбіранне. Калі працоўныя калектывы разам збіраюцца для таго, каб прыбраць свой горад ці вёску ад зімы і бруду, то гэта аб'ядноўвае людзей. Таму ад суботнікаў — толькі пазітыўныя эмоцыі.

Сродкі, сабраныя на рэспубліканскім суботніку жыхарамі Магілёўскай вобласці, пойдуць на добрыя справы: на ўзвядзенне ў абласным цэнтры помніка дзецям вайны на вуліцы Лазарэнкі і абнаўленне воінскіх пахаванняў і мемарыялаў Вялікай Айчыннай вайны. Частка сродкаў ад суботніка таксама паспрыяе ўмацаванню матэрыяльнай базы аздараўленчых дзіцячых лагераў. У цяперашні складаны фінансавы час гэта назіваюць добрым пачынам. Увогуле ў Магілёўскай вобласці ў суботніку бралі ўдзел 425 тысяч чалавек, якія зарабілі 1,2 мільярда рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

Азелянялі, фарбавалі, будавалі...

Сёлетні суботнік у Баранавічах істотна не адрозніваўся ад мінулагодніх. Дастаткова было прайсціся па пасёлку тэкстыльшчыкаў, каб убачыць гэта. Нехта бяліў дрэвы ці зграбаў смецце, а тэрыторыя хлебазавода і прылеглы сквер прывялі ў парадак яшчэ напярэдадні. І толькі работнікі завода жалезабетонных вырабаў дружна фарбавалі металічную агароджу наўкол свайго прадпрыемства.

За рыдлёўкі, спадары!

На ўездзе ў Баранавічы з боку Навагрудка працавалі работнікі гарвыканкама і дэпутаты гарсавета — абапал дарогі саджалі дрэвы. Тут суботнік пачаўся роўна ў восем гадзін раніцы, а калі я пад'ехаў, то работа ўжо заканчвалася.

Дырэктар КУП «Кветкі» Любоў АЛЬШЭЎСКАЯ расказала:

— Тут сёння пасаджана 300 дрэў — гэта ў асноўным клён, ліпа, рабіна..., а калі браць па горадзе ў цэлым, то ў скверы па вул. Убарэвіча нашым прадпрыемствам пасаджана 100 дрэў, сіламі ЖКГ у гарадскім парку — яшчэ столькі ж. А калі дадаць да гэтага 10 тыс. кветак і 170 тыс. розных кустоў для азелянення, то ўклад зроблены важкі.

У Ганцавічах супрацоўнікі райвыканкама выехалі на суботнік у СВК «Бярозавец» і там разам з работнікамі ПМК-14, ДРБУ № 100 і райаграсэрвісам працавалі на будаўніцтве малочнай фермы — бетанавалі падлогу, праводзілі водаправад, клалі дах.

А ў Ляхавічах заклалі сквер, прысвечаны 65-годдзю Перамогі. Работнікі ж райвыканкама і дэпутаты на суботнік выправіліся ў СВК «Дружба» перабіраць бульбу ды ў Тальмінавічы, дзе на палях мясцовага сельгаскааператыва збіралі каменне.

Сёння суботнік ужо страціў сваё ід

Рэпарцёр атрымаў заданне...

Наведацца ў шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны

З загадчыкам другога тэрапеўтычнага аддзялення Феліксам Якаўлевічам Каліноўскім заходзім у адну з палат. Знаёмімся: Уладзімір Паўлавіч Пузанаў 1923 і Георгій Навумавіч Ганкін 1926 гадоў нараджэння. Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, інваліды. У часы ваеннай віхуры давялося ім ваяваць на розных франтах: першаму — камандзірам танкавага ўзвода, другому — пехацінцам. Колькі на іх рахунку знішчаных ворагаў — не лічылі, а вось пра тое, што Уладзімір Паўлавіч гарэў у сваёй падбітай снарадам баявой машыне, а Георгій Навумавіч ледзь выжыў пасля цяжкіх раненняў і кантузіі пад Кёнігсбергам, расказваюць. Інваліды, на грудзях якіх ордэны і медалі, і зараз вострa адчуваюць тыя раны і горыч страт сваіх баявых сяброў. І шчыра дзякуюць персаналу шпіталя за тыя клопаты, лячэнне і ўвагу, якія медыкі праяўляюць да іх.

У наступнай палаце тры жанчыны — Васа Цярэнцьеўна Кавалёва, Марыя Аляксандраўна Двойных і Марыя Мікіфараўна Шульга. І яны былі ў тым пекле вайны. Былыя кухар, медык і сувязістка глядзелі смерці ў вочы. Дзякуй Богу, выгадавалі, вырасцілі дзяцей, радуюцца ўнукам і праўнукам.

Ды толькі вось здароўе падводзіць, таму кожны год прыязджаюць у шпіталь, лекі розныя прымаюць, працэдуры праходзяць. І вядома ж, просяць праз газету выказаць падзяку ўрачам, сястрычкам, нянечкам. Бо тыя дапамагаюць і ў лячэнні, і ў падняцці настрою, і ва ўсім астатнім, у чым мае патрэбу хворы чалавек. Разумею іх і вяду размову з галоўным урачом шпіталя Алегам Іванцовым.

Спачатку Алег Анатольевіч пазнаёміў мяне з гісторыяй установы. Як высветлілася, біяграфія яе бярэ свой пачатак са жніўня 1942 года ў горадзе Бійску Алтайскага краю. Гэта быў эвакуацыйны шпіталь № 1235 на 600 ложкаў, у якім пралячыліся многія дзясяткі тысяч параненых чырвонаармейцаў. Калі быў вызвалены Гомель, шпіталь быў перадыслацыраваны сюды, бліжэй да фронту. Вось тады ён і стаў называцца «Шпіталем для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны».

Зараз шпіталь мае два корпусы, аднаму з якіх 25, а другому — пяць гадоў.

— І што сёння, Алег Анатольевіч?

— Працуюць гэтыя корпусы, і ў іх штогод высокакваліфікаванае спецыялізаванае лячэнне атрымліваюць больш за 10 тысяч пацыентаў.

— Няўжо столькі інвалідаў вайны ў нашай вобласці?

— Ды не, што вы! На пачатак гэтага года на ўліку ў арганізацыях аховы здароўя Гомельшчыны знаходзілася 1710 інвалідаў вайны, 4079 — удзельнікаў яе, 3139 — ваенных інвалідаў, 1597 — членаў сем'яў загінулых воінаў, 8321 былы вязень фашысцкіх канцлагераў, 2025 — тылавікоў, 352 — інваліды, якія атрымалі ваенныя траўмы. Такім чынам атрымліваецца, што на абслугоўванні ў нас знаходзіцца 21 223 чалавекі.

— З гэтага вынікае, што ў шпіталі атрымліваюць медыцынскую дапамогу не толькі інваліды вайны. Дарэчы, і ў размовах з хворымі, і ў кнізе водгукаў людзі выказваюць вашаму персаналу шчырую ўдзячнасць за тое, што вы робіце. І падкрэсліваюць не толькі высокую кваліфікацыю ўрачоў і сярэдняга медыцынскага персаналу, а і ветлівасць, спагаду, клапатлівасць.

— Інакш і быць не можа. Персанал стараецца дапамагчы хворым па меры сваіх сілаў і магчымасцяў. І вы правільна заўважылі, што мы пралечваем не толькі інвалідаў вайны, але і іншы льготны кантынгент.

Варта адзначыць, што ўмовы лячэння ў шпіталі добрыя. Комплекс знаходзіцца на ўскраіне Гомеля ў прыгожым лясным масіве, дзе паветра прасякнута хваёвым водарам. Корпусы прасторныя, у іх функцыянуюць чатыры тэрапеўтычныя, два неўралагічныя, пасляінфарктнае, пасляінсультнае і пасляраўматалагічнае аддзяленні. Ёсць таксама аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі, функцыянуюць сем самастойных кабінетаў.

У шпіталі сёння 480 ложкаў для хворых. У новым корпусе палаты на аднаго, двух і трох чалавек, у кожнай з якіх прыбіральні. У старым, трэба прызнаць, яшчэ ёсць, хай сабе і няшмат, палаты і на 4—5 чалавек. Галоўнае ж — лячэнне. Шпіталь аснашчаны самай сучаснай дыягнастычнай апаратурай. Ёсць камп'ютарны тамограф, тры ўльтрагукавыя апараты для даследавання ўнутраных органаў, распрацавана методыка дыягностыкі работы нервовых канчаткаў, якія размешчаны ў мышачных тканках, выконваецца фібрагастраскапія сучаснымі японскімі эндаскопамі.

Магутнае і аддзяленне фізіятэрапіі, дзе праводзяцца ўсе неабходныя працэдуры. Тут табе і басейн, і гразелячэнне, і салявыя, хвойныя і радонавыя ванны, масажныя кабінеты, іголкатэрапія. Адным словам, увесь комплекс фізіялячэння, у тым ліку УВЧ, лазер, ультрафіялетавае апраменьванне...

— А ці хапае лекаў, Алег Анатольевіч?

— З медыкаментаў усё ёсць. А калі чаго няма, маем права закупіць лекі ў працэсе лячэння. Усё неабходнае выдзяляецца, нягледзячы на сусветны крызіс, хоць фінансаванне і жорсткае, і сродкі трэба рацыянальна выкарыстоўваць.

На базе шпіталя размешчаны дзве кафедры Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта: нервовых хваробаў, якую ўзначальвае вядомы вучоны ў Рэспубліцы Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Валянціна Латышава, і кафедра прапедэўтыкі ўнутраных хвароб (кандыдат медыцынскіх навук дацэнт Леанід Раманькоў).

Работнікі шпіталя сістэматычна выязджаюць у раёны вобласці правяраць стан медыцынскага забеспячэння ветэранаў вайны, даюць кансультацыі. Ёсць тут музей гісторыі шпіталя і нават зімовы сад з акварыумам.

— Зараз мы рыхтуемся да Дня Перамогі і 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Будуць і канцэрты, і фільмы для нашых пацыентаў, і святочнае меню для ветэранаў у сталовай, — кажа Алег Анатольевіч. І ўздыхае пры гэтым. — Шкада толькі, што інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны з кожным месяцам становіцца ўсё менш і менш.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Шануй сваё!

Назавіце сваё прозвішча

Прозвішча — наш індэнтыфікатар у сучасным жыцці. У якую ўстанову ні пойдзеш — пытаюць перш-наперш прозвішча. Ужо недастаткова сказаць, як некалькі стагоддзяў таму, што ты «Васіль з хутара за рэчкай і сын Пятра» — без прозвішча ні жаніцца, ні памерці. Напэўна, кожны з нас хоць раз у жыцці ды задумваўся, што ж азначае ўласнае прозвішча і адкуль яно паходзіць? Дапамагчы разабрацца з нашымі прозвішчамі «Звязда» папрасіла **Ігара КАПЫЛОВА, кандыдата філалагічных навук, вучонага сакратара Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, загадчыка аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі**.

Ігара КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар «Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі», загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі.

— Ігар Лявонавіч, раскажыце, калі ласка, адкуль жа нагул узяліся прозвішчы?

— Само слова familia (ад лат. сям'я, род) існавала задоўга да ўзнікнення прозвішчаў у сучасным сэнсе. У старажытных рымлянаў слова famulus абазначала «дамашні раб», а familia — гэта група рабоў, якія належалі аднаму чалавеку. Пазней у мовах Еўропы яно стала абазначаць сям'ю, род і ў гэтым значэнні было запазычана ў рускую мову пры Пятры I. Афіцыйнае справаводства пачало патрабаваць, каб ва ўсіх дзяржаўных установах людзей называлі па імені, імені па бацьку, прозвішчы. Аднак «фамилии» як элемент называння рускіх людзей існавалі і раней, але называліся яны «прозвищами», «прозваниями». У XVII—XVIII стст. яшчэ бытавала слова «прозвище» ў тым жа самым значэнні, што і сучаснае рускае слова «фамилия». І толькі ў XIX стагоддзі слова «фамилия» ў рускай мове набыло сваё асноўнае значэнне, якое яшчэ пазней змянілася з «сям'і» на «спадчыннае сямейнае найменне». Цікава, што, нягледзячы на шырокае распаўсюджанне ў многіх еўрапейскіх мовах слова «фамилия», у беларускую і ўкраінскую літаратурныя мовы яно так і не ўвайшло: і сёння ў нас ужываецца слова «прозвішча» (укр. прізвище). Вучоныя лічаць, што ў сучасным значэнні прозвішчы ўпершыню з'явіліся ў X-XI стст. у Італіі, эканамічна найбольш развітой вобласці Еўропы. Праўда, існуюць выказванні, што, напрыклад, армяне мелі прозвішчы ў IV ст., а грузіны — у VI ст. Але гэтыя факты патрабуюць дадатковага вывучэння. Затым у XI стагоддзі прозвішчы з'явіліся ў Правансе, найбольш высокаразвітой эканамічна і культурна частцы Францыі, а там і распаўсюдзіліся па ўсёй краіне, а яшчэ пазней — па Англіі, Германіі, Даніі, Швецыі...

— Ну а да славянаў калі прозвішчы «дакаціліся»?

— У славян прозвішчы сфарміраваліся адносна позна: з XV-XVI стагоддзямі звязваюць з'яўленне прозвішчаў у палякаў, XVII-XVIII — у чэхаў. Даволі позна сталі карыстацца прозвішчамі і ўсходнія славяне: на тэрыторыі Расіі ўпершыню прозвішчы з'явіліся ў XIV-XVI стагоддзях і служылі саслоўнай прывілеяй. Першымі атрымалі прозвішчы князі і баяры, прычым большая частка княжацкіх, а затым і баярскіх прозвішчаў указвала на тыя землі, якія належалі феадалу. У XVI-XVII стагоддзях прозвішчы пачалі з'яўляцца ў асяроддзі дваран. Яшчэ пазней прозвішчы з'явіліся ў купцоў. XVII-XVIII стагоддзі — перыяд фарміравання прозвішчаў у гараджан, да канца XVIII стагоддзя ўсе памешчыкі мелі свае прозвішчы. А вось духавенства асноўную масу прозвішчаў атрымала ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Што тычыцца сялян, то яны не мелі прозвішчаў да сярэдзіны XIX стагоддзя. А ў нас, у беларусаў, прозвішчы ўзніклі ў XVI-XVIII стст. Менавіта ў гэты перыяд стабілізуецца новая сістэма найменняў асобы: імя, імя па бацьку, прозвішча.

— А што яшчэ было асновай для прозвішчаў? Ну, не проста ж з галавы людзі сабе іх прыдумвалі?

— Многія прозвішчы вядуць сваё паходжанне ад дахрысціянскіх імён-мянушак, якія ў XVI-XVIII стст. страчваюць сваю функцыю і набліжаюцца па функцыі да прозвішчаў. Некаторыя ўтварыліся ад агульных слоў. Сёння цяжка вызначыць, якое прозвішча ўзнікла праз стадыю імені-мянушкі, а якое непасрэдна на базе агульнага назоўніка. У старажытнасці практычна любое слова магло выкарыстоўвацца ў якасці імені-мянушкі, а затым і прозвішча. Галоўнае ў іх — назва асобы па якой-небудзь вызначальнай прыкмеце. Таму імёны-мянушкі ў момант свайго ўтварэння фактычна ўсе матывавараныя. Выдзяляюцца 2 групы імёнаў-мянушак: 1) у якіх агульная лексіка выкарыстана ў прамым значэнні; 2) у якіх асоба характарызуецца метафарычна. У аснове імёнаў-мянушак першай групы магла быць характэрная індывідуальная рыса, якая вылучае асобу з ліку іншых, напрыклад, па знешнім выглядзе і фізічных якасцях — Малюка "чалавек малога росту", Белавус, Шырай "шыракаплечы чалавек", Шульга "левая рука і нага", Клыпа "кульгавы, крываногі чалавек", Салагуб "чалавек з тоўстымі, заўсёды мокрымі губамі", Фурс "маларослы чалавек" і іншыя. Ці па рысах характару і іншых якасцях — Галуза "гарэза, свавольнік, валацуга", Ламака "гультай", Сумарока "негаварлівы, нелюдзімы чалавек", Шуміла "той, хто любіць лаяцца", Гогаль "смелы, адважны чалавек", Шкель "насмешнік", Шаціла, Гамеза "надакучлівы чалавек" ды іншыя. Або па асаблівасцях мовы (Гаркун, Гугнявы), або па становішчы ў сям'і ці грамадстве (Адзінец "адзінокі чалавек", Траян "бацька траіх блізнят"), або па прафесіі ці службовым становішчы (Аскер "воін", Кухта "прыслужнік, вучань кухара", Прудник "млынар на вадзяным млыне"), або па назве месца (Падаляка, Валынец, Пінчук), або па этнічнай прыналежнасці асобы (Літвін, Кашуба, Мазур, Прус), або па абставінах з'яўлення новага члена сям'і (Пазняк, Жданок).

Імёны-мянушкі другой групы характарызуюць асобу метафарычна. Напрыклад, прозвішчы па асаблівасцях знешняга выгляду і паводзін, уласцівых жывёлам, птушкам, насякомым, раслінам: Трус (баязлівы чалавек), Ліса (хітры чалавек), Арол (адважны чалавек).

Дарэчы, у адрозненне ад рускай мовы, у нашай мове такія прозвішчы ў вялікай колькасці (больш за 40 %) захаваліся ў першасным выглядзе (Верабей, Жук, Сарока); у рускай мове да іх асноў, як правіла, далучаліся суфіксы -ай, -ёў, -ін (Жукаў, Сарокін, Баранаў). Распаўсюджанне на расійскай тэрыторыі прозвішчаў, не ўскладненых суфіксамі, абавязана беларускай мадэлі. Гэта адна са з'яў, дзе праявіўся ўплыў беларускай мовы на рускую.

— Ёсць у людзей і «негатыўныя» прозвішчы — Магіла, Нелюб. Гэта значыць, што продкі ў іх былі дрэннымі людзьмі?

— Не, бо шматлікія славянскія імёны, якія потым перайшлі ў прозвішчы, выконвалі не толькі функцыю ідэнтыфікацыі, але і прафілактыкі. Каб засцерагчы дзіця ад злых сілаў, даваліся немілагучныя, з адмоўным значэннем імёны: тыя ж Магіла, Нелюб ці Захварай, Няўдача.

— Цікава, ці можна неяк класіфікаваць усе прозвішчы, аб'яднаць іх у групы?

— Вядома, можна вылучыць найбольш тыповыя для Беларусі групы, напрыклад: назвы свойскіх жывёл (Казёл, Лашак, Кот, Козік, Вапручок, Цялок), назвы дзікіх звяроў і іншай жыўнасці ды раслін (Бобр, Жук, Сверш "цвыркун", Строк "авадзень", Пугач, Грыб), прадметы адзення (Дзяруга, Лапаць), назвы посуду (Берасцень, Рондаль), назвы прадуктаў харчавання (Лойка, Груца, Кулага, Бохан) і гэтак далей. Так, па многіх сучасных прозвішчах можна меркаваць аб занятках і рамёствах нашых продкаў: Буднік "рудакоп", Важнік "вагаўшчык", Гарнак "той, хто вырабляе зброю", Дубовік "рулявы на лодцы плытагонаў, якая называецца дуб", Рында "целаахоўнік", Салёнік "прадавец солі", Сінельнік "фарбавальшчык, той, хто фарбуе тканіны", Сітнік "той хто робіць і прадае сіты", Шатэрнік "майстар, які робіць шатры", Шмаравоз "той, хто падмазвае калёсы", Авечнік "даглядчык авечак". Да таго ж у асновах многіх сучасных беларускіх прозвішчаў захаваліся словы, якія даўно выйшлі з ужытку: Асмак "манета ў восьмую частку гроша", Байдак "рачное судна", Барыла "бочачка", Бат "лодка, судна", Кухта, Лежань "беглы, уцякач", Саян "жаночае адзенне", Хандога "той, хто любіць чысцію, ахайны чалавек", Чугай "плашч ці апанча татарскага фасону". Ці захаваліся словы, якія сустракаюцца толькі ў асобных рэгіёнах Беларусі: Апока "гультай, лежабок", Астроўка "піраміда з сукаватых калоў для сушкі снапоў", Бінда "чалавек з тоўстымі вуснамі", Герцык "хітрун, ашуканец", Жалязняк "рыдлёўка", Мандрык "вандроўнік", Матлох "неўраўнаважаны чалавек", Найда "непаседа", Пракурат "хітрун", Саламаха "каша з кукурузы", Статак "той, хто даглядае стада", Стадольнік "вартаўнік пры заезным доме", Трапачка "мянташка", Цурган "крышаны хлеб, змочаны вадою і пасолены", Чавус "чыгун".

— Наша краіна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, тут столькі народу рознага прайшло — хто з вайной, хто з мірам. Павінны ж быць і прозвішчы з іншых моваў?

— Сучасны беларускі фонд прозвішчаў фарміраваўся на працягу стагоддзяў. Розныя сацыяльна-гістарычныя фактары сапраўды паўплывалі на тое, што ў генетычных адносінах нашая сістэма прозвішчаў з'яўляецца вельмі неаднароднай і ўключае шматлікія рускія, польскія, балтыйскія, нямецкія, цюркскія, габрэйскія і іншыя запазычаныя элементы. Напрыклад, з рускай мовы да нас прыйшлі Іваноў, Пятроў, Кузняцоў, з украінскай — Ганчарэнка, Селех, Талапа, з літоўскай — Стульба, Жамойта, Жвірбля, Ожэль, Парэйка, з кіргізскай — Корсак, Будай, Болсун, Булах, з польскай — Вевер, Венжык, Лакотка, з татарскай — Солтан, Дага, Талатыннік, з башкірскай — Байман, з габрэйскай — Фрыдман, Левін і гэтак далей. У сувязі з гэтым узнікае няпростае пытанне, што ж адносіць да беларускіх прозвішчаў...

— І сапраўды, Ігар Лявонавіч, якія ж прозвішчы лічыць беларускімі?

— Пры вызначэнні беларускіх прозвішчаў галоўным з'яўляецца не нацыянальнасць носьбіта прозвішча, а форма назвы. Сярод беларускіх прозвішчаў выдзяляюцца простыя (Вярба, Сойка), вытворныя (Александровіч, Кліменка), складаныя (Кажадуб, Рабаконь), падвоеныя (Дунін-Марцінкевіч). Праўда, і форма слова не заўсёды з'яўляецца паказчыкам нацыянальнасці носьбіта прозвішча. Так, распаўсюджана меркаванне, што носьбітамі прозвішчаў на -оў, -еў з'яўляюцца рускія. Але дзясяткі мільёнаў прадстаўнікоў народаў Каўказа і Сярэдняй Азіі маюць прозвішчы на -оў,-еў: Магамаеў, Гамзатаў, Назарбаеў і інш. У такім выпадку вызначальную ролю іграе аснова слова: калі ў аснове слова ляжаць уласнабеларускае слова, слова, якое сустракаецца толькі ў беларускіх гаворках, то гэта дае падставы меркаваць аб нацыянальнай прыналежнасці чалавека. А ўвогуле, пры высвятленні паходжання прозвішча трэба падыходзіць комплексна: разглядаць аснову слова, яго структуру, а таксама гісторыю роду.

— Ну, а якія мадэлі будуць тыповымі для Беларусі?

— Найбольш распаўсюджаны на Беларусі прозвішчы на -іч, -овіч, -авіч, -евіч (Трафімовіч, Пракаповіч, Васілевіч). Паводле назіранняў акадэміка М.В. Бірылы, найбольшая іх канцэнтрацыя — у паўночнай частцы Мінскай вобласці. У раёне Вілейкі, Крывічоў, Бягомля яны складаюць звыш 50%, з'яўляюцца найбольш частотнай мадэллю. Высокая ўжывальнасць іх у раёне Барысава, Браслава, Пружанаў, Лунінца. Чым больш на ўсход, тым менш сустракаецца такіх прозвішчаў, а ў раёне Лоева і Рэчыцы яны амаль не сустракаюцца. Цікава, што ў Маскоўскай Русі формы на -іч паказвалі на знатнасць паходжання. А вось на беларускіх землях прозвішчы на -іч даваліся прадстаўнікам усіх саслоўяў.



Тыповымі для Беларусі з'яўляюцца прозвішчы на -онак/-ёнак (Казачонак, Латышонак), на -эня/-еня (Астапеня, Аніселя, Ануфрыеня), на -ук/-юк (Клімук, Лукашук) на -эйка (Кудрэйка, Абламейка), на -скі/-цкі (Гіруцкі, Бараноўскі), на -ык /-ік (Прышчэпчык, Бандарчык). Часцяком сустракаюцца прозвішчы на -энка/-енка (Абраменка, Каваленка) на -аў, -оў/-еў, -ын/-ін (Сідораў, Міхасёў, Батурын).

— Значыць, шляхетнасць па прозвішчы не вызначыць?

— Я лічу, што носьбіт таго або іншага прозвішча павінен спецыяльна даследаваць свой радавод. У нас сёння кожны другі хоча быць шляхціцам, бываюць часам недарэчныя выпадкі. Вось да нас жанчына прыйшла і кажа: «Няма ніякага жыцця ад суседкі — тая б'е сябе ў грудзі, што яна дваранка, шляхцянка, а мяне чэрню абзывае. Дайце мне даведку аб паходжанні прозвішча». А наш дырэктар ёй і кажа, што нічога страшнага, што ён — з сялян, але прафесар і дырэктар інстытута. І параіў абсалютна не саромецца свайго прозвішча, і, натуральна, даведкі ніякай не даў. Я мяркую, што вызначыць па прозвішчы шляхецкасць паходжання чалавека — немагчыма.

Цікава, што 55 % прозвішчаў жыхароў Беларусі знаходзяць тлумачэнне на базе лексікі беларускай мовы, недзе каля 6 % — на базе рускай мовы, і каля 3 % — на базе ўкраінскай мовы. Цюркскае і літоўскае паходжанне маюць прыкладна 3 %. А вось паходжанне цэлых 33 % нашых прозвішчаў пакуль яшчэ не высветлена (Шыян, Дода, Бабарыка, Канога)...

— А вось жа ў розных кутках краіны свае прозвішчы. Ці можна па прозвішчы сказаць, адкуль чалавек?

— Сапраўды, той ці іншы тып прозвішча характэрны для пэўнай тэрыторыі. Я выкладаю ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце. І калі знаёмлюся са студэнтамі, то часта толькі па прозвішчы магу вызначыць, адкуль прыехаў чалавек. Напрыклад, калі знойдзецца студэнт з прозвішчам на -ук, то можна сцвярджаць, што ён хутчэй за ўсё з Брэсцкай вобласці, яе паўночнай часткі, а яшчэ дакладней — Баранавіцкага раёна. Бо толькі там сканцэнтраваны арэал прозвішчаў на -ук, -юк.

Што тычыцца іншых прозвішчаў, то на -оў, -аў, -эў, -еў (Капылоў, Машэраў, Конеў) шырока вядомыя на ўсходняй тэрыторыі Беларусі, дзе ў асобных раёнах іх колькасць перавышае 60%. Прозвішчы на -ін, -ын (Лукін, Смерцін) найбольш часта сустракаюцца ва ўсходняй частцы Беларусі. Прозвішчы на -скі распаўсюджаны ў польскай мове (Урублеўскі, Бандажэўскі, Заянчоўскі, Пшыгоцкі), у нас яны часцей за ўсё сустракаюцца ў Гродзенскай і Мінскай абласцях, ва ўсходняй частцы Віцебскай вобласці і складаюць прыкладна 10% ад усіх прозвішчаў. У прозвішчах на -скі, утвораных ад геаграфічных і тапаграфічных назвах, суфікс -скі паказвае на сувязь асобы з месцам паходжання або жыхарства: Савіцкі, Баранавіцкі, Гарадоцкі. Тып прозвішчаў на -ік/-ык сустракаецца на поўначы Брэсцкай і ў паўднёвай і заходняй частцы Гродзенскай вобласці (Базыльчык, Агейчык). Для самой Брэсцкай вобласці характэрны прозвішчы на -ук/-чук (Клімук, Кавальчук), а ў некаторых мясцовасцях Брэстчыны яны складаюць амаль палову ўсіх прозвішчаў мясцовых жыхароў. Затое ва ўсходняй частцы Віцебскай вобласці, у Магілёўскай і Гомельскай абласцях гэты тып увогуле не сустракаецца або адзначаюцца адзінкавыя прыклады. Тып на -енка (Ганчарэнка), распаўсюджаны ва Украіне, у нас канцэнтруецца ў раёне Віцебска, Мазыра-Рэчыцы-Лоева. А вось прозвішчы на -еня/-эня характэрны для паўднёвай часткі Мінскай вобласці і паўночнай часткі Брэсцкай (Калюженя, Адаменя).

— І нарэшце, Ігар Лявонавіч, а навошта наогул прозвішчы даследаваць? Ну, ёсць яно ў чалавека — і добра, жыві сабе...

— Ну як жа ж! Прозвішчы з'яўляюцца класам лексікі, які найбольш звязаны з дзейнасцю чалавека, яны адлюстроўваюць самыя розныя бакі жыцця народа і навакольнага асяроддзя. Даследаванне імёнаў і прозвішчаў мае вялікае значэнне для вывучэння этнічнай гісторыі народа, яго духоўнай і матэрыяльнай культуры. Акрамя гістарычнага боку, існуе і прыкладны — гэта стварэнне сістэмы правільных скланенняў прозвішчаў, правільнай перадачы беларускіх прозвішчаў на рускую мову, іх транслітэрацыя. Зараз мы сумесна з дацэнтам кафедры гісторыі беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта Ірынай Гапоненка падрыхтавалі праект «Сучасная сістэма беларускіх прозвішчаў: склад, асаблівасці напісання, словаўтварэння, скланення і транслітэрацыі», у якім мы сабралі і прааналізавалі каля 60 тысяч беларускіх прозвішчаў. І спадзяёмся, што нашая праца знойдзе шырокае ўжыванне ў штодзённай практыцы пашпартных сталоў, ЗАГСаў, натарыяльных кантор, пры выпісцы пасведчанняў, дыпломаў і гэтак далей.

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

Спорт-тайм

«Тарпеда» выйшла ў лідары

У выхадныя адбыліся тры матчы другога тура чэмпіяната Беларусі па футболе.

У Смаргоні мясцовы клуб утрымаў свае вароты «сухімі» ў гульні супраць мінскага «Дынама», матч завяршыўся з лікам 0:0. Гульня вызначылася сутычкай паміж фанатамі клубаў на трыбунах. Дынамаўскім балельшчыкам не спадабаўся смаргонскі банер, што выклікала бойку і з'яўленне АМАПу. Таксама ўнічыю, але з лікам 1:1, завяршылася ў Гомелі сустрэча мясцовага клуба з «Віцебскам». У Пінску перамогай гасцей з Жодзіна завяршыўся матч «Граніт» — «Тарпеда». Падапечныя Алега Кубарава выйгралі 3:1.

«Ак Барс» выйграў Кубак Гагарына

12 красавіка ў Казані адбылася апошняя, сёмая сустрэча паміж мясцовым «Ак Барсам» і яраслаўскім «Лакаматывам» у рамках фіналу Кантынентальнай хакейнай лігі. Матч завяршыўся мінімальнай перамогай казанцаў.

Такім чынам, «Ак Барс» стаў першым у гісторыі ўладальнікам Кубка Гагарына. Адзіны гол у матчы на 11-й хвіліне трэцяга перыяду забіў капітан «Ак Барса», нападаючы Аляксей Марозаў. Фінальная серыя плэй-оф КХЛ, якая стартавала 2 красавіка, доўжылася да 4 перамог. Яраслаўскі «Лакаматыў» пастаянна захопліваў лідарства ў серыі, але «Ак Барс» кожны раз адыгрываўся. Настаўнік «Ак Барса» Зінэтула Біляletдзінаў, дзякуючы перамозе сваіх падапечных, стаў самым тытулаваным трэнерам у гісторыі расійскага хакея.

КОСМАС ЧЭРВЕНЬСКАГА ХЛОПЦА

У дзяцінстве мяне прыцягвала зорнае неба. Разглядаць яго марознымі яснымі вечарамі было такой асалодай... А яшчэ мы з братам спаборнічалі ў настольнай гульні на лепшае веданне сузор'яў. Той чорны дыск з серабрыстымі зоркамі і зараз перад вачыма...

Але чым больш мы сталелі, тым часцей мае аднакласнікі з СШ № 2 г. Чэрвеня мянялі ўяўленні аб будучай прафесіі. Знікла са школьных анкет такое прыцягальна-ўзнёслае, але насамрэч недасяжнае слова «касманаўт», саступіўшы месца рэальна-празаічным — «шафёр», «будаўнік», «механік»... І толькі адзін светлавалосы хлопчык Алег Навіцкі не здрадзіў сваёй мары. Ён проста зрабіў да яе больш прыступак, паставіўшы першую мэту — стаць лётчыкам.

...Мы не бачыліся з ім 22 гады — столькі часу прайшло пасля заканчэння васьмі класаў, калі я абрала для далейшай вучобы Магілёўскае педвучылішча. Чамусьці нават у Чэрвені не перасякаліся нашы сцежкі. Але аднойчы мне патэлефанавала наша настаўніца матэматыкі Вольга Васільеўна Ефіменка. Падчас размовы яна паведаміла, што Алег Навіцкі зараз — у Зорным гарадку, у атрадзе касманаўтаў.

Сказаць, што я была здзіўлена, — не сказаць нічога. Фантастыка! Няўжо мой аднакласнік можа паляцець у космас? Журналісцкая цікавасць, прыплюсаваная да жаночай, не давала спакою. Але задаволіць яе ў век інтэрнэту аказалася нескладана. Сапраўды, сайт «Аднакласнікі» — гэта рэч! З Чэрвеня ў Зорны гарадок (няйнакш, як праз касмічную прастору!) паляцеў мой электронны ліст. Пару дзён чакання — і вось ён, адказ. А якое цікавае фота! Толькі... я не пазнала на ім свайго аднакласніка.

Мы дамовіліся пра сустрэчу ў Чэрвені, калі Алег прыедзе да бацькоў у адпачынак. І яна адбылася.

Першыя хвіліны няёмкасці праходзяць хутка. І я спяшаюся распытацца, здаецца, аб усім адразу. І пры гэтым усё адно хвалююся. Бо мой аднакласнік (не верыцца!) — самы сапраўдны кандыдат у касманаўты-выпрабавальнікі.

— Алег, а з чаго пачаўся твой доўгі шлях да Зорнага?

— Відаць, з лётнага вучылішча. Мне пашанцавала: сцежку «ў лётчыкі» праклаў стрыечны брат Ігар Навіцкі. Ён паступіў у Барысаглебскае лётнае вучылішча, якое знаходзілася ў Варонежскай вобласці. Вось Ігар і распавёў мне падрабязна, што патрэбна для паступлення. І я пачаў рыхтавацца, так бы мовіць, прадметна. Круціўся на стуле ў святле і ў цемры. Адзін-два разы на тыдзень бегаў па 20 кіламетраў. Медкамісію прайшоў у Мінску — і паехаў паступаць у Вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў імя Чкалава. Конкурс быў дзесяць чалавек на месца. Шмат адсеялася падчас медкамісіі, здачы фізічнай падрыхтоўкі. Здаў экзамены, набраў прахадны бал і паступіў. Вучыўся доўга...

— А па якой спецыяльнасці?

— Яна там была адна — «знішчальна-бамбардзіровачная авіяцыя». Правучыліся мы два гады, год ужо адляталі — і вучылішча зачынілі. Нас перавялі ў Ейск. Там авалодвалі спецыяльнасцю два гады, здалі дзяржаўныя экзамены. Але выпускаліся ўжо ў вучылішчы, што ў Валгаградзе. Атрымалася, пакуль я спраўдзіў сваю бліжэйшую мару, змяніў тры навучальныя ўстановы.

Алег НАВІЦКІ на лётным полі.

— І куды цябе размеркавалі?

— Напачатку накіравалі ў Барысаглебскі цэнтр перанавучання і падрыхтоўкі лётнага складу. Мы ж выпускаліся на вучэбных самалётах, а там перавучвалі на баявыя. Пасля паехаў на Паўночны Каўказ, адтуль — у горад Будзёнаўск. Прыбыў да месца службы якраз пасля сумна вядомых падзей, калі Басаеў захапіў бальніцу. У Будзёнаўску я праслужыў амаль дзесяць гадоў. Прайшоў прыступкі ад лётчыка да намесніка камандзіра эскадрыллі. Давялося ўдзельнічаць у баявых дзеяннях у Чачні. Узнагароджаны гадзіннікам за асабістую мужнасць, медалямі.

У 2004-м мяне накіравалі на вучобу ў Вышэйшую ваенна-павет-раную акадэмію імя Гагарына. Перад выпускнымі экзаменамі ўсіх лётчыкаў сабралі ў актавай зале. Аказваецца, у акадэміі ёсць традыцыя: калі ў цябе добры стан здароўя, няма хваробаў, то ты можаш (па жаданні) прайсці адбор у атрад касманаўтаў.

Я вырашыў паспрабаваць. Не так, каб ужо надта спадзяваўся... Хутчэй, жартам. Маўляў, калі дзеці спытаюцца: «Тата, а чаму ты не пайшоў у касманаўты?», адкажу: «Спрабаваў, але не атрымалася» (*смяёмся*).

Карацей, да выпуску з акадэміі прайшоў усе этапы медкамісіі і быў прызнаны годным. Мне сказалі, што месяцы праз два-тры могуць выклікаць на яшчэ адну медкамісію — у «Раскосмас». Я пакінуў хатні нумар тэлефона. Пасля паехаў у адпачынак — у Чэрвень. І менавіта сюды мне патэлефанавалі, даслалі тэлеграму, што трэба прыехаць у Маскву. Там я прайшоў яшчэ адну медкамісію.

11 кастрычніка 2006 года адбылося пасяджэнне Галоўнай міжведамаснай камісіі, падчас якога зачыталі загад. Маўляў, Алег Навіцкі залічаны ў атрад касманаўтаў, у аддзяленне агульнай касмічнай падрыхтоўкі. А пасля сказалі, што я магу вяртацца ў часць і служыць далей. Туды павінен прыйсці загад міністра абароны Расіі. Яшчэ амаль паўгода я праслужыў у воінскай эскадрыллі ў Будзёнаўску. А з лютага 2007-га — у атрадзе касманаўтаў, у Зорным.

— Фантастыка! Вось ты расказваеш, а мне не верыцца...

— Ды мне спачатку і самому не верылася. А бацькі і да гэтага часу не дужа вераць. Тое, што лётчык, ім зразумела. А касманаўт, Зорны гарадок — гэта далёка і нерэальна...

— Дык ты можаш паляцець у космас?!

— (*Сціпла.*) Збіраюся і спадзяюся. Толькі вучыцца яшчэ трэба доўга.

— А скачкоў зрабіў шмат? Фотаздымак на «аднакласніках», дзе ты ў вольным палёце, уражвае...

— Скачкоў, здаецца, больш за 150. А здымак — з мінулага года. Так страшна было — словамі не перадаць! У лётчыкаў звычайна скачкі — два разы на год. Каб ведалі, як дзейнічаць, калі давядзецца пакідаць самалёт. А тут... Сёлета да адпачынку — 80 скачкоў за месяц. Але ўжо лягчэй пайшло, чым летась. Спадабалася...

— (Жартам.) Інструктар з верталёта не выпіхваў? Як у анекдоце: «Гатоў? Пайшоў...»

— Ды не, сорамна было б... Тут скачаш сам, за табою — інструктар і аператар з замацава

А на мой погляд...

«У такіх няпростых умовах найперш трэба вучыцца жыць па сродках»

Якія «ахоўныя механізмы» вы задзейнічалі (або не) у сваім жыцці ў сувязі з фінансавым крызісам: перагледзелі сямейны бюджэт, часова адмовіліся ад нейкіх буйных пакупак, знайшлі падпрацоўку і г.д.?

Ніна КУНЦЭВІЧ, пенсіянерка, г. Мінск:

— Нам дапамагае выжываць вёска. Там у нас захавалася бацькоўская хата, пры якой 20 сотак зямлі, ёсць свой міні-трактар. Увесь участак апрацоўваць магчымасці ўжо няма, аднак частку па-ранейшаму мы выкарыстоўваем. Летам абавязкова трымаем жыўнасць. Летась, да прыкладу, гэта былі трусы і качкі, якіх мы гадавалі да восені — для сябе і для дзяцей. Чым не падтрымка для сямейнага бюджэту? Сёлета таксама плануем штосьці купіць, аднак пакуль не ведаем, якімі на тую жыўнасць будуць цэны. Яшчэ — у нас ёсць аўтамабіль — абмежавалі сябе ў колькасці паездак: эканомім на бензіне, тым больш што і трактар патрабуе паліва. Рэчаў, адзення сталі менш набываць. Нам жа, пенсіянерам, ужо на працу, у вышэйшы свет *(смяецца)* не трэба. Есці — ядзім, не скажу, што падціснулі жываты. Унучка вось паступіла, першы год вучыцца платна. Бацькам яе ў гэтым сэнсе выходзіць цяжкавата, трэба дапамагаць.

Аляксандр ЦІШЧАНКА, начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў:

— Думаю, трэба найперш вучыцца жыць па сродках. Магчыма, ад нейкіх пакупак давядзецца адмаўляцца, а тэрміны рэалізацыі некаторых асабістых праектаў запатрабуюць больш часу, чым думалася напачатку. Скажам, я планаваў памяняць машыну, цяпер давядзецца пачакаць. Рамонт будзе доўжыцца, умоўна кажучы, не год, а два-тры гады. Калі раней спланаваць водпуск можна было загадзя, дык сёлета будзем прымаць нейкае рашэнне бліжэй да сезона: ці ехаць у Крым, ці правесці адпачынак на дачы. Выходзіць будзем з узроўню цэнаў, наяўнасці сродкаў на той момант. Падчас крызісу самае, бадай, цяжкае, што ты не можаш нешта дакладна прагназаваць. А ўвогуле ў такія часы выжываюць найперш аптымісты, менавіта яны пракладваюць шляхі да выйсця з сітуацыі.

Іна СЯМЁНАВА, намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:

— Усё, што вы пералічылі, я збіраюся прымяняць у будучым *(смяецца)*. Гэтага я цалкам не выключаю, магчыма, давядзецца зацягваць паясы. Пакуль, балазе, крызіс яшчэ не так моцна адбіўся на мне, маёй сям'і. Хоць ужо цяпер я стала больш ашчадна ставіцца да выдаткаў, імкнуся не рабіць неабдуманых, імпульсіўных пакупак. Нават у краме стала хадзіць радзей, каб не было спакусы за нешта аддаць грошы. У нас свой прыватны дом, ёсць невялікі ўчастак, на якім заўсёды нешта расло, былі невялікія градкі. Не выключаю, што сёлета давядзецца ахвяраваць клумбай-другой, каб замест кветак пасадзіць лішнюю градку якой гародніны.

Кіраўнік адной з арганізацый г. Ашмяны (адказы дадзены на ўмовах ананімнасці):

— Я думаю, што крызіс па-сапраўднаму мы яшчэ не адчулі. Пакуль больш размоў, прагнозаў, хваляванняў. Хоць на некаторых прадпрыемствах, як мы бачым, чуем з навінаў, ужо скарацілі працоўны тыдзень. На планёрках я бачу, як арганізацыі «топяць» адна другую: няма збыту, павялічваюцца даўгі... Калі гаварыць асабіста пра сябе, мяне найбольш хвалююць грашовыя ўклады. Многія пажылыя людзі трымалі іх «на смерць» у беларускіх рублях, хтосьці адкладваў сродкі як дабаўку да будучай пенсіі. Пасля скачка курса долара ў пачатку года ўсе кінуліся пераафармляць укладны, страціўшы на гэтым частку ўласных грошай, або купілі непатрэбную бытавую тэхніку... Цяпер многія трымаюць сродкі ў «панчохах». Таму менавіта ў гэтым сэнсе ў мяне спакою няма.

Віктар ШАМКОЎ, старшыня прафсаюзнага камітэта завода «Керамін»:

— Я сам эканаміст, таму праціўнік таго, каб нейкія лішкі грошай, калі яны ёсць, хутчэй бегчы выдаткоўваць. Зразумела, калі нейкая пакупка планавалася загадзя і ў ёй сапраўды ёсць патрэба, тады ніякіх пытанняў. Але ж не бегчы ўкладваць сродкі ў тэлевізары і халадзільнікі, як было на пачатку года, каб яны потым стаялі нераспакаванымі. Праблема ў тым, што ніхто дакладна не ведае, чым і як павернецца той крызіс. А здарыцца з кожным можа што заўгодна, напрыклад, любы з нас рызыкуе страціць працу. У цяперашняй сусветнай гісторыі дастаткова такіх прыкладаў: у колькіх краінах цяпер назіраецца беспрацоўе? Таму, лічу, трэба рыхтаваць сябе да цяжкасцяў. Па-першае, калі ёсць магчымасць, умацоўваць здароўе, напрыклад, адпачыць, падлячыцца ў якім санаторыі. Па-другое, звярнуць увагу на магчымасць перанавучання, прыгледзець які запасны варыянт з працай. Скажам, цяпер стала нашмат прасцей адкрыць сваю справу, чаму б не звярнуць увагу на варыянт з адкрыццём прадпрымальніцкай дзейнасці? А для гэтага найперш трэба «ўключаць» сваё «шэрае рэчыва», аналізаваць сітуацыю, што склалася, думаць пра магчымыя заняткі, якія б маглі прыносіць даход.

Васіль СМОЛІК, галоўны ўрач Навагрудскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі:

— Я вам адкажу як доктар. Сёння мы часта сталі ківаць на крызіс. А трэба проста працаваць. Будзем працаваць — не будзе і крызісу. Мы бюджэтнікі, аднак на нас усё гэта пакуль асабліва не адбілася, зарплата не зменшылася. Паколькі мы аказваем і платныя паслугі, ёсць нават магчымасць выплачваць людзям прэміі. Вядома ж, я кажу пра рублёвыя выплаты, з улікам новага курса долара панізжэнне зарплаты ёсць. Так, цэны хоць і рухаюцца, аднак не настолькі, каб адчуць гэта вельмі балюча. Магчыма, у поўнай меры тое адбудзецца пазней? Таму, не буду спрачацца, выдаткі ў сям'і крыху скарацілі — з аглядкай на перспектыву.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Антыкрызісная эканоміка

Грошы дае... пустазелле

Пшаніца, жыта, ячмень, авёс, трыцікале, бульба — гэты набор для сельскай гаспадаркі з'яўляецца амаль традыцыйным. Між тым, таксама не сакрэт: каб мець грошы, трэба шукаць новыя напрамкі. Таму нядзіўна, што апошнім часам прадпрыемствы АПК Петрыкаўшчыны пачалі займацца сланечнікам, сояй і цыбуляй. Але ці не самым цікавым праектам у раёне ўсё ж стала вырошчванне... плямістай растаропшы.

Лічыцца, што радзімай гэтай расліны з зялёным і калючым лісцем з белымі плямамі з'яўляецца Паўднёвая Еўропа, сёння растаропша часцяком сустракаецца ў краінах Міжземнамор'я, Сярэдняй Азіі, на Каўказе, ва Украіне, Малдове, у паўднёвай Расіі, Заходняй Сібіры. Прычым цікава: перш-наперш растаропша ўспрымаецца мясцовымі жыхарамі як... пустазелле. Зрэшты, нягледзячы на такі даволі «пікантны статус», яе гаючыя ўласцівасці былі вядомыя здаўна.

Яшчэ старажытныя эскулапы называлі адвар з лісця гэтай расліны цудоўным сродкам ад падагры і слабасці страўніка, адвар з карэння разглядаўся як лепшая дапамога ад болю зубоў, а сок ішоў на лячэнне радыкуліту і болю ў паясніцы. Шматлікія рэцэпты народнай медыцыны раяць прымаць па чайнай лыжцы ў дзень сухога стоўчанага семя растаропшы пры захворваннях печані і ліць адвар з семя пры гепатыце. Ужо ў наш час тое ж семя актыўна выкарыстоўваецца ў якасці натуральных і, што адметна, цалкам бяскодных дабавак у прадукты харчавання для падтрымкі імунітэту. Аднак найбольшую каштоўнасць уяўляе растаропшавы алей. Сучасныя медыкі рэкамендуюць яго пры язвах страўніка і 12-перснай кішкі, стаматыце, парадантыце, фарынгіце, рыніце, экзэмах, нейрадэрмітах.

— Уласна кажучы, саму ідэю вырошчваць растаропшу падказалі летась у абласной асацыяцыі вытворцаў агародніны, — кажа дырэктар КСУП «Чалюшчэвічы» Міхаіл Булыга. — Мы падумалі і вырашылі насамрэч паспрабаваць. Бо ў Беларусі гэтай культурай амаль ніхто не займаецца, а попыт на яе ў фармакалогіі і харчовай прамысловасці зараз вялікі, асабліва ў Расіі.

Для своеасаблівага «эксперыменту» першую партыю насення растаропшы закупілі ў Малдове. Адтуль жа для засвоення тэхналогій вырошчвання запрасілі спецыялістаў-кансультантаў. Дзеля справядлівасці, хутка высветлілася: ніякіх «асаблівых умоў» тут няма, не трэба і вялікіх выдаткаў. Новая культура хоць і любіць лёгкі суглінак, але расце практычна на любой глебе, для пасадкі прыстасавалі простую сеялку агародніны, для ўборкі прыйшоўся дарэчы звычайны камбайн. Што ж да тэрмінаў выспявання, то ён быў невялікі — палескі клімат перашкодай не стаў. Як, да слова, не замінаў і «чарнобыльскі імідж» Гомельшчыны. Петрыкаўскі і Акцябрскі раёны вобласці радыяцыя амаль не закранула, прэцэдэнтаў, калі праверкі паказалі б перавышэнне дапушчальнага ўзроўню, тут не было.

— Важна толькі памятаць некаторыя нюансы, — адзначае Міхаіл Булыга. — Паколькі сама па сабе культура з'яўляецца лекавай, даводзіцца адназначна адмаўляцца ад апрацоўкі ядахімікатамі, зводзіць да мінімуму выкарыстанне мінеральных угнаенняў — стаўка павінна рабіцца на арганіку. А плюс да таго, неабходна быць вельмі ўважлівым, дакладна вызначыць тэрмін уборкі. Спазненне ўсяго на дзень-два можа прывесці да поўнага асыпання каштоўнага семя, страты ўсяго ўраджаю.

Летась гаспадарка адвяла пад растаропшу ўсяго 10 гектараў — збольшага, каб назапасіць насенне на наступны сезон і вывучыць кан'юнктуру рынку. Прычым «тэст» стаўся паспяховым. У гаспадарку звярнулася некалькі беларускіх фірмаў, дзякуючы невялікім паведамленням у інтэрнэце, тэлефанавала шмат расіян — ад Масквы да Новасібірска. Адсюль з'явілася рашэнне: сёлета трэба пераходзіць на прамысловую аснову, павялічыць пасевы да 100 гектараў. Бо гэта — выгадна.

Па-сутнасці, «Чалюшчэвічы» з'яўляюцца гаспадаркай сярэдняй, у ёй працуе 240 чалавек, атрымліваецца не самая высокая зарплата. Аднак тут спадзяюцца, што, не ў апошнюю чаргу дзякуючы растаропшы, сітуацыя можа змяніцца. І ці не галоўны аргумент: сёння адзін гектар новай культуры прыносіць столькі ж грошай, колькі 10 гектараў харчовай пшаніцы. Заўтра?

— Запатрабаванасць семя растаропшы як на беларускім, так і на расійскім рынку значная, да таго ж прадпрыемствы па вытворчасці лекаў і харчавання будуць існаваць заўсёды, — заўважае Міхаіл Булыга. — Нават у крайнім выпадку, калі з-за крызісу ад нашай прадукцыі пачнуць адмаўляцца ў Расіі, мы будзем адчуваць сябе даволі спакойна. Бо калі тэрмін захоўвання тых жа бульбы ці цыбулі абмежаваны некалькімі месяцамі, то семя растаропшы можа праляжаць да лепшых часоў год-два. І пры гэтым без страты сваіх каштоўных якасцяў.

Сяргей ГРЫБ.

Петрыкаўскі раён.

Дапаможам Еўрасаюзу... у барацьбе з шаленствам

З планаваным уводам у чэрвені гэтага года другога пускавога комплексу «Віцебскай бяфабрыкі» ў два разы павялічыцца аб'ём вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў — на суму да 17 мільярдаў рублёў у год. З іх па імпартазамяшчэнні — на суму каля 10 мільярдаў. Сёлета эканомія сродкаў пры закупцы айчынных прэпаратаў за кошт больш нізкіх цэнаў складзе 3,5 мільярда рублёў. Сёння ў краіне зарэгістраваны 1146 ветэрынарных прэпаратаў, з якіх толькі 46,6 працэнта — айчынныя.

— Дарэчы, што датычыцца імпартазамяшчэння, мы гатовы супрацоўнічаць з Еўрасаюзам ў кірунку прафілактыкі шаленства ў прыгранічных зонах, — распавядае дырэктар гэтага прадпрыемства Аркадзь ЮДАСІН. — Прапрацоўваем пытанне заключэння адпаведных пагадненняў. Для гэтага ёсць падстава — сітуацыя з шаленствам дзікіх жывёл выйшла з-пад кантролю. Каб раскідваць спецыяльныя ветэрынарныя сродкі, лепш за ўсё выкарыстоўваць малую авіяцыю.

Нашу прадукцыю добра ведаюць за мяжой — у Турцыі нядаўна зарэгістравалі прэпарат, у Казахстане рэгіструем сем. Працуем з Арменіяй, Азербайджанам, Сірыяй.

Паводле слоў кіраўніка, унікальнасць прадпрыемства ў тым, што пасля завяршэння рэканструкцыі, па сваіх вытворчых здольнасцях яно не будзе мець аналагаў у СНД.

Цікава, што фабрыка становіцца і своеасаблівай альма матар. Тут у студэнтаў ёсць магчымасць праходзіць практыку, займацца даследчай дзейнасцю. Спецыяльна для ветэрынарнай прамысловасці летась у Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны была адкрыта новая спецыяльнасць «Ветэрынарная фармацыя». Рыхтуюць 50 спецыялістаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Віцебскі раён.

ДО́РАГІ ДАРО́ГІ

Дыскусійная трыбуна

Дэпутат Сяргей Сямашка лічыць, што галоўная перашкода на шляху вырашэння праблем беларускіх аўтадарог — фінансавая.

Шматпавярховікі ў спальных раёнах растуць як грыбы пасля дажджу, а паркоўкі за імі зусім не паспяваюць. Цесна, вядома ж, не толькі ў дварах, але і на дарогах. Адсюль забруджанасць, парушэнні, сутыкненні ды канфлікты. І гэта ўжо даўно перастала быць галаўным болем выключна ДАІшнікаў і дарожнікаў. Спецыялісты розных кірункаў заклапочаныя вырашэннем такіх праблем, у пошуках і палітыкі — як адрэгуляваць тыя няпростыя пытанні на заканадаўчым узроўні. У чарговы раз звярнуліся да актуальных праблем і падчас нядаўняга тэматычнага «круглага стала» ў верхняй палаце парламента. А дэпутаты ў першы дзень сесіі прынялі папраўкі ў закон аб дарожным руху. Пра дыскусіі ў гэтай сферы, рознасць падыходаў і тэндэнцыі ў заканадаўстве мы гутарым з **Сяргеем СЯМАШКАМ, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве**.

Прыняты ўжо ў другім чытанні законапраект калісьці пачынаўся з папраўкі, якая выключала з паўнамоцтваў Савета Міністраў прэрагатыву ліміт аваць плату за навучанне ў аўташколах. Гэта дазволіла навучальным установам уздыхнуць лягчэй, зрабіць цэны больш адэкватнымі выдаткам, так-сяк аднавіць парк аўтамабіляў. Аднак пры разглядзе законапраект атрымаў яшчэ шэраг новаўвядзенняў. *«Цяпер заканадаўча рэгулюецца рух шасі па аўтадарозе»*, — падкрэслівае дэпутат. Тут маецца на ўвазе не шасі самалёта, а шасі як асноўная частка аўтамабіля, трактара ці іншага транспартнага сродку — рама, на якой умацоўваюцца кузаў, усе механізмы і дэталі. *«Да прыняцця ўказа кіраўніка дзяржавы і да ўнясення змянення ў закон узнікалі праблемы з тым, выпускаць шасі на дарогу ці не. І калі выпускаць, то якім чынам гэта павінна быць арганізавана. На сёння выразна акрэслена, што шасі можа выязджаць, яго ўдзел у дарожным руху, правы і абавязкі кіроўцы — усё як з транспартным сродкам. Адзінае адрозненне ў тым, што ім выдаюцца часовыя рэгістрацыйныя нумары і яны не праходзяць тэхагляд. Паколькі размова ідзе перш за ўсё пра новыя шасі, якія выпускаюцца на Мінскім аўтамабільным заводзе, Указам вызначаныя таксама адпаведныя дапаўненні ў правілы дарожнага руху»*.

Узнікалі праблемы і з заканчэннем тэрміну пазбаўлення права на кіраванне аўтамабілем. *«Пазбаўлены правоў пры іх вяртанні абавязаны прайсці медыцынскі агляд. Аднак даведка кіроўцы выдаецца тэрмінам на пяць гадоў, і калі, скажам, пазбаўленне было на год, то атрымліваецца, яна ўсё яшчэ сапраўдная. У Дзяржаўтаінспекцыі было мноства праблем. Сёння мы вызначыліся з гэтым у законапраекце. Кіроўца абавязаны прайсці медкамісію не раней за месяц да заканчэння тэрміну пазбаўлення права кіравання транспартным сродкам»*. Улічаны ў законапраекце таксама ўсе нюансы парадку дзяржаўнай рэгістрацыі і тэхаглядаў транспартных сродкаў сілавых структур.

У профільнай камісіі працуюць не толькі над заканадаўствам аб дарожным руху, тут маюць справу з усімі нарматыўнымі прававымі актамі галіны. Таму дэпутаты лічаць магчымым свой удзел у папярэднім абмеркаванні: *«Было б добра, калі б усё ж такі акты кіраўніка дзяржавы, якія рыхтуюцца, нам паказвалі да падпісання. Мы сёння ў камісіі вядзём на дастаткова добрым узроўні ўсё транспартнае заканадаўства і маглі б выказваць часам пэўнае меркаванне па асобных актах. Каб на стадыі ўнясення змяненняў у закон не ўзнікала ніякіх праблем»*.

Шмат якія пытанні ў транспартным заканадаўстве па-ранейшаму застаюцца адкрытымі. *«Калегі з Савета Рэспублікі, напрыклад, прапануюць зноў вярнуцца да асноўнага тэксту закона аб дарожным руху і перагледзець паняццевы апарат, зрабіць тэрміналогію адзінай ва ўсіх нарматыўных прававых актах гэтай галіны. Аднак як гэта зрабіць, калі, паводле правілаў дарожнага руху, «пасажыр» — гэта асоба, якая знаходзіцца ў аўтамабілі, аднак не кіруе ім, а ў законе аб аўтатранспарце і аўтаперавозках пад тым жа паняццем маецца на ўвазе чалавек, які заключыў дагавор на перавозку. Гэта крыху розныя рэчы, і прывесці іх да адной роўніцы не ўяўляецца магчымым»*.

Сяргей Аляксандравіч бачыць сэнс у тым, каб абагульніць практыку прымянення закона аб дарожным руху і аданіць, што варта туды дадаць. *«Закон працуе крыху больш за год, і ўжо нейкая практыка напрацаваная. Трэба паглядзець, чаго там не хапае. Напрыклад, вельмі куртатая глава аб арганізацыі дарожнага руху. Калі рыхтавалі закон, мы не змаглі яе напоўніць. Мы выстройвалі схему закона так: кіроўца — аўтамабіль — пешаход — навакольнае асяроддзе. Трэба было прапісаць патрабаванні да кожнага суб'екта. Напрыклад, аўтамабіль у нас павінен прайсці дзяржаўную рэгістрацыю, тэхагляд, і толькі пасля гэтага ён атрымлівае допуск да ўдзелу ў дарожным руху. Як мы падышлі да вызначэння дарожнага руху? Гэта найперш нейкая яго арганізацыя. Калі б мы не кіравалі ім, гэта быў бы хаос. Навошта мы арганізуем рух? Каб забяспечыць пропускную здольнасць дарог, бяспечныя ўмовы. Дык вось аб самой арганізацыі дарожнага руху мы практычна нічога не ведаем. У законе мы толькі спасылаемся на правілы дарожнага руху, варта было б падумаць, што сюды можна ўключыць»*. На думку дэпутата, у гэтым ключы варта дыскутаваць пра тое, як павялічыць прапускную здольнасць дарог.

«Што сёння перашкаджае аўтамабілістам? Найперш святлафоры і пешаходныя пераходы. Мабыць, нам варта было б гаварыць пра тое, каб адмовіцца ад пешаходных пераходаў, прыняць святлафоры — зрабіць развязкі на розных узроўнях. На захадзе гэта актыўна выкарыстоўваецца. І мы рана ці позна да гэтага прыйдзем, таму што сёння ўсе добра ўсведамляюць, што ў Мінску хутка мы не зможам праехаць па асноўных магістралях». І тармозіць гэты працэс толькі адсутнасць фінансавай падтрымкі. *«Айчынныя спецыялісты ў стане распрацаваць глабальны план вырашэння дарожных праблем. Аднак сёння не ўсё так гладка з фінансамі. У нас распрацаваная неблагая рэканструкцыя праспекта Дзяржынскага (і пешаходных пераходаў не будзе, і святлафораў па мінімуму) — паглядзім, як там будзе арганізаваны дарожны рух. Спадзяюся, што праблемы будуць знятыя»*. Здараецца, заходзіць размова і пра рашэнне, якое наогул не патрабуе грашовых выдаткаў. Проста павяліч хуткасны рэжым — і на дарогах адразу стане больш вольна. Аднак пры такой арганізацыі руху — з бязлітаў святлафораў і пераходаў — адразу ж паўстае рубам пытанне бяспекі. Без затораў, аднак з вялікай рызыкай ДТЗ, якіх у краіне і без таго хапае, — ці вартая аўчынка вырабу?..

Адвечная спрэчка кіроўцы і пешахода не скончыцца, пакуль рух не будзе арганізаваны па-іншаму. А так адзін вінаваціць другога, і кожны ў нечым мае рацыю. Па ўласным вопыце скажу, што самая лепшая школа пешахода... у аўтамабілі! Пакуль за рулём не пасядзіш, супрацьлеглы бок не зразумееш. *«Дарожныя праблемы — не толькі ў саміх дарогах. Яны куды шырэйшыя. Гэта праблема нашай агульнай культуры, якая потым пераносіцца на дарогу. Ці можна казаць пра тое, што чалавек, па жыцці некультурны, сеўшы за руль, стане культурным? Таму на дарозе ўвесь час трэба думаць: а што зробіць мой сусед? Бо нават самы класны кіроўца не можа быць упэўнены, што нехта не парушыць правілы, не ўедзе ў яго машыну. Сам езджу нядаўна, але заўважаю, што ўсё горш і горш на дарогах становіцца. Заторы параджаюць агрэсіўнасць кіроўцаў — усе ж спяшаюцца, хочацца трапіць на месца як мага хутчэй, нехта спрабуе абагнаць іншага, у выніку мы з'язджаемся недзе...»*. Не маглі мы не пацікавіцца, якім аўто кіруе дэпутат: *«Джыпа ў мяне няма,* — смяецца Сяргей Аляксандравіч. — *Прасценькая такая машынка — Opel Vectra. Вялікую машыну мець сёння ў Мінску цяжкавата — праблема і расходу паліва, і паркоўкі. У мяне ўніверсал, дык калі з расходам яшчэ так-сяк — дастаткова эканамічная машына, асабліва на трасе, — то з месцам для стаянкі ёсць праблемы. Не заўсёды пры бакавой паркоўцы са сваёй машынкай я магу змясціцца»*.

Якія змяненні закрануць аўтааматараў у недалёкай будучыні? *«Чакаецца змяненне катэгарыйнасці транспартных сродкаў, каб прывесці ў адпаведнасць з еўрапейскай сістэмай. Мабыць, ужо праз год. Плануецца таксама пасведчанне кіроўцы новага ўзору. Не думаю, што гэта будзе тэмай закона; калі мы рыхтавалі той закон, спасталіся, што гэта прэрагатыва Савета Міністраў. Адзінае, што мы вызначылі, — тэрмін дзеяння пасведчання кіроўцы 10 гадоў»*. Нагадаем, што дагэтуль беларускія кіроўцы атрымлівалі правы адзін раз на ўсё жыццё. Чаму ж вырашылі змяніць гэту традыцыю? *«Не ведаю, наколькі гэта сур'ёзна, аднак прыводзілі прыклад, калі ўнук карыстаўся пасведчаннем кіроўцы дзеда. Ну, а ўвогуле мы ж мяняем пашпарт, змяняемся самі — павінны мяняць і пасведчанне кіроўцы. Першапачаткова прапаноўвалі ўвязаць гэта менавіта з заменай пашпарта (у 25 і 45 гадоў), аднак гэта, відаць, не зусім правільна. Дзесяцігадовы тэрмін уяўляецца найбольш апраўданым. Тым больш, што жыццё не стаіць на месцы — здаецца, толькі выйшлі пасведчанні кіроўцы аднаго ўзору, але я больш чым упэўнены, што далей будуць электронныя дакументы. А можа з цягам часу будзе адзіная ідэнтыфікацыйная картка — і дакумент, які засведчвае асобу, і правы на кіраванне»*. Будзем спадзявацца, што заканадаўства пойдзе ў нагу з узрослым попытам на прыватны транспарт, а разам з імі і ўся належная інфраструктура.

Ала МАЧАЛАВА.

Мы і Еўропа

СВОЙ ЧАЛАВЕК З БРАНДЭНБУРГА

Днямі завяршыўся візіт у нашу краіну прэм'ер-міністра федэральнай зямлі Брандэнбург Маціяса Платцака. Акрамя сустрэч з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім і іншымі афіцыйнымі асобамі, ён знайшоў час выступіць з лекцыяй у Мінскім адукацыйным цэнтры (МАЦ) імя Іаганеса Рау на тэму «Рэгіянальнае супрацоўніцтва ў Еўропе».

Чым больш я слухаў у сінхронным перакладзе гэтага немца, тым больш ён падабаўся мне сваёй натуральнай шчырасцю і адкрытасцю, а не гульнёй у «свайго хлопца», майстэрствам якой з часам авалодваюць многія публічныя палітыкі, каб падабацца электарату, слухачам, суразмоўнікам. Без гэтай здольнасці палітык не палітык, а так сабе, тэхнічная асоба па перадачы інфармацыі.

Выступленне Маціяса Платцака нагадвала сустрэчу з людзьмі свайго кола, да якіх не трэба прыстасоўвацца. Ён сам растлумачыў прычыны такой манеры паводзінаў проста: вырас у былой ГДР, дакладней, у акрузе Патсдам. Там былі савецкія вайсковыя часткі — больш за 30 тысяч вайскоўцаў. Між іншым, дзякуючы іх спагадлівасці, многія немцы карысталіся рускім бензінам, які быў не горшы за мясцовы.

Манера выступлення прэм'ер-міністра падкупляла поўнай адсутнасцю ментарства, якой нярэдка грашаць у нас заходнія палітыкі. Напрыклад, не кожны палітык у малавядомай яму замежнай аўдыторыі з іроніяй падзеліцца вось такім цікавым і трохі з'едлівым назіраннем аб сваіх нямецкіх калегах, суайчынніках-палітолагах. Калі на нейкім публічным мерапрыемстве раптам абвяшчаецца, што ёсць магчымасць наведаць нейкую міжнародную канферэнцыю ў Парыжы, то 80 % прысутных без ваганняў пагаджаюцца ехаць туды. А калі запрашэнне тычыцца краін Усходняй Еўропы, той жа Беларусі ці Славакіі, то тыя ж 80 % прысутных знаходзяць уважлівыя прычыны адмовіцца ад паездкі. Так, на жаль, часта бывае, канстатаваў прамоўца.

Думаецца, гер Платцак ажыўляў сваю вельмі сур'ёзную прамову такімі вось смешнымі назіраннямі з мэтай паказаць прысутным, што тое агульнае мінулае нікуды не падзелася, яно можа і павінна стаць глебай для ўсталявання лепшага разумення паміж людзьмі абедзвюх краін. А перспектывы сёння адкрываюцца шырокія. З прычыны свайго геаграфічнага становішча Германія асуджана на развіццё рэгіянальных сувязяў, бо ў яе сярод іншых еўрапейскіх дзяржаў больш за ўсё суседзяў. Што датычыць зямлі Брандэнбург, то яна спрадвеку мела стасункі з суседнімі народамі. Яе кіраўнік лічыць, што мы павінны лепш ведаць адно аднаго, знаходзіць час для сустрэчаў, (як, напрыклад, у рамках міжнародных дыспутаў, прысвечаных памяці вялікага сябра Беларусі Іаганеса Рау), каб паспрачацца, паглядзець, нарэшце, адно аднаму ў вочы, і хаця б паспрабаваць зразумець і пазіцыю, і погляды, і інтарэсы суседа. Таму гер Платцак тэмай свайго даклада абраў гэту вельмі актуальную сёння рэгіянальную тэму.

На яго думку, сёння еўрапейскай інтэграцыяй варта займацца і па прычынах глабальнага характару. Ужо цяпер важна паспрабаваць зазірнуць у будучыню, скажам, якімі будуць свет і Еўропа праз 10, 20, 30 гадоў? І гэта не рытарычнае пытанне. Бо зараз у свеце ствараюцца тры магутныя рэгіянальныя групоўкі. Першая — Японія, Кітай і Індыя, другая — ЗША, Канада і Мексіка, трэцяя — краіны нашай старой і прыгожай Еўропы. І паміж гэтымі групоўкамі будзе з часам весціся асноўная канкурэнцыя ў свеце. Трэба быць гатовымі да гэтага.

Дарэчы, асноўныя тэзісы прамовы палітыка падтрымалі і паслы. Уладзімір Скварцоў, пасол Беларусі ў Германіі, адзначыў велізарнае значэнне развіцця рэгіянальных сувязяў для паглыблення стасункаў краін у розных сферах, у тым ліку і эканамічнай. Што датычыць апошняй, то яна сёння насычаецца цікавымі канкрэтнымі праектамі, у тым ліку і з федэральнай зямлёй Брандэнбург. Невыпадкова там летась было адкрыта першае ганаровае консульства Беларусі ў ФРГ. Нашу краіну нярэдка называюць мостам паміж Усходам і Захадам. Хацелася б, каб рух па ім быў у два бакі, а адносіны паміж рэгіёнамі Беларусі і Германіі выйшлі на якасна новы ўзровень, сказаў беларускі пасол.

Яшчэ больш аптымістычна гаварыў нямецкі пасол у Мінску Гебхардт Вайс. На яго думку, ёсць візіты, як вяхі, якія прымушаюць нас задумацца аб пройдзеным шляху і новых гарызонтах. Цяперашні візіт прэм'ер-міністра Брандэнбурга адбываецца на прынцыпова новай фазе развіцця Еўропы, якое, на думку пасла, прывядзе Беларусь у праграму Еўрасаюза «Усходняе партнёрства». Гэта ўжо новая якасць узаемадзеяння ЕС з яго еўрапейскімі суседзямі.

Нагадаем, Маціяс Платцак упершыню прыехаў да нас два гады таму. І тады таксама яго «зацягнулі» ў адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау. Вось і зараз у беларускую сталіцу ён прыбыў і для ўдзелу ў чацвёртым міжнародным дыспуце памяці вялікага сябра Беларусі Іаганеса Рау — былога прэм'ер-міністра самай вялікай па колькасці насельніцтва і самай эканамічна развітой зямлі ФРГ Паўночны Рэйн-Вестфалія. З 1999 па 2004 гг. — федэральнага прэзідэнта Германіі. У свой час Рау шмат зрабіў для наладжвання стасункаў маладой беларускай дзяржавы з палітычнымі, дзелавымі коламі ФРГ, яе шматлікімі грамадскімі арганізацыямі.

Сёння яго справу працягвае Маціяс Платцак. І робіць гэта, відаць, удала, бо міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў пасля перамоў у МЗС сказаў, што Маціяс Платцак з'яўляецца даўнім сябрам Беларусі, які шмат працаваў і працуе над развіццём адносінаў паміж нашай краінай і Германіяй, а не толькі зямлёй Брандэнбург.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ БЕЛАРУСКАЙ МЭБЛІ — НА ФОРУМЕ Ў МІНСКУ

Міжнародная выстаўка «Мэблевы форум-2009», якая пройдзе з 14 па 17 красавіка, аб'яднае некалькі самастойных праектаў: «Мінскі мэблевы салон», «Кухня», «Даматэх», «Мэблевыя тэхналогіі», «ОфісКамфорт», паведамілі ў аргкамітэце выстаўкі — выставачным прадпрыемстве «Экспафорум».

Тут будуць прадстаўлены прагрэсіўныя тэхналогіі вырабу, найноўшыя матэрыялы і кампаненты, арыгінальныя канцэпцыі ў дызайне, сучасная мэбля ўсіх стыляў і напрамкаў, убудоўваемая бытавая тэхніка. Выстаўка складаецца з двух сектараў — «Гатовая мэбля» і «Матэрыялы для вытворчасці мэблі». У форуме прымуць удзел больш як 130 кампаній з Беларусі, Расіі, Украіны, Аўстрыі, Кітая, Літвы, Польшчы.

Прадукцыя беларускіх мэблевых кампаній займае 30 працэнтаў мэблевага рынку СНД, дэманструе высокі спажывецкі і экспартны патэнцыял. Запланаваны круглыя сталы і тэматычныя семінары.

Пройдзе прафесійны конкурс сярод прадстаўніц мэблевых кампаній «Мисс мебельная краса-2009» і конкурс спажывецкіх пераваг сярод экспануемых узораў мэблі «Народная марка».

БЕЛТА.

Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

№ лота	1.	2.	3.	4.	5.	6.	7.	8.
наименование объекта	Земельный участок У-302	Земельный участок У-874	Земельный участок У-875	Земельный участок У-1007	Земельный участок 198	Земельный участок У-62К	Земельный участок У-69К	Земельный участок У-83К
местонахождение объекта	м-н «Зарица-1»	м-н «Зарица-3»	м-н «Зарица-3»	м-н «Зарица-3»	м-н «Погораны-Кошевники»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»
площадь земельного участка (га)	0,1294	0,1017	0,1377	0,0985	0,1281	0,1148	0,1140	0,1084
кадастровый номер	440100000001004436	440100000003004134	440100000003004133	440100000003004114	440100000003002960	440100000003004052	440100000003004036	440100000003004066
начальная цена продажи (руб.)	17 000 000	13 700 000	18 500 000	13 300 000	15 500 000	18 700 000	22 000 000	20 900 000
сумма задатка (руб.)	1 700 000	1 370 000	1 850 000	1 330 000	1 550 000	1 870 000	2 200 000	2 090 000
Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона (руб.)	3 606 650	3 551 050	3 728 620	3 190 440	2 494 700	3 509 890	3 509 890	3 509 890

Аукцион проводится с условием: строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения горисполкома о передаче участка в частную собственность.
Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на земельных участках в м-не «Южный-4» отсутствуют.

Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

№ лота	наименование объекта	местонахождение объекта	площадь земельного участка (га)	кадастровый номер	начальная цена продажи (тыс. руб.)	сумма задатка (тыс. руб.)	форма проводимого аукциона	условие продажи объекта	срок аренды участка
1.	Право аренды земельного участка	ул. Карского, 2Б	0,4037	440100000001004285	167 900	16 790	Аукцион с условием	Строительство в течение 2-х лет станции технического обслуживания автомобилей с мойкой и магазином сопутствующих товаров*	25 лет
2.	Право аренды земельного участка	ул. Белые Росы

ЗАСТАВАЦЦА РОЗНЫМІ І РАЗУМЕЦЬ АДЗІН АДНАГО

У Мінску адбылася прэзентацыя новага грамадскага аб'яднання ў нашай краіне «Дыялог Еўразія»

Міжнародная арганізацыя «Платформа Дыялог Еўразія» («DA») існуе ўжо больш за 10 гадоў і налічвае 12 краін-удзельніц. Беларусь цяпер мае падставы далучыцца да Платформы. Пра тое, што гэта за арганізацыя, навошта яна патрэбна нам і свету, мы распыталі віноўнікаў і гасцей урачыстасці.

Іхсан ДЗІЛЕКЧЫ.

Іхсан ДЗІЛЕКЧЫ, генеральны дырэктар Адукацыйна-культурнай установы «Достлук» і адзін з арганізатараў аб'яднання «DA» ў Беларусі:

— Абрэвіятура «Дыялог Еўразія» з турэцкай мовы выглядае як «DA» — Diyalog Avrasya. Для рускай мовы гэта вельмі ўдалае спалучэнне літар, якое азначае згоду. DA — дыялогу, DA — цярплівасці, DA — міру, DA — узаемаразуменню. У маі 2000 года, падчас Міжнароднага форуму пісьменніцкіх і журналісцкіх арганізацый Еўразіі, было прынята рашэнне аб стварэнні міжнароднай, няўрадавай, добраахвотнай арганізацыі «Платформа Дыялог Еўразія». Мэта — распаўсюджванне ідэі дыялогу і талерантнасці паміж народамі Еўразіі і ўсяго свету, садзейнічанне ўмацаванню міру і ўзаемаразумення на Зямлі, прапаганда інтэлектуальнага і культурнага патэнцыялу і культурнай спадчыны Еўразіі.

Штаб-кватэра Платформы знаходзіцца ў Стамбуле. «Дыялог Еўразія» аб'ядноўвае вакол сябе інтэлектуальныя сілы еўразійскага рэгіёна для таго, каб разам знаходзіць рашэнне агульных праблем, каб краіны, якія размешчаны ў гэтым рэгіёне, лепш ведалі адна адну. Еўразія — вельмі важны рэгіён для сусветнай цывілізацыі, і калі яго інтэлектуальныя сілы аб'яднаць, то ў справе захавання міру можна дасягнуць значных вынікаў. Гэта асабліва актуальна ў нашы дні, у эпоху глабалізацыі і ў час, калі прагназуецца сутыкненне цывілізацый.

Платформа «Дыялог Еўразія» — гэта супрацьпастаўленне вынікам канцэпцыі Ханцінгтона. У арганізацыю ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх інтэлектуальных колаў розных краін: вучоныя, журналісты, пісьменнікі, людзі мастацтва, грамадскія дзеячы. Гэта вельмі аўтарытэтная арганізацыя, якую падтрымліваюць урады краін-удзельніц. На сёння гэта: Азербайджан, Грузія, Казахстан, Кыргызстан, Узбекістан, Малдова, Румынія, Расійская Федэрацыя, Таджыкістан, Туркменістан, Турцыя і Украіна. Кітай і Індыя пакуль з'яўляюцца назіральнікамі Платформы.

За 10 гадоў Платформа правяла шмат міжнародных канферэнцый. Яны былі прысвечаны супрацьдзеянню тэрарызму, захаванню культурнай спадчыны, міжрэлігійнаму дыялогу. Штогод у турэцкім горадзе Урфа, дзе, паводле падання, нарадзіўся прарок Аўраам, які лічыцца айцом трох рэлігій, адбываюцца пасяджэнні «Дыялогу Еўразія». Акрамя таго, два разы на год сустракаюцца старшыні камітэтаў, якія ўваходзяць у Платформу. На апошняй сустрэчы, якая адбылася ў лістападзе мінулага года, Беларусь прысутнічала ў якасці назіральніка. Тады было прынята рашэнне кожнаму камітэту звярнуць увагу на школьныя падручнікі па гісторыі з тым, каб папярэдзіць узнікненне варожасці ў дзяцей да прадстаўнікоў іншых народаў. Прыклад падаў турэцкі міністр адукацыі, які падарыў свайму расійскаму калегу цэлую брашуру з выкінутых цытат з турэцкага падручніка. Усе гэтыя цытаты датычыліся Расіі і былі, мякка кажучы, не з ліку прыемных.

Ідэйным натхняльнікам «Дыялогу Еўразія» стаў вельмі аўтарытэтны турэцкі грамадскі дзеяч, філосаф і пісьменнік Фетхулах Гюлен. У Турцыі існуе так званы «рух Гюлена» — гэта не нейкая асобная арганізацыя, а сумесныя намаганні розных людзей, якія прапагандуюць ідэі талерантнасці, высокай маралі і ўзаемадзеяння ў імя дабра.

Анатоль РУБАНАЎ, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар сацыялагічных навук, прафесар:

— Цяпер мы развіваем супрацоўніцтва перш за ўсё з ВНУ Турэцкай Рэспублікі, нашы студэнты вывучаюць турэцкую мову і праходзяць стажыроўкі ў турэцкіх універсітэтах, турэцкія студэнты навучаюцца ў нас. Стварэнне «DA» ў Беларусі дасць новы сур'ёзны імпульс для нашага інтэлектуальнага, адукацыйнага, навуковага супрацоўніцтва.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— Я думаю, будзе правільна, калі найбольшая колькасць жыхароў нашай краіны ўвойдзе ў склад гэтага руху і возьме ў ім актыўны ўдзел. А што рабіць — зразумела. І працы вельмі шмат. Паміж любымі краінамі ўзнікае непаразуменне. Вось дапамагчы пазбегнуць гэтых непаразуменняў, своечасова патлумачыць тое ці іншае становішча, і ў той жа час заклікаць не крыўдзіць, не абражаць, а заклікаць да дыялогу. У нашай краіне ствараецца Савет па маралі, куды будуць уваходзіць прадстаўнікі ўсіх веравызнанняў, інтэлектуалы і г.д. Я думаю, што Савет хутка знойдзе ўзаемапаразуменне і з «Платформай Дыялог Еўразія», таму што ідэі і думкі аднолькавыя. Вельмі важна, каб у Платформе бралі ўдзел людзі з колаў бізнэсу, фінансавых інстытутаў, каб яны таксама думалі, якім чынам дапамагчы людзям. Тым жа інвалідам, дзецям-сіротам і вельмі бедным сем'ям. Можна прывітаць стварэнне «Дыялогу Еўразія» ў Беларусі.

Сяргей ТРАХІМЁНАК, член Саюза пісьменнікаў Беларусі:

— Нарэшце Беларусь змагла перайсці са статусу назіральніка за рухам у статус удзельніка. Для гэтага ў нас ёсць усе падставы і не толькі арганізацыйныя, але больш глыбокія — традыцыі высокай талерантнасці ў Беларусі. Гэта цярплівасць да іншаверцаў, цярплівасць да людзей з іншым ладам жыцця. У Беларусі прысутнічае 25 канфесій, акрамя хрысціянскіх, яшчэ іудаізм, ісламізм... Гэта першая падстава да таго, што Беларусь павінна больш актыўна ўдзельнічаць у «Платформе Дыялог Еўразія».

Таццяна ДАСАЕВА, загадчыца кафедры міжнароднай журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прафесар:

— Для беларусаў такая арганізацыя вельмі арганічная. Вельмі добра, што Беларусь далучылася да руху «DA». Ад гэтага будзе шмат плёну. На мой погляд ні адзін сучасны разумны чалавек, які цвяроза мысліць, не хоча нікому зла. Ні ў межах сям'і, ні ў межах краіны, ні ў межах Сусвету. Злосць нічога не нараджае, яна толькі разбурае. Я перакананася, чым больш чалавек далучаецца да іншых культур, праз веды, праз навуку, тым багацейшым ён становіцца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Настасся ЗАНЬКО. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ШЧУПАКІ ВАЛЯЛІСЯ?

На беразе вадасховішча «Лактышы» Ганцавіцкага раёна супрацоўнікі дзяржінспекцыі затрымалі браканьера з в. Мельнікі з двума шчупакамі на два кілаграмы кожны. Мужчына заявіў, што рыбу ён знайшоў каля вады.

Ці праўда гэта — высветліць суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Сямейная пара адкрыла ў Мінску беларускамоўную групу ў садку

Моўнае пытанне

...Хоць за гэта давялося змагацца 7 месяцаў

Дар'я КАТКОЎСКАЯ і Ігар КРЭБС вырашылі выхоўваць свайго Алеся на беларускай мове, пачынаючы з самага малога ўзросту. А для гэтага, перш-наперш, трэба было ўладкавацца ў беларускамоўную групу аднаго з дзіцячых садкоў у мікрараёне Сухарава (менавіта там жывуць нашы героі). Аднак выявілася, што гэта не такая ўжо і лёгкая справа — вучыцца па-беларуску...

Першы крок Дар'я з Ігарам зрабілі ўжо тады, калі іхняму хлопчыку не было і пяці месяцаў: трэба было стаць на ўлік у райвыканкаме, каб у будучым, праз два гады, мець прывілеяванае становішча да тых, хто гэтага зрабіць не паспеў, — а пасля, лічыце, любы дзіцячы садок раёна ў вас у кішэні. Здавалася б, якая розніца ў тым, якую навучальную ўстанову выбраць, але нават на такім узроўні існуюць своеасаблівыя рангі: ці то ў адным лепшыя выхавацелі, ці то ў іншым — навейшая адукацыйная база і больш выгаднае месцазнаходжанне і г.д.

Калі ж Алесю да паўнацэннага навучэння заставаўся толькі адзін год, маладыя бацькі вырашылі ўзяцца за справу. Накіраваліся адразу ва Упраўленне адукацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска, спадзеючыся на атрыманне падрабязнай інфармацыі і на хуткае развязванне пытання. Аднак Дар'я, прафесійны юрыст, адразу заўважыла шэраг недакладнасцяў у пісьмовых адказах:

— Наколькі я зразумела з лістоў, спецыфіка групы вызначаецца не загадчыцай дзіцячага садка, а загадам Упраўлення адукацыі, — дзеліцца ўражаннямі Дар'я. — Але гэта, у прынцыпе, нідзе не прапісана: на падставе якіх дакументаў яны дзейнічаюць, якая гэта працэдура. Гэтага я ад іх дабіцца так і не змагла. Калі ж пачала ў нашых базах шукаць нейкія законы, то, акрамя самых агульных, на падставе якіх мы і перапісваліся, ніякіх іншых знайсці так і не змагла...

Так, у адказах Фрунзенскага ўпраўлення адукацыі значылася, што бацькі маюць магчымасць аддаць Алеся ў дашкольную ўстанову № 534 ці № 200. Але калі па месцы жыхарства, у Сухарава, прапаноўваўся садок з узростам 5-6 гадоў, дык іншы ўвогуле размешчаны па вуліцы Матусевіча — а гэта некалькі кіламетраў ад дому. Вядома, што такія штодзённыя вандроўкі не маглі задаволіць Ігара з Дар'яй, а таму яны вырашылі, няхай і самастойнымі сродкамі, але ж стварыць беларускамоўную групу ў адным з сухараўскіх дзіцячых садкоў.

Каб назбіраць групу з колькасцю ахвотных ад 12 да 25, трэба было правесці кампанію. Так, Ігар раздрукоўваў візіткі і ўлёткі з інфармацыяй пра стварэнне такой групы і кантактнымі тэлефонам для таго, каб раздаваць іх выпадковым мінакам ля дзіцячых садкоў раёна, а таксама раскідваць па скрынях у пад'ездах; зрабіў аб'яву ў мясцовай рэкламнай газеце ды расклейваў невялічкія аб'яўкі на інфармацыйных стэндах. Дар'я ж, у сваю чаргу, заклікала іншых бацькоў праз інтэрнэт-сетку: розныя інфармацыйныя сайты і блогі. Варта сказаць, што ўсе гэтыя тысячы і тысячы ўлётак былі надрукаваныя за свой кошт...

— Як вынік гэтай рэкламнай кампаніі, мы назбіралі больш за 50 ахвотных за некалькі дзён. Праўда, у выніку большасць з іх адсеівалася па розных прычынах: хто па ўзросце не падыходзіў, хто жыў у зусім іншым раёне, — распавядае Ігар. — Але ні часу не шкада, ні грошай, бо акрамя асноўнага выніку, мне здаецца, гэта было і моцнае інфармаванне насельніцтва ўвогуле ў беларускамоўнай галіне. Такім чынам, людзі ўжо больш не рабілі круглыя вочы, як чулі словазлучэнне «беларускамоўнае навучанне», а, наадварот, хацелі далучыцца да гэтага...

Як кажуць нашы героі, быў нават адзін смешны выпадак, калі патэлефанавала жанчына, якая мела сына-трэцякласніка, і папрасіла знайсці яму рэпетытара па беларускай мове, бо ён, маўляў, не ведаў яе ўвогуле.

Варта сказаць, што Дар'я і Ігар адразу адмовіліся ад дапамогі палітычных партый, што адразу з'явіліся на «дапамогу». Так, адзін з лідараў такой партыі, пасля таго, як бацькі папрасілі дапамагчы, але не ўзгадваць у сваіх палітычных мэтах тое, што гэтая партыя адкрыла беларускамоўную групу, больш не з'яўляўся і не прапаноўваў ніякай дапамогі. І добра, бо палітычная афарбоўка такой справы аніводнаму з бацькоў патрэбная не была...

І ўсё здаецца, вырашана: Алесь пойдзе ў беларускамоўны садок, але... Але, калі бацькі прыйшлі да загадчыцы другім разам, яна сказала, што не збіраецца стварацьніякай групы, пакуль не атрымае дакументаў, на падставе якіх яна павінна стварыць яе. На што бацькі адказалі, што гэтае рашэнне прымаецца ў красавіку 2009 года, а таму зараз яны нічога з Упраўлення адукацыі прынесці не могуць. Тады загадчыца да таго моманту наадрэз адмовілася размаўляць з бацькамі. Гэта Ігара і Дар'ю вельмі напалохала, давялося яшчэ раз ліставаць у Фрунзенскае ўпраўленне адукацыі і г. Мінска нават звярнуцца па дапамогу ў гарадскі камітэт па адукацыі. Цяпер, здаецца, усё ўжо зроблена, і ў дзіцячым садку № 570 павінна з верасня наступнага года адчыніцца беларускамоўная група, наведвальнікамі якой будуць 21 хлопчык і дзяўчынка, якіх назбіралі нашы героі. Усяго на гэтую справу бацькам спатрэбілася больш за 7 месяцаў...

— Гэта было цяжка — проста надзвычай цяжка! Чаму, калі б мы вырашылі адукоўваць нашага сына на рускай мове, дык нам спатрэбілася б усяго адна гадзіна нашага жыцця? — абураюцца бацькі. — Чаму, у гэтым жа выпадку, мы маглі б прайсці праз вуліцу і выбраць любы садок Сухарава, а цяпер ледзь не павінны былі б ездзіць праз усю Кунцаўшчыну? Гэта не зразумела! У нас у краіне дзейнічае закон аб раўнапраўі дзвюх дзяржаўных моваў і права выбіраць мову навучання свайго дзіцяці, але чаму тады так шмат бар'ераў было на нашым шляху?...

Чаму б не ўключыць у заявы на паступленне ў дзіцячыя садкі пытанне аб пажаданай мове навучання з тым, каб ва ўсіх былі роўныя магчымасці і веды? Бо, насамрэч, ёсць шмат людзей, якім усё адно, на якой мове навучаць іхняе дзіця; гэтаксама шмат і тых, хто хацеў бы даць сваім нашчадкам беларускую мову, але не ведае, як гэта зрабіць. Над гэтым варта падумаць...

Афіцыйна

Загадчыца дашкольнай установы № 570 Людміла ЖУКАВЕЦ адказала, што, сапраўды, у наступным годзе павінна ўзнікнуць група з беларускамоўным навучаннем, але дакладна адказаць на гэтае пытанне не можа. А таму параіла звярнуцца па інфармацыю непасрэдна ва Упраўленне адукацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска. **Тамара АЛЯШКОВІЧ, вядучы спецыяліст па дзіцячых дашкольных установах**, згадзілася адказаць на нашы пытанні:

— Ці сапраўды ў дзіцячым садку № 570 будзе адкрытая беларускамоўная група?

— Так, насамрэч! Мы сабралі ахвотных (18 чалавек) і, калі яны не адмовяцца на нашай сустрэчы з імі 14 красавіка, то пытанне аб адкрыцці гэтай групы будзе цалкам вырашанае на карысць бацькоў.

— Якім чынам увогуле адкрываюцца беларускамоўныя групы?

— Па жаданні бацькоў, найперш! А потым мы ўжо глядзім, дзе ў нас ёсць магчымасці для стварэння такой групы, дзе ў нас ёсць кадры. А ўвогуле, калі бацькі падаюць заяву на паступленне, яны пазначаюць, што хацелі б, каб іх дзіця трапіла ў беларускамоўную групу — мы ж, вядома, стараемся размяркоўваць іх па месцы жыхарства.

— Такім чынам, калі бацькі прыходзяць з заявай, вы ім паведамляеце, што ёсць магчымасць беларускамоўнага навучання?

— Ну, мы, у прынцыпе, іх так не апытваем: яны самі кажуць, што хочуць у групу такога кшталту. Мы іх пазначаем, лічым колькасць. Часта самі бацькі нам дапамагаюць. А ўвогуле, у кожным мікрараёне ўжо ёсць дзейныя беларускамоўныя групы з досведам працы, а таму нейкай такой неабходнасці адкрываць новыя ў нас пакуль няма. Але, калі людзі хочуць, чаму б не!

— Такім чынам, калі чалавек не мае акрэсленага жадання наконт пэўнай мовы навучання, ён, па ўмаўчанні, накіроўваецца ў рускамоўную групу?

— Так!.. Перад нашым кабінетам ёсць стэнд, дзе напісаныя ўсе дзіцячыя садкі, дзе прадугледжаныя беларускамоўныя групы. Такім чынам, бацькі, калі заходзяць да нас, ужо ведаюць сітуацыю і робяць свой выбар.

Май на ўвазе!

Парады ад Дар'і і Ігара для бацькоў, якія таксама вырашылі навучаць сваё дзіця ў дашкольным узросце па-беларуску:

— Адразу для поўнага высвятлення сітуацыі ідзіце ў ваша раённае Упраўленне адукацыі каб атрымаць ПІСЬМОВЫ адказ, бо толькі пісьмовы адказ з'яўляецца абгрунтаваным доказам.

— Нават, калі вы даведаліся, што ў садку № XXX ёсць адпаведныя групы, лепш пазваніце туды і ўпэўніцеся, ці сапраўды там існуюць такія групы, ці будуць яны ў наступным годзе. Гэтаксама запытайцеся, ці можна ваша дзіця аддаць менавіта туды.

— Пажадана ўвайсці ў кантакт з бацькамі, дзеці якіх наведваюць вамі выбраны садок, каб атрымаць інфармацыю, ці сапраўды ў гэтым садку ўся адукацыйная сістэма беларускамоўная, бо часам бывае, што заняткі праводзяцца па-беларуску, а ў штодзённым жыцці чуецца амаль выключна руская мова.

Мікола ТАМАШЭВІЧ. Фота аўтара.

ТЕХНОБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 апреля 2009 г.

Наименование банка **ОАО «ТЕХНОБАНК»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	3 976,9	6 377,8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	16 736,4	4 508,7
4	Ценные бумаги:	1103		4 986,7	4 312,8
	для торговли	11031	3	4 963,5	4 293,8
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	0,0	0,0
	в наличии для продажи	11033	3.2	23,2	19,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	9 760,7	12 588,7
6	Кредиты клиентам	1106	5	133 797,2	137 660,5
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	47,9	47,9
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	35 977,7	10 157,4
9	Прочие активы	1109	8	30 021,5	45 989,2
10	ИТОГО активы	110		235 305,0	221 643,0
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	37 196,2	0,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	44 792,8	52 623,2
14	Средства клиентов	1206	11	78 691,2	95 099,8
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		13 406,3	156,6
16	Прочие обязательства	1209	12	21 430,0	37 738,0
17	ВСЕГО обязательства	120		195 516,5	185 617,6
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	19 985,3	19 985,3
20	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213		9 049,2	5 249,3
22	Накопленная прибыль	1214	14	3 198,2	5 056,8
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	7 555,8	5 734,0
24	ВСЕГО капитал	121		39 788,5	36 025,4
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		235 305,0	221 643,0
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	67 227,1	96 769,6
28	Обязательства	1302	17	35 847,2	58 142,8

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 г.

Наименование банка **ОАО «ТЕХНОБАНК»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		3 309,0	2 351,9
2	Процентные расходы	2012		4 131,3	2 150,6
3	Чистые процентные доходы	201	18	-822,3	201,3
4	Комиссионные доходы	2021		2 225,7	1 677,2
5	Комиссионные расходы	2022		449,2	360,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	1 776,5	1 316,6
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	2 856,8	2 382,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	-1,7	-1,2
9	Доход в форме дивидендов	205		0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	-98,1	494,7
11	Прочие доходы	207	23	83,3	12,0
12	Операционные расходы	208	24	3 126,4	2 456,1
13	Прочие расходы	209	25	251,5	182,8
14	Налог на прибыль	210		108,7	134,2
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		504,1	643,4

Руководитель **Д.Л. Михалевич**

Главный бухгалтер **Н.Л. Борсук**

Дата подписания 10.04.2009 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г. УНП 100706562.

Лес. Дрэваапрацоўка. Мэбля

З удзелам расійскіх партнёраў

Сёння, 14 красавіка, у Мінску адкрываецца 10-я міжнародная спецыялізаваная выстава «Лесдрэўтэх-2009», адной з адметнасцяў якой стане актыўны ўдзел у ёй замежных кампаній, асабліва з Расіі.

У прыватнасці, свае найноўшыя распрацоўкі тэхнікі для лясной гаспадаркі прадэманструюць расійскія кампаніі — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Пад'ёмныя машыны» і акцыянернае таварыства «ЧЭТРА — Прамысловыя машыны». А ў дзелавой праграме выставы возьме ўдзел дэлегацыя адміністрацыі і дзелавых колаў Валагодскай вобласці. На прыкладзе Расіі будуць разглядацца пытанні стварэння прывабнага інвестыцыйнага клімату ў рамках міжнароднага семінара «Інвестыцыі ў лясную галіну Беларусі».

Барыс ЗАЛЕСКІ.

ФИРМА «WILPO» ПРЕДЛАГАЕТ ВЫСОКОГО КАЧЕСТВА СИСТЕМЫ УВЛАЖНЕНИЯ ВОЗДУХА В ЗАЛАХ, СКЛАДАХ И ДРУГИХ ПОМЕЩЕНИЯХ

Основное направление деятельности нашей фирмы это:

- проектирование, технический консалтинг в области систем увлажнения воздуха в залах, складах и других помещениях;
- поставка систем увлажнения воздуха;
- монтаж и пуск системы;
- гарантийный и послегарантийный сервис.

В нашем предложении — современные системы высокого давления.

Наше оборудование уже работает в Бресте на ИП «Черный, Красный, Белый».

Наши координаты:
Polska/Польша, Bytom, «WILPO», тел. +48 32 388 21 01, факс +48 32 388 21 02
www.wilpo.biz.pl **e-mail:** *biuro@wilpo.biz.pl*
Говорим по-русски: **тел. +48 32 395 45 13, моб. +48 667 273 394**
NIP: 6452283169

ДОБРЫ ДЗЕНЬ

Чысцюткая праўда — неяк раз кампанія з трох чалавек: генерал-маёр марской авіяцыі Андрэй Паўлавіч Буняк з сынам Яўгенам (тады — лейтэнантам марской пяхоты) і яго сябрам Валерам вырашылі адпачыць на адным з астравоў непадалёк ад Піцера. Бліжэй да вечара дабраліся туды, паставілі намёты, донкі і кружкі для лоўлі рыбы, адкаркавалі бутэльку «Беловежской»...

Раніцай кожны заняўся сваім: генерал рыхтаваў вуды, хлопцы чысцілі рыбу, а сарока ва ўсю дражніла іхняга паляўнічага сабаку — то спускалася перад ім на зямлю, скакала перад самым носам, то ўзлятала ўверх.

Паступова стала прыпякаць. Валера падышоў да стала, каб узяць там акуляры (палажыў! Дакладна помніў!), але яны (такія дэфіцытныя тады «хамелеоны»), як скрозь зямлю праваліліся!

— Не перажывай, сынок, гэта ж драбяза, — стаў супакойваць хлопца генерал. — У мяне тут летась куды больш каштоўная рэч прапала — сямейная рэліквія, можна сказаць: кішэнны гадзіннік, які мне цесць падарыў... А акуляры мы новыя купім.

— Ага, купім, — запярэчыў Валера. — Зарплата ж у мяне не ваша. Ды і як цяперака быць? Яны ж з дыёптрыямі, а я блізарукі і без іх, як без рук!..

Пакуль яны разважалі, Яўген думаў — думаў, куды маглі дзецца тыя акуляры? Няўжо сарока пастаралася? Трэба высачыць.

Для прынады марскі пехацінец дастаў з заплечніка павелічальнае шкло, паклаў на столік. Усе адышліся, затаіліся, падрыхтаваліся чакаць, што будзе далей. Часу на гэта патрацілі няшмат — хвілін праз пятнаццаць крылатая госця спусцілася на зямлю. Бачком, асцярожненька, падкралася да стала, узляцела на яго, схапіла ў дзюбу шкло і скіравала ў бок далёкай будыніны.

Доўга не разважаючы, Жэня кінуўся следам, хоць гэта і нялёгка было — асабліва на подступах, бо вакол былога імшаніка (уцепленага памяшкання для зімоўкі пчол) усё пазарастала — крапівой, нейкім быллём у рост чалавека... Але хлопец на гэта рашыў не зважаць — схаваў кісці рук у рукавы штармоўкі, стаў прабірацца да будыніны. Дзе ж гняздо? Відаць, на гарышчы. Па гнілаватай драбіне асцярожна падняўся туды. І аж прысвіснуў ад здзіўлення: па-першае ўразіла само сарочына жытло, а па-другое... У ім цэлы склад быў: сярэбраны партсігар, дзве лыжкі, пудраніца, расчоска, бранзалет, блескучыя гузікі, напарстак... Ды што там — нават устаўная сківіца з металічнымі зубамі!

Там жа, у сарочым складзе, як і трэба было чакаць, аказаліся акуляры «хамелеон» і... бліскучы сярэбраны гадзіннік на ланцужку. Жэня адразу пазнаў яго, бо дзедаўскі, адміральскі, з гравіроўкай.

Рабуй нарабаванае: частку скарбаў лейтэнант марской пяхоты, не пытаючыся дазволу ў белабокай гаспадыні, прынёс на востраў.

Карацей, шчаслівымі ў гэты дзень былі ўсе — нават сабака, бо яго крыўдзіцелька была пакаранай.

Уладзімір Шулякоўскі.

г. Мінск

БЕЗ ДЗЕДА

Кожную нядзельку (гэта ўжо за правіла) я ўстаю на досвітку, пыню гаспадарку, потым хапаю свае вандзэлкі і еду на базар, каб штокольвечы там прадаць: слоік-другі малака, смятаны, тваражку... Торг у розныя дні ідзе па-рознаму.

У той — вельмі дрэнна, бо дужа ж парыла, недзе за 30 паказвала. У мяне галава ад спёкі — як збан гудзела, ногі балелі. А тут яшчэ і купіць нешта трэба было. Пакуль крамы аббегала, — ледзь аўтобус не ўцёк, я ў апошнюю хвіліну ўвалілася. Але ж бачу — месца вольнае ёсць, побач з кабінай. «Во, — думаю, — як добранька, па дарозе хоць адпачну». Уселася, твар выціраю, аўтобус крануўся ўжо... Чую — нехта крычыць: «Стой!» і па кузаве ляпае. Кіроўца спыніўся, дзверы адчыніў. Бабуля ў салон падымаецца. З клункамі. «Вось, — думаю, — я і пасядзела». Давай уставаць, саступаючы месца. А тая — ні ў якую. Кажа:

— Ты, ўнучачка, сама сядзі. Бач, які ў цябе твар — чырвоны. Мусіць, ціск падскочыў? А я, дзетка, пастаю. 83 гадкі маю, але, дзякуй Богу, здаровая.

— Ну вы скажаце! — зашумелі пасажыры. — Ды не можа быць?!

— А вось і можа! — не здаецца бабуля. — Анічогачкі мне не баліць!

— І што — не балела?

— Ну, чаму? Зрэдчас здаралася... Але ж я тады трошкі паляжу, парашок які выпʼю і далей працаваць...

Пасажыры ад здзіўлення аж змоўклі.

— А дзеці ж ці здаровыя? — папікаіўся нехта праз хвіліну-другую.

— Не, людцы, — уздыхнула бабка, — не па мне пайшлі: гнілыя, хварэюць. Дачка на інваліднасці ўжо. І сын пад нажом быў...

— Ну, а дзед ваш, мужык?

— А няма ў мяне дзеда. І не было. Двое дзетак сама прыстаралася, сама выгадавала. Нахалеру ён?

— Во!.. Вось таму вы, бабуля, і здаровая, што няма, што ніхто вам вантробы не еў! — прызналі жанчыны спадарожніцы і аж зайшліся ад рогату...

Мяне ж здзівіла тое, што разам з намі смяяліся і мужчыны.

Над чым? Не ведаю. Можа, над сабой?

А. Скарабагатая.

Стаўбцоўскі раён

ТАЛІСМАН

Чаго толькі цяпер няма на сталічных вуліцах! А некалі, помню, што ні машына, — з'ява, лічы: сярод нашых паўтарачак і ЗіСаў амерыканскія «студабекеры», канадскія «макі»...

У апошніх, дарэчы, унушальных памераў рашотка спераду была, быццам рыклівы звер за ёю хаваўся...

А я тады працаваў на дрэваапрацоўчым заводзе, і паслалі нас неяк на Лагойшчыну па драўніну-сыравіну. Мы нарыхтавалі, «МАК» той падпоўз. Узяліся грузіць, кіроўца — адпаведна — камандаваць, што ды як. А адзін з нашых жартаўнікоў недзе каровін чэрап адкапаў і неўпрыкмет прычапіў — спераду машыны, на тую рашотку.

Што далей было, кіроўца кожны раз расказваў па-новаму. У бальшыні так:

— Еду я, значыць, у горад. Гляджу — усе сустрэчныя мне фарамі блісь ды блісь. Ага, думаю, недзе, мусіць, даішнікі схаваліся. На ўсякі выпадак хуткасць скінуў — ужо паўзу. І нічога не разумею — нідзе нікога не відаць, а сустрэчныя «міргаюць» і «міргаюць». І лыбяцца. А чаго?.. Толькі ў Мінску ўжо спыніў мяне даішнік. Пытаецца, што гэта ў цябе за талісман такі спераду вісіць?.. Зірнуў я — за галаву хапіўся!.. Але ж не бывае таго дрэнна, каб на добрае не выйшла. Убачыў мой «упрыгожаны» «мак» нехта з кіраўнікоў нашага аўтазавода, і яму сама ідэя спадабалася. З той пары на нашых МАЗах эмблема з'явілася — зубр.

...Цалкам магчыма, што ў гэтай эмблемы іншая гісторыя. Але ж гэта таксама мае права быць.

Ілля Шахрай.

г. Мінск

НАСІ СВАЁ!

У маёй сяброўкі нядаўна юбілей быў — 15 гадоў, як замужам. Сабралася яе сям'я, нашу запрасілі, разам павячэралі. Потым дзеці да камп'ютара пайшлі, мужыкі — да тэлевізара, а мы, як вядома, на кухню — посуд мыць, «размовы размаўляць». «З аднаго боку паглядзець, — мыючы, кажа Наташа, — дык я і шчаслівая: дзеці харошыя, мужык не п'е, новая кватэра. А як з іншага...»

Што з іншага — гэта сумная гісторыя, хоць для некага, можа, і смешная.

Тады нам было па 19-20 гадоў, мы жылі ў студэнцкім інтэрнаце. Вядома ж, хадзілі на дыскатэкі, на спатканні, на танцы, мелі нейкіх паклоннікаў, але яшчэ не сур'ёзных.

Добра помню той дзень, калі з'явіўся першы сур'ёзны. Наташка мая ўляцела ў пакой, як на крылах і з парога закрычала: «Я сустрэла яго! Я сустрэла!...». «Каго?» — сталі дапытвацца мы. «Ды хлопца сваёй мары! Яго завуць Валянцін. Ён працуе на трактарным... Мы дамовіліся сустрэцца, у кіно схадзіць — заўтра, у суботу, у пяць гадзін вечара».

Напярэдадні, ці не з 5 раніцы — яна ўжо і сама не спала, і нам не давала. Схадзіла ў душ, накруціла валасы, стала ў чарговы раз перабіраць свой гардэроб, думаць, што апрануць, бо яно ж, напэўна, усім дзяўчатам і жанчынам гадоў да 30, а то і пазней, здаецца, што ўся справа ў гэтым...

Да выбару адзежы падключыліся і мы. Чаго толькі на яе ні напяльвалі — са свайго пакоя, з суседняга. Нарэшце спыніліся на белай блузцы і чырвонай спадніцы. Яна вельмі прыгожая была — у зборачку, на шырокай паяснічцы... І (гэта важна) на кнопачках спераду.

Праўда, памер малаваты. Наташа насіла 48-ы, а спадніца — суседчына — недзе 44-га... Аднак, калі жывот падцягнуць.

Наташа так і зрабіла. Апранулася, паехала да ўнівермага «Беларусь», каб адтуль ужо разам з хлопцам пайсці ў кін

Міхаіл ЗАХАРАЎ: «НАС НЕ ТРЭБА ЛЮБІЦЬ»

Міхаіл Захараў, адзін з самых харызматычных трэнераў у беларускім хакеі, сёлета зноў выйграў чэмпіянат, нягледзячы на тое, што супернік па фінале «Гомель» да перамогі быў як ніколі блізкі. Галоўны трэнер «Юнацтва» расказаў пра няпростую фінальную серыю, пра непрыгожыя паводзіны балельшчыкаў, пра тое, чаму некаторыя недалюбліваюць «Юнацтва»...

— «Юнацтва заваёўвала чэмпіёнства ў 2004-м, 2005-м, 2006-м. Пасля сёлетняй перамогі вы сказалі, што гэта была самая складаная фінальная серыя. Чаму?

— Добра гулялі ўвесь год, не прайгравалі. Пабілі ўсе рэкорды — магчымыя і немагчымыя. Малавата было паражэнняў. Па сутнасці, не было з кім напружвацца. Гэта адыграла сваю дрэнную ролю для каманды.

— З «Гомелем» у фінале давялося напружвацца?

— З «Гомелем» давялося.

— Чаму тады вы сказалі, што з самага пачатку ведалі, што перамога будзе за вамі? «Гомель» вёў у фінальнай серыі 3:1. Кожная гульня магла стаць апошняй...

— Мы добра гулялі. Калі мы прайгравалі 3:1, я сказаў кіраўніцтву федэрацыі, што дарэмна яны прывезлі Кубак для «Гомеля». Я ведаў, што апошні матч будзе не зараз.

— Не магу зразумець, адкуль такая ўпэўненасць?

— Калі не верыць, навошта тады працаваць? Мы гулялі нядрэнна, проста быў шэраг прычын, па якіх не маглі зачапіцца за перамогу. Я ўсе матчы для сябе разабраў, зрабіў высновы, чаму прайгралі. Ёсць прычыны, якія нельга называць, але ўнутры каманды мы іх ведаем, і гульцы ведаюць. Перад апошнім матчам я хакеістам сказаў: я ведаю, як вы будзеце сёння гуляць.

— Калі ў трэцім перыядзе вырашальнага матча лік быў 0:0, вы, канешне, таксама ведалі, што перамога ваша?

— Нават не сумняваўся. «Гомель» не змог бы забіць у апошнім матчы. Яны добра гулялі, стараліся, але момантаў у іх не было. Наша гульня была накіравана на тое, каб не дапусціць ніводнай памылкі, чакалі, пакуль памыліцца «Гомель». Мы і ў першым перыядзе маглі забіць — было два ідэальныя моманты. Але асцярожнічалі. Галоўнае, што ў суперніка момантаў не было, што мы вельмі добра згулялі ў абароне. У перапынку перад трэцім перыядам я гульцам дакладна сказаў, хто памыліцца, той і прайграе, другога гола не будзе.

— Чаму так шмат людзей хварэла за «Гомель»? Вы і самі сказалі, што «Юнацтва» недалюбліваюць...

— А хто любіць моцных людзей? Хто любіць моцную каманду? У душы ўсе начальнікаў недалюбліваюць, думаюць, што павінны быць на іх месцы. Тое ж самае і ў хакеі. Усё жыццё ніхто ЦСКА не любіў, а яны ўсіх «часалі». Гомельскія балельшчыкі — малайцы. Іх прыехала сто чалавек на фінал, і яны перакрычалі мінскіх. Таму што прыехалі, напэўна, сапраўдныя фанаты. Гэта было спаборніцтва балельшчыкаў «Гомеля» з балельшчыкамі «Юнацтва», і яны паказалі, што сто чалавек мацнейшыя, чым тры з паловай тысячы.

— Вам балельшчыкі нахамілі якраз у Гомелі, пасля чаго вы не ходзіце там на прэс-канферэнцыі...

— Гэта нават не балельшчыкі. Мне потым расказалі, што ў інтэрнэце гэта абмяркоўвалася, і большасць на маім баку, сказалі, правільна, што я туды не хаджу. Там калі глядзіш матч, чутныя толькі словы на літару «б» і на літару «х». У Мінску такога няма. Тыя ж гомельскія балельшчыкі паказалі ў Мінску, як трэба сябе паводзіць. Калі б яны пачалі тут мацярыцца, я ведаю, чым бы гэта скончылася. Міліцыя з гэтым лёгка разбіраецца. Яны ў Мінску паводзілі сябе прыстойна. А за нас хварэлі слабавата. Гэтак жа і за мінскае «Дынама» хварэюць. Ёсць над чым працаваць. Калі ў Канадзе, у Манрэалі я ездзіў на матч да Касціцына і Грабоўскага, там 20 тысяч так хварэюць... Мне здаецца, у нас ніколі такога не будзе. Там ніхто не прымушае, яны самі як завядуцца, такі адрэналін атрымліваюць — малайцы. У Расіі поўны стадыён таксама выдатна хварэе. А ў тым жа Магілёве што адбываецца? Мат на маце. Навошта весці на такую пляцоўку сваіх дзяцей? Гэта ж пэўная група людзей заводзіць, няўжо праблема іх знайсці? Напэўна, міліцыі Гомеля і Магілёва падабаецца, калі іх абкладваюць матам.

— Магчыма, гэта не міліцыю, а «Юнацтва» не любяць...

— А нас не трэба любіць. Любіць трэба жанчын, дзяцей. Мы выходзім і паказваем гульню. Усім трэба ведаць, што «Юнацтва» прыязджае ў любы горад, каб выйграваць. Таму на нас і ходзяць поўныя стадыёны, дзе б мы ні гулялі. «Гомель», вядома ж, хацеў у нас выйграць. Такі ажыятаж — 3:1 вядуць. Усё, вось ён, Кубак, медалі. І тут зноў «па соплях» далі. Ужо ж не першы год так атрымліваецца.

— Што прыносіць большае задавальненне — трэнерская працы з прафесіяналамі ці гульні ў аматарскай камандзе, да якой адносіцца каманда Прэзідэнта?

— Безумоўна, гульні. Калядныя турніры павінны праходзіць у іншай, больш душэўнай атмасферы. А сёлета «Газпрам» так супраць нас настройваўся, такі ажыятаж, падагрэў быў, што нам нельга было прайграваць.

— Вы з Прэзідэнтам толькі пра хакей размаўляеце ці можаце спытаць, скажам, пра сусветны фінансавы крызіс?

— Я не пытаю. Каб пытаць, трэба ў гэтым добра разбірацца. Я ведаю, што цяпер усім складана. У мяне шмат сяброў-бізнэсменаў, у той жа Расіі. Да крызісу трэба ставіцца спакойна, гэта не ад нас залежыць. У нас добра развіта сельская гаспадарка, ёсць свае прадукты, галадаць мы не будзем дакладна. А Аляксандр Рыгоравіч, мне здаецца, у любым відзе спорту мог бы дасягнуць поспехаў. Ён і ў футбол гуляе, і ў тэніс вельмі добра, і на лыжах выдатна катаецца, у тым ліку і на горных. Ён любіць трэніравацца «праз не магу» сам. Калі трэніруешся, уцягваешся, без спорту ты не можаш. А ў такім узросце, як мы, трэба трэніравацца абавязкова. Я з-за траўмы не трэніруюся ўжо пяць тыдняў. І адчуваю, што не той стан. Хочацца прабегчыся, прайсціся хоць бы.

Усё-такі калі прэзідэнты краін займаюцца спортам — гэта правільна. Пуцін з першага дня займаўся, Мядзведзеў, які ніколі раней не займаўся спортам, пачаў, і яму падабаецца. Сарказі займаецца, Берлусконі ў футбол гуляе. Хто б мог падумаць дзесяць гадоў таму, што ў нас будзе такі ветэранскі хакей. Сёння займаецца ўся дзелавая эліта. У дзевяць гадзін вечара не трапіць на лёд. Ветэранскі хакей, дзе шайбу не кідаюць верхам і забаронена сілавая барацьба, — самы нетраўматычны від спорту. Уся Канада гуляе ў ветэранскі хакей, і нават жанчыны 70-гадовыя.

— Ну жанчын не ўцягвайце. Няўжо Іна (Афанасьва. — Аўт.) займаецца хакеем?

— Так, і сварыцца на мяне, калі ў яе трэніроўкі прападаюць. Я ўжо два гады яе трэнірую. Вось яе касцюм. Нават не ведаў, што ў яе тут усё так прыгожа запакавана. Вось яе канькі — дзіцячы памер. Усе кажуць, што яна прыгажэе і прыгажэе — гэта дзякуючы таму, што спортам займаецца. Пакуль без шайбы і клюшкі, так на лёдзе кругі наразае. Яна раней на каньках, напэўна, і не стаяла, хаця магчыма, у вёсках сваіх і стаяла калісьці. У яе канькі добрыя, нагу трымаюць — адразу стала і пакацілася.

— У Беларусі збіраюцца пабудаваць яшчэ 12 хакейных пляцовак. Многім гэта не падабаецца..

— Гэтага ўсё роўна мала. Нідзе ж на лёд трапіць нельга. Чыж у Бярозе нядаўна пабудаваў каток — туды не трапіць, усё занята. Там з'явілася дзве дзіцячыя каманды плюс масавае катанне. Тое ж самае ў Жлобіне. Што такое для Мінска 4 каткі? На іх немагчыма трапіць. Для сталіцы патрэбна каткоў 10. У кожным раёне — свой, са свамі школамі, масавым катаннем. У Маскве каля сотні каткоў. У Прыбалтыцы на два мільёны насельніцтва 20 каткоў. А у нас пабудавалі пяць — і кажуць: хопіць, дастаткова. Мы ж медаль хочам заваяваць, дасягнуць чагосьці. У Славакіі 70 каткоў — менш за ўсіх у Еўропе. У Швецыі — 700.

— Вы ўсё яшчэ марыце пра КХЛ?

— Усе ведаюць, што мы туды хочам, а які сэнс зараз пра гэта казаць?

— Нягледзячы нават на выступленні мінскага «Дынама»?

— Гэта іхнія праблемы. «Юнацтва» так не выглядала б. Праблема ў тым, што ў «Юнацтва» хочуць вярнуцца ўсе хакеісты. Усе разумеюць, што ўсе будуць ехаць у «Юнацтва». Грабоўскі паедзе ў «Юнацтва», калі скончыць гуляць, тыя ж Касціцыны — я не сумняваюся. Вунь майка на сцяне Сяргея Касціцына, НХЛаўская, а не шырспажывецкая, пачытай: «Лепшаму трэнеру М.М. Захараву». Мы тэлефануем адзін аднаму, перапісваемся. Ні з адным хакеістам у мяне няма праблем.

Гутарыла Алена АЎЧЫННІКАВА.

БЕЛОРУССКИЙ НАРОДНЫЙ СТРАХОВОЙ ПЕНСИОННЫЙ ФОНД
Ваше благополучное будущее!

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
ОАО «БЕЛОРУССКИЙ НАРОДНЫЙ СТРАХОВОЙ ПЕНСИОННЫЙ ФОНД»
ЗА 2008 ГОД
млн.руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	915,9	Источники собственных средств, всего	4313,3
Нематериальные активы	42,0	в том числе	
Финансовые вложения, всего	30622,3	- уставный фонд	3917,9
в том числе		- добавочный фонд	195,3
- инвестиции в дочерние общества		- фонд потребления	0,1
- инвестиции в другие организации	181,5	- резервный фонд	-
- облигации и другие долговые обязательства	30440,8	- фонд накопления	191,2
- прочие финансовые вложения	-	Целевое финансирование	-
		Нераспределенная прибыль прошлых лет	0,2
Дебиторы, всего	3360,6	Нераспределенная прибыль отчетного года	8,6
в том числе - дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	-	Страховые резервы и фонды, всего	54541,0
- депо премий по рискам принятым в перестрахование	-	в том числе - страховые резервы	54528,6
- дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	3360,6	- фонд предупредительных мероприятий	1,0
Прочие активы, всего в том числе:	24852,7	- гарантийные фонды	11,4
- незавершенное строительство	4624,6	Кредиторы, всего в том числе	925,7
- материальные ценности и затраты	554,5	- кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	-
- денежные средства	19391,8	- кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
- собственные акции (доли)	122,8	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
- прочие активы	158,9	Заемные средства	-
Непокрытые убытки прошлых лет	-	- кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	925,7
Непокрытые убытки отчетного года	-	Прочие пассивы	13,5
БАЛАНС	59793,5	БАЛАНС	59793,5

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ
ОАО «БЕЛОРУССКИЙ НАРОДНЫЙ СТРАХОВОЙ ФОНД»
ЗА 2008 ГОД
млн.руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	12867,5
Страховые выплаты	020	1686,0
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-12912,9
Отчисления в гарантийный фонд	040	146,1
Расходы на ведение дела	041	1844,4
Результат от операций по страхованию жизни, (+ или -)	050	-3721,9
II. Страхование иное, чем страхование жизни	064	
Страховые взносы (премии) - нетто-перестрахование	064	
Изменение резерва незаработанных премий - нетто-перестрахование (+ или -)	067	
Оплаченные убытки (страховые выплаты) - нетто-перестрахование	087	
Изменение резервов убытков - нетто-перестрахование (+ или -)	092	
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	
Расходы на ведение дела	120	
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	6136,4
Операционные расходы	145	308,3
Внереализационные доходы	150	113,9
Внереализационные расходы	155	52,9
Использование прибыли	158	2158,6
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	8,6

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
аудитора индивидуального предпринимателя Ткач Светланы Ивановны
по бухгалтерской (финансовой) отчетности
Открытого акционерного общества «Белорусский народный страховой пенсионный фонд» за 2008 год
20 февраля 2009 года, г. Минск

Аудируемое лицо: **Открытое акционерное общество «Белорусский народный страховой пенсионный фонд»**, Республика Беларусь, 220034, город Минск, переулок Войсковой, дом 12, офис 406

Свидетельство о государственной регистрации от 8 ноября 2001 года №100083544, выданное Комитетом по надзору за страховой деятельностью при Министерстве финансов Республики Беларусь

Учетный номер плательщика 100083544

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белорусский народный страховой пенсионный фонд» за период с 1 января по 31 декабря 2008 года включительно.

Мы провели аудит в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 ноября 1994 года «Об аудиторской деятельности» (с изменениями и дополнениями), республиканскими правилами аудиторской деятельности, утвержденными постановлениями Министерства финансов Республики Беларусь, нормативными и правовыми актами, регулирующими страховую деятельность в Республике Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая к настоящему аудиторскому заключению бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Белорусский народный страховой пенсионный фонд», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существующих аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белорусский народный страховой пенсионный фонд» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год, при этом совершенные ОАО «Белорусский народный страховой пенсионный фонд» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Аудитор индивидуальный предприниматель Ткач С.И.

все виды добровольного страхования жизни и дополнительной пенсии
Минск (+375 17) 290 64 22
Брест (+375 162) 21 11 02
Витебск (+375 212) 35 92 91
Гродно (+375 152) 72 25 21
Могилев (+375 222) 22 56 09
Солигорск (+375 174) 22 10 89
e-mail: info@fond.by
www.fond.by
Лицензия №С220000447160 на право осуществления страховой деятельности от 18 ноября 2008 года МФ РБ

Снег сышоў, пліта засталася...

Разгляд звароту

Спецыяльна дачакалася, калі міне суботнік. Думала, раптам хоць пасля такой падзеі сітуацыя зменіцца — праблема будзе вырашана, і пісаць гэты артыкул не давядзецца...

Цяпер, калі дакладна сышоў снег, асабліва добра «бачная» праблема, якая хвалюе мяне ўжо нават не адзін год. Хвалюе, бо я з ліку тых, каго хлебам не кармі, дай што-небудзь падобраўпарадкаваць. А тут — проста перад маімі вокнамі — такі непарадак!

Спачатку на гэтай вялікай, свабоднай пляцоўцы размяшчаліся «дамкі» будаўнікоў, якія ўзводзілі дом непадалёк ад таго, у якім я, у прыватнасці, жыву. Для зручнага перасоўвання работнікаў па незаасфальтаваній глебе былі прыцягнуты велізарныя бетонныя пліты, — утварылася дарожка. Калі будаўнічыя работы былі завершаны, дарожку разабралі — пліты забралі і вывезлі. Але ж каб усе забралі... Адна чамусьці засталася ляжаць акурат насупраць маіх вокнаў! Чаму? Вось пытанне... Некалькі месяцаў я штодня з надзеяй глядзела ў акно: раптам ненавісную пліту вывезлі, а вялізную лужыну, у якой цяпер плюхаюцца суседскія дзеці, зараўнялі?..

Месяц бег за месяцам, і раптам — вось удача! У паштовую скрыню кідаюць абвестку аб правядзенні для шырокага кола грамадзян тэлефоннай «прамой лініі» з удзелам кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска Барыса Васільева. Я была так рада, што дазванілася! Ну, падумала, не давядзецца брацца за пяро! Зараз усё хуценька і вырашыцца. У вуснай далікатнай размове просьбу паведамлю — і пліта знікне!

Я наогул з вялікай павагай стаўлюся да спробаў любога ўзроўню ўладаў быць бліжэй да людзей. «Прамыя лініі» — гэта цудоўна! Вядома, можна і ў пісьмовай форме «накідаць прапанову» ды адправіць яе на чыноўніцкі адрас поштай, аднак заўсёды ёсць «шанц», што рукапіс твой згубіцца пры незвычайных абставінах. А так — пазваніў, прыемна пагутарыў, пакінуў свае «даныя». Я, праўда, у гэтай нашай размове са спадаром Б.А. Васільевым прыгадала не толькі адну пліту перад маімі вокнамі, але расказала і аб тым, што тэрыторыя ўжо каля таго самага, новаўзведзенага дома, з таго самага боку, да якога «прымыкае» аўтобусны прыпынак, неяк слабавата прыбіраецца. Праблема ў тым, што на першым паверсе згаданага будынка плануе размясціцца, калі верыць шыльдзе, аддзяленне аднаго з банкаў. Праўда, да таго часу, пакуль адкрыцца не адбылося, навакольная тэрыторыя, відаць, нічыйная. Адсюль — пясок, смецце, часам разбітыя бутэлькі... Словам, відаць, што моладзь тут бывае, а прыбіральшчыкі — наўрад ці.

Адзіная няўдача атрымалася: калі праводзілася «прамая лінія», была зіма — 12 студзеня, і «скаргі» мае, прыкрытыя снегам, былі візуальна... амаль не заўважныя. Але ж хто захоча, той убачыць, думала я, калі кожную раніцу з нецярплівасцю падсоквала да акна і расчаравана ад яго адыходзіла. 22 студзеня атрымала адказ:

«Паважаная Святлана Уладзіміраўна!

Па вашым звароце на «прамую лінію» кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска паведамляем наступнае.

Прадстаўніком аддзела добраўпарадкавання УП «ЖРЭА № 1 Фрунзенскага раёна г. Мінска» 12 студзеня была праведзена праверка ўборкі дваровай тэрыторыі жылога дома № 119 па вул. Адзінцова. На момант праверкі пешаходная частка ўздоўж дома была ачышчана ад снегу і наледзі. Праезная частка не была ачышчана ад снегу і наледзі.

Кіраўніцтву Таварыства ўласнікаў №10 выдадзена прадпісанне на ўборку тэрыторыі жылога дома №119 па вул. Адзінцова. У выніку прынятых мер выкананы работы па ачышчэнні праезнай часткі ад снегу.

Кіраўніцтву Таварыства ўласнікаў № 10 даручана трымаць на кантролі пытанне па выкананні сваіх службовых абавязкаў падначаленымі.

Кіраўнік адміністрацыі Б.А. Васільеў».

Прачытала і... здзьмулася. Ну, думаю, адзін «каленкор»: што па пошце мая паперка згубілася б, што па тэлефоне мы адно аднаго не дачулі... Быццам, мы пра нейкія розныя рэчы пагаварылі. Пра пліту ў лісце — ні слова. Як і ў маім звароце — пра наледзь. Дык не дзіўна, што як ляжала мая «гаротная», так і ляжыць. І лужына — побач. Я ж быццам бы тлумачыла: знаходзіцца «ненавісная» з таго боку дома, які глядзіць на аўтазапраўку, на зялёнай, незаасфальтаваній зоне!! Хіба, трэба было пальцам паказаць? Я ж таму на «гарачую лінію» і пазваніла, што прыйсці ў наша Таварыства і проста ім паведаміць пра пліту — заведама бессэнсоўная рэч. У нас вось нядаўна дамафон сцягнулі, дык ніхто з месяц на пад'езд ніякай увагі не звяртаў!.. У таварыствы, дарэчы, я не верыла ад самага пачатку іх укаранення, і з цягам часу ўсё больш пераконваюся, што не выспелі мы да такіх «формаў домаўладання».

Праўда, з нядаўняга часу... «неўзлюбіла» я і ЖЭСаўскія падыходы да справы. Прыдзіраюся, скажаце!? Калі ласка, для чысціні эксперыменту запрашаю ўсіх ахвотных на адрас: вул. Мірашнічэнкі, д.53, пад'езд 9. Апошнія, можа, паўгода-год, ну, не ўвайсці ў пад'езд! Брудны дол, сцены, вокны, кожны паверх упрыгожваюць шклянкі для недакуркаў, а нядаўна нехта пад лесвіцу на першым паверсе смярдзючае крэсла выцягнуў! Пахі ў пад'ездзе — асобная размова!! Хоць святых вынось!

Натуральна, я разумею месца і ролю саміх жыхароў у працэсе забруджвання тэрыторыі, на якой яны пражываюць. Літаральна днямі, відаць, сама прыбіральшчыца не вытрывала — вывесіла аб'яву аб неабходнасці захавання ў пад'ездзе чысціні самімі жыхарамі. Сапраўды, чаго прасцей? Не мачыцца ў смеццеправод, не выкідаць міма яго смецце, не складваць недакуркі на кожным паверсе, не пакідаць на лесвічных пралётах грувасткія, смярдзючыя рэчы і г.д., г.д. Аднак чаму ўсё гэта мае месца?

Магу толькі здагадвацца. Здагадка першая. Нават няўзброеным вокам відаць, што вышэйзгаданы пад'езд, як і мікрараён «Зялёны Луг», і Савецкі раён, дзе, прынамсі, размяшчаецца той самы дом з тым самым пад'ездам, за апошнія гады моцна «пабагацеў» на пітушчых людзей. Хоць сцвярджаць гэта я бяруся на падставе толькі ўласных назіранняў. З іншага боку, мне даводзілася мыць падлогу. Таму я магу адрозніць, калі дол спачатку вымелі, а потым вымылі, а калі проста «расцёрлі» бруд.

Нехта скажа: што журналістка можа ведаць пра цяжкую працу прыбіральшчыцы пад'езда? Дакладна магу сказаць адно: за гады маёй працы гэтай самай «журналісткай», па праўдзе кажучы, абрыдла чуць аб нізкіх заробках і непамерна аб'ёмнай рабоце. У тым ліку прыбіральшчыц. А таму, карыстаючыся момантам, заклікаю ўсіх хоць бы напалову адпрацоўваць нават тыя невялікія грошы, якімі аплачваецца наша праца!

Што датычыцца заклікаў «вытрымліваць чысціню», то імі аднымі не абысціся. Ну, не ўражваюць нашага чалавека заклікі! Можа, трэба падумаць пра матэрыяльнае заахвочванне за парадак? Паводле закона, у такім грамадскім месцы, як пад'езд, нельга, напрыклад, курыць. Вось і выйсце: убачыла прыбіральшчыца шклянкі з бычкамі, — ну, і выклікала б міліцыю, тая склала б пратакол, наклала штраф на жыхароў пад'езда. Няма канкрэтных вінаватых? Штрафуйце ўвесь пад'езд!! І з крэслам можна вырашыць сітуацыю. Толькі займацца гэтым трэба.

Але ж, можа, якраз зараз начальнік ЖЭСа № 68 гэтым і займаецца? Вось ужо два тыдні я не магу злавіць яго на месцы.

З павагай,
расчараваная падыходамі да работы са зваротамі грамадзян
Святлана БАРЫСЕНКА.

Былыя вязні канцлагераў: «Моладзь не павінна забыць пра вайну!»

Міжнародны дзень вызвалення вязняў канцэнтрацыйных лагераў адзначаўся заўтра, 11 красавіка. Менавіта ў гэты вясновы дзень 1945 года, 64 гады таму, у канцэнтрацыйны лагер Бухенвальд увайшлі амерыканскія войскі і пачалі вызваляць вязняў. Напярэдадні гэтай памятнай даты прайшла прэс-канферэнцыя з кіраўнікамі грамадскіх аб'яднанняў былых вязняў.

— Я была сведкам тых падзей, якія адбываліся ў часы Вялікай Айчыннай вайны, — успамінае **Вольга НЯХАЙ, кіраўнік грамадскага аб'яднання вязняў фашызму «Лёс»**. — Я патрапіла на засаду каля вёскі Вішнёўка, і мяне кінулі за краты. Было зразумела, што выйсце толькі адно — смерць. Бо кожную ноч, а пятай ці а палове пятай гадзіны раніцы, у камеру ўваходзіў немец, тыкаў палкай: «Ду, ду, ду...». А на дварэ ўжо стаяла душагубка, і на гэтым жыццё спынялася. Гэта трэба было ўсё перажыць, пабачыць на ўласныя вочы... Я прасядзела ў турме да снежня, і, уяўляеце сабе, для нас шчасцем было патрапіць у канцлагер... Самае галоўнае — не згубіць асобу. Я вытрымала. Калі нас вызвалялі, мне ў мае 19-20 гадоў давалі 56! Уяўляеце, які быў у мяне выгляд? Нават у салдатаў, якія стаялі побач з камісіяй, былі вось такія вялікія вочы. А я ім кажу: «Не, мне не пяцьдзесят шэсць, мне толькі 19 гадоў...» Але самае страшнае, што я перажыла — гэта смерць майго сына-першынца... Яго ўмярцвілі ў турме...

На прэс-канферэнцыі былыя вязні папрасілі ў журналістаў, каб тыя не забывалі на старонках газет і на экранах тэлевізараў узгадваць народны подзвіг у гады вайны, каб не перапісвалі гісторыю наноў. Яны хвалююцца за пераемнасць пакаленняў, за тое, што сённяшняя моладзь не вельмі добра ведае гісторыю той страшнай вайны.

— Людзі павінны быць удзячнымі за тыя гады свабоды, у якой мы жывём. У 50 гадоў працую ва ўніверсітэце з моладдзю, — працягвае Вольга Аляксандраўна. — Яны шмат чаго не ведаюць, не ведаюць гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Я вас прашу — не скажайце гісторыю, уключайце ў сродкі масавай інфармацыі эпізоды пра пакаленні, пра людзей...

Яшчэ кіраўнікі грамадскіх арганізацый упэўненыя, што на месцы самага вялікага ў Беларусі канцэнтрацыйнага лагера Трасцянец хутка з'явіцца вялікі мемарыяльны комплекс:

— Сёлета ў мемарыльным комплексе «Яма» выступаў Прэзідэнт, які ўшанаваў памяць загінулых і сказаў, што прыйшоў час будаваць на месцы канцлагера Трасцянец вялікі мемарыял. Я думаю, што гэта будзе зроблена, бо ёсць цікавасць і ў заходніх дзяржаў, з якіх ішлі цэлыя эшалоны жыхароў Кёльна, Дзюсельдорфа, Гамбурга і іншых, — сказаў **Валянцін ГЕРАСІМАЎ, старшыня Беларускага рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне»**. Дарэчы, па яго звестках, сёння яшчэ жывыя 5 былых вязняў Трасцянца.

— Мы людзі ўжо ўсе пажылыя і старыя, шмат хто хворы, і тыя нешматлікія льготы, якія існавалі ў былых вязняў у рэспубліцы, дапамагалі людзям выжыць, — сказаў **Міхаіл ТРЭЙСЦЕР, кіраўнік грамадскага аб'яднання «Вязні гета і фашысцкіх канцлагераў»**. — На жаль, сёння ўсе вязні фашызму, якія не з'яўляюцца ветэранамі вайны, інвалідамі 1, 2, 3 груп, пазбаўленыя практычна ўсіх ільготаў — і бясплатнага праезду, і бясплатных лекаў, і значных камунальных ільготаў. Мы змагаемся ўсімі законнымі сродкамі за аднаўленне ільготаў... На жаль, справа пакуль не рухаецца. Мне па грамадскіх абавязках прыходзіцца бываць у Ізраілі, там з кожным годам толькі нарошчваюцца ільготы для былых вязняў. А мы неяк спрацавалі ў адваротным кірунку...

Дарэчы, падчас рэспубліканскага суботніку, што як раз прыпаў на 11 красавіка, тэрыторыя вакол абеліску ў Трасцянцы была прыбрана, а да помніку ўскладзены кветкі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Хачу спытаць... Хто такі Змеяносец?

У мяне пытанне да астролагаў. У цяперашні час Сонца на працягу года перамяшчаецца па 13 сузор'ях: Авен, Цялец, Блізняты, Рак, Леў, Дзева, Шалі, Скарпіён, ЗМЕЯНОСЕЦ, Казярог, Вадалей, Рыбы. Як гэта тлумачыць астралогія?

Н. Гецарава, *Слаўгардскі раён.*

— Толькі ў нашай галактыцы каля 1,5 млрд зорак. Усе яны рухаюцца — разам з галактыкай у прасторы і вакол галактычнага цэнтра. З пункту гледжання зямнога назіральніка гэты працэс вельмі марудны, але ён няспынны, — тлумачыць **астролаг Уладзімір ВАСЮК**. — Усё на свеце з часам змяняецца, у тым ліку і абрысы сузор'яў. Напрыклад, сузор'е Вялікая Мядзведзіца нам сёння бачыцца як коўш з дзяржаннем, а 100 тысяч гадоў таму яно больш нагадвала папяровага змея з хвастом.

Змяняецца і задыякальны пояс — сузор'і, якія знаходзяцца ў плоскасці экліптыкі (руху Зямлі вакол Сонца). Некалі старажытныя астролагі правялі вылічэнні і ўмоўна падзялілі экліптыку на 12 сектараў — атрымалі 12 задыякальных сузор'яў (задыякальны пояс). Калі глядзець з Зямлі, на працягу года Сонца будзе перамяшчацца па гэтых 12 сузор'ях. Аднак, з-за таго, што зоры працягваюць рухацца (павольна, але верна), колькасць сузор'яў задыякальнага пояса пакрысе павялічваецца (былі эпохі, калі ў пояс задыяка ўваходзіла ўсяго 8, 10 сузор'яў). Зараз з боку Паўночнага паўшар'я да плоскасці экліптыкі паступова набліжаецца сузор'е Змеяносца. Яно становіцца часткай экліптыкі і ператвараецца ў 13-ы знак задыяка. Гэты працэс пачаўся тысячы гадоў таму і пройдзе яшчэ шмат часу да таго, пакуль Змеяносец стане паўнавартаснай часткай задыяка. Тым не менш пэўны ўплыў на нашу планету і яе жыхароў сузор'е ўжо робіць. Астролагі вылучаюць так званую зону Змеяносца — на мяжы Скарпіёна і Стральца (22 лістапада плюс-мінус 5 дзён). Аднак каб у натальнай карце праявіўся Змеяносец, адной даты нараджэння мала. Недастаткова мець Сонца ў гэтай зоне, патрабуюцца яшчэ і іншыя ўмовы. Трэба быць народжаным у пэўныя сонечныя і месяцовыя дні, у пэўны час, мець пэўныя планеты ў пэўным суаднясенні адна адносна іншай і г.д. З улікам таго, што сузор'е Змеяносца яшчэ не цалкам уступіла ў свае правы, калі не вытрымліваюцца шматлікія абавязковыя ўмовы нараджэння сапраўднага Змеяносца, чалавека лічаць Скарпіёнам ці Стральцом.

Некалі надыдзе эпоха, калі 13 сузор'е стане цалкам часткай экліптыкі, тады задыяк будзе мець 13 знакаў. І гэта яшчэ не ўсё. З боку Паўднёвага паўшар'я (на мяжы Авена і Цяльца) рухаецца яшчэ адно сузор'е, якое ў аддаленай будучыні стане часткай экліптыкі, — сузор'е Кіта. Яно таксама мае зону свайго ўплыву: 21 красавіка плюс-мінус 5 дзён. Вызначыць, ці з'яўляецца чалавек Змеяносцам або Кітом, можа толькі прафесійны астролаг.

Змеяносец — знак, звязаны з пераключэннем часавых рытмаў. Змеяносцы валодаюць здольнасцю замаруджваць ці паскараць свой біялагічны ўнутраны час. На бытавым узроўні гэта людзі, якія ўсюды паспяваюць ці ўвогуле нікуды не спяшаюцца. Змеяносцы здольныя цалкам трансфармаваць сябе — ад самай ніжэйшай сваёй праявы да найвышэйшай. Кіт звязаны з экалогіяй, біясферай і — у адрозненне ад Змеяносцаў, якія ўладараць над часам, — з прасторавай кампанентай. Сярод Кітоў шмат псіхолагаў-аналітыкаў, якія займаюцца экалогіяй псіхікі, шмат вучоных, палітыкаў. Кіт і Змеяносец толькі пачынаюць праяўляць сябе (наша планета Зямля становіцца ўспрымальнай да іх энергій). Астатнія знакі задыяка пакуль што застаюцца ў сваіх ранейшых часавых межах. Іх змена стане актуальнай праз 15-20 тысяч гадоў.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

КОНКУРСЫ РАШЭННЯЎ

Завяршаем конкурс-7 рашэнняў заданняў майстра спорту Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў):



№ 16. БЕЛЫЯ: a5, c3, e1, g3, h2, h4 (6). ЧОРНЫЯ:a7, b4, d2, e3, f2, h6 (6).

№ 17. БЕЛЫЯ: b2, b6, c1, d6, f4, h2 (6). ЧОРНЫЯ: a3, d2, e3, f2, g7 (5).

У абедзвюх камбінацыях белыя пачынаюць і выйграюць.

А ў рамках бліца-44/6 развяжыце эцюд гросмайстра СССР з Гомеля Леаніда Вітошкіна:



БЕЛЫЯ: 7, 42, 44, дамка 38 (4). ЧОРНЫЯ: 45, дамка 41 (2). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў звычайны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

Па-за конкурсам разгледзьце і камбінацыйныя праблемы Л. Вітошкіна, якія ён даслаў у рэдакцыю:

№ 1. БЕЛЫЯ: 9, 14, 23, 25, 31, 41, 50 (7). ЧОРНЫЯ: 7, 12, 20, 24

Конкурсы

Як працуем, так і маем

Пад эгідай Міжнароднага бюро Сусветнага паштовага Саюза (СПС) і ЮНЕСКА сёлета ў 38-ы раз праводзіцца моладзевы міжнародны эпісталярны конкурс. І 13-ы раз удзел у ім прымае Беларусь: гэта значыць, нашы хлопцы і дзяўчаты (да 15 гадоў) гэтаксама, як і іх аднагодкі з усіх куткоў свету, пішуць сёлета лісты на зададзеную тэму. Вызначае яе Міжнароднае бюро СПС і тым самым кожны год спрабуе скіраваць увагу моладзі на пэўную праблему. Кшталту, як яна (моладзь) можа пабудаваць лепшую будучыню, захаваць жывёльны свет, ураватацца ад адзіноты... Сёлета ў сваім лісце камунебудзь трэба было патлумачыць, як годныя ўмовы працы могуць прывесці да паляпшэння жыцця.

Конкурс на лепшы ліст, як і ў папярэднія гады, праводзіўся ў некалькі этапаў — спачатку пераможцы вызначаліся на раённым узроўні, потым — на абласным. Днямі аўтарытэтнай камісіяй пад сустаршынствам начальніка ўпраўлення паштовых тэхналогій і лагістыкі РУП «Белпошта» Валянціны Маліноўскай і галоўнага інспектара Міністэрства адукацыі Раісы Сідарэнкі падведзены вынікі рэспубліканскага. Пасля досыць доўгага абмеркавання месцы размеркаваліся так: трэцяе прысуджана васьмікласнікам Вячаславу Паўлаўцу (СШ 145 г. Мінск), Віялеце Паўловіч (гімназія № 2 г. Навагрудак), Аляксандру Урэцкаму (Дубраўская БАШ Ельскага раёна) і сямікласніцы Святлане Сцежкінай (Гомельскі д/садок-сярэдняя школа Полацкага раёна); другое — Таццяне Радзіён, васьмікласніцы з вёскі Шашкі Стаўбцоўскага раёна і Дзмітрыю Дзярнову, сямікласніку СШ № 10 г. Брэста. Першае — сямікласніцы СШ № 31 Магілёва Аліне Бейнер.

Адпаведна — менавіта яе ліст будзе прадстаўляць нашу краіну на міжнародным узроўні. Спадзяёмся, годна. Тым больш, што прыклады такія былі: Раман Шэхлін, сямікласнік Сялецкага комплексу д/садок—сярэдняя школа, што на Мсціслаўшчыне, летась заваяваў другую прэмію, Аляксей Гаўрылік з Ільянскай АСШ Вілейскага раёна пазалетась трэцюю, Вікторыя Данілоўіч, васьмікласніца Карэбскай БШ Дрыбінкага раёна, у 2003-м — першую.

Ганаровыя граматы, каштоўныя прызы, ну безумоўна ж, чакаюць і тых, хто стаў пераможцамі рэспубліканскага конкурсу. Што датычыцца зададзенай тэмы (як годныя ўмовы працы могуць прывесці да паляпшэння жыцця), то тут варта аддаць належнае назіранням з ліста Аліны Бейнер, якая лічыць, што задавальненне ад сваёй працы можна атрымліваць толькі тады, калі для яе ёсць, па-першае, усё неабходнае (у тым ліку тэхніка), па другое — годная заработная плата, па-трэцяе — належны адпачынак штодня і водпуск штогод «куды хочаш»... А яшчэ — добразычлівыя адносіны ў калектыве.

Хто б спрачаўся?

Валянціна ДОЎНАР.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



На асфальт, як на канапу...

Пасля чарговай паўлітроўкі п'яная кампанія сяброў-аднавяскоўцаў пачала надакучваць гаспадару. Тым больш што за вокнамі ўжо добра згусціўся сакавіцкі вечар. І гаспадар настойліва папрасіў загулялых гасцей пакінуць хату. Праўда, апошнія не надта спяшаліся класціся спаць. Хацелася дабаўкі. І п'яная тройка пасунулася на аўтадарогу, каб дабрацца да суседняй вёскі. Напарадзе не надта цвёрдай хадой ішлі брат з сястрой, крыху адстаўшы, плёўся іх сяброк. І не заўважылі, як той прылёг на асфальт. Пачуўшы глухі ўдар, яны азірнуліся і ўбачылі на дарозе ляжачае цела і святло фараў аўтамабіля, які аддалялося...

Група інспектараў ДПС на чале з начальнікам міжраённага аддзела аператыўнага рэагавання і вышуку ДАІ пры УУС Гомельскага аблвыканкама Вячаслава Шкурко прыбыла на месца здарэння ў вёску Валосавічы Акцябрскага раёна блізка да поўначы. На гэты момант было вядома адно: пад коламі аўтамабіля загінуў мясцовы 35-гадовы жыхар, вадзіцель з месца здарэння ўцёк. Тлумачэнні п'яных сведак карысці не прынеслі. Толькі пад раніцу, крыху ачуняўшы, яны пачалі штосьці прыгадваць. Але, як высветліцца пазней, іх сведчанні ўнеслі ў дзеянні міліцыі адну толькі блытаніну. З іх слоў, першыя два дні шукалі аўтамабіль маркі БМВ. І толькі пазней, прааналізаваўшы скупыя доказы, аператыўнікі выйшлі на след сапраўднага віноўніка дарожна-транспартнага здарэння.

Ім аказаўся ўраджэнец тутэйшых мясцін Юрый К., які пражывае цяпер у Мазыры. Аўтамабіль «Мазда», за рулём якога ён знаходзіўся ў той злашчасны вечар, належыць жыхару г. Крупкі Мінскай вобласці. Каб вызначыць транспартны сродак і яго кіроўцу, супрацоўнікам міліцыі давялося на працягу пяці дзён разгадваць складаны рэбус. Пад уздзеяннем бясспрэчных доказаў Юрый К. прызнаўся ў здзейсненым наездзе на ляжачага чалавека. Апантаны страхам, ён, замест таго каб спыніцца і аказаць дапамогу пацярпеламу, пад покрывам цемры з'ехаў с месца здарэння. Тым самым уласнаручна падпісаў сабе прысуд.

Мікалай ГАРБАЧОЎ, інспектар па прапагандзе Упраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (11 красавіка). По гарызанталі: «Запарожац». Кліка. «Лада». Тар. Плыт. «Аўдзі». Джын. Акорд. Судак. Лента. Пласт. Фон. Шпак. Афера. Раса. Форт. Дуб. Баба. Тора. Адмірал. Гараж. Чылі. «Джып». Жыта. Жор. Сутана. **По вертыкалі:** Дэпо. Шрот. Алыча. «Парог». Астра. Стэка. Арахіс. Знак. «Лад». Дождж. Палітыка. Жыжа. Каток. Барытон. Шар. Пара. Адліга. Біч. Дан. «Ферары». Твор. Бал. Станіца. «Напалі».

Дарагі наш ***Віктар Лявонцьевіч Казлоўскі*** *з в. Ж. Барок. Сардэчна віншуем цябе з днём нараджэння, жадаем сямейнага дабрабыту, поспехаў, а галоўнае — моцнага здароўя.*

Родныя.

Інфарм-укол

Жыццёва важныя нормы

Артэрыяльны ціск

Гэта ціск крыві, якая выкідваецца сэрцам, на сценкі сасудаў. Адзін з найважнейшых паказчыкаў функцыянавання арганізма.

Нормы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя:

Катэгорыя артэрыяльнага ціску	Сісталічны (верхні) мм рт. сл.	Дыясталічны (ніжні) мм рт. сл.
аптымальны	менш за 120	менш за 80
нармальны	менш за 130	менш за 85
павышаны	130-139	85 — 89
гіпертанія ізаляваная сісталічная	звыш 140	менш за 90
памежная	140-149	90-94
1-я ступень	140-159	90-99
2-я ступень	160-179	100-109
3-я ступень	звыш 180	звыш 110

Калі сісталічны і дыясталічны артэрыяльны ціск пацыента аказваецца ў розных катэгорыях, выбіраецца больш высокая катэгорыя.

«Аптымальны» — у адносінах да рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых ускладненняў і смяротнасці.

Павышаны артэрыяльны ціск прыводзіць да развіцця такіх небяспечных захворванняў, як ішэмічная хвароба сэрца, інсульт, інфаркт, ныркавая недастатковасць і інш.

Халестэрын

Як і іншыя тлушчы, халестэрын не змешваецца з вадой. Для таго, каб пераносіць халестэрын і тлушч з цячэннем крыві, арганізм «упакоўвае» іх у пратэінавую абалонку. Такі комплекс называецца ліпапратэінам.

Халестэрын неабходны нашаму арганізму, спрыяе росту і дзяленню клетак, аднак лішак пагражае развіццём сур'ёзных сардэчна-сасудзістых захворванняў. Калі чалавек атрымлівае з ежай лішак халестэрыну, з цягам часу ён назапашваецца ў арганізме. Халестэрынавыя бляшкі пранікаюць у прасвет сасуда, выклікаюць яго звужэнне і тым самым абцяжарваюць кровазварот. Пры гэтым развіваецца атэрасклероз.

Так званы добры халестэрын знаходзіцца ў ліпапратэінах высокай шчыльнасці. Мяркуюць, што гэты халестэрын змывае адкладанні халестэрыну са сценак артэрый і пераносіць іх у печань для паўторнай перапрацоўкі і выдалення з арганізма. Што датычыцца ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці, то лічыцца, што менавіта з-за іх адбываецца назапашванне халестэрыну на сценках артэрый.

Найбольш высокі ўзровень карыснага халестэрыну назіраецца, як правіла, у людзей, якія рэгулярна займаюцца спортам, не курыць і падтрымліваюць нармальную вагу.

Ліпапратэіны нізкай шчыльнасці		Ліпапратэіны высокай шчыльнасці	
узровень	рызыка	узровень	рызыка
160 мг/дл	высокая	да 35 мг/дл	дадатковая рызыка
130-159 мг/дл	памежны стан	35 мг/дл і больш	норма
да 130 мг/дл	норма		

Увесь халестэрын	
узровень	рызыка
240 мг/дл і болей (6,5 і болей ммоль/л)	высокая
200-239 мг/дл (да 6,5 ммоль/л)	памежны стан
да 200 мг/дл (да 5,2 ммоль/л)	норма

Цукар у крыві

Высокі ўзровень цукру ў крыві абумоўлены недастатковым дзеянне інсуліну — гармону, які выпрацоўваецца падстраўніkавай залозай і спрыяе засваенню цукру клеткамі арганізма. Пры лішку цукру ў крыві пакутуюць сценкі сасудаў і нервовыя канчаткі. Сетка дробных крывяносных сасудаў найбольш развіта ў сятчатцы вока і ў нырках, а нервовыя канчаткі падыходзяць да ўсіх органаў, але асабліва многа іх у нагах, таму менавіта вочы, ныркі і ногі найбольш падвержаныя дыябетычным ускладненням. Павышэнне ўзроўню цукру нашча звыш 120 мг% сведчыць аб развіцці цукровага дыябету.

Узровень цукру ў крыві	норма	лішак
нашча	80-120 мг% (5,5-6,6 ммоль/л)	звыш 120 мг%
пасля прыёму ежы	140 мг% (7,7 ммоль/л)	звыш 160-180 мг%

Святлана БАРЫСЕНКА.

Утеряны бланки строгой отчетности по страхованию: «Автокаско» БТ 008606, БТ 008607, БТ 008608, БТ 008609, БТ 008610, БТ 008611, БТ 008612, БТ 008613, БТ 008614, БТ 008615; страховой полис ГОВТС РБ АЖ 3050973.
Указанные бланки строгой отчетности считать недействительными.

Утеряны бланки строгой отчетности по страхованию: страховой полис ГОВТС РБ АЖ 3080553, АЖ 3080554, АЖ 3080555, АЖ 3080556, АЖ 3080557, АЖ 3080558, АЖ 3080559, АЖ 3080560, АЖ 3080561, АЖ 3080562, АЖ 3080563.
Указанные бланки строгой отчетности считать недействительными.

У **суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Нарушэвіч Лілії Уладзіміраўны**, 06 лютага 1975 года нараджэння, ураджэнкі г. Сцяпняк Рэспублікі Казахстан. Апошняе вядомае месца жыхарства: вул. Піянерская, д. 6, в. Камайск Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Л.У. Нарушэвіч, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні адсутным без вестак грамадзяніна **Карніловіча Алега Уладзіміравіча**, 18 кастрычніка 1961 года нараджэння, ураджэнца пасёлка Софпарог Леутскага раёна Рэспублікі Карэлія, апошняе месца жыхарства — в. Забор'е Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна А.У. Карніловіча, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.11	20.09	13.58
Віцебск —	5.58	20.02	14.04
Магілёў —	6.01	20.00	13.59
Гомель —	6.01	19.53	13.52
Брэст —	6.27	20.24	13.57
Гродна —	6.30	20.21	13.51

Месяц

Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Марыі, Абрама, Макара, Сяргея.*

К. *Валеры, Марты, Юстыны, Валяр'яна, Германа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+15..+17°C	КІЕЎ	+14..+16°C
РЫГА	+11..+13°C	ВІЛЬНЮС	+10..+12°C
МАСКВА	+12..+14°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+4..+6°C

Дзве даты

14 красавіка

1880 год — нарадзіўся Язэп Дыла, беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. У студзені—лютым 1919 года — у складзе Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, народны камісар працы, затым — старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі БССР, у 1926—1927 гадах — дырэктар БДТ-1, затым — дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства пры Інбелкульце. У 1930 годзе рэпрэсаваны. Жыў і працаваў у Саратаве. Рэабілітаваны ў 1957 годзе. Аўтар драматычных твораў «Панскі гайдук», «Падуанскі студэнт», аповесцяў, успамінаў, літаратурна-крытычных артыкулаў. Памёр у 1973 годзе.

1865 год — звольнены акцёр Джон Бут у Вашынгтонскім тэатры смяротна параніў прэзідэнта ЗША Аўрама Лінкальна. У той жа дзень прыхільнік Поўдня Льюіс Паўэл нанёс некалькі нажавых раненняў у горла дзяржсакратару ЗША Уільяму Сюарду, але той дзіўным чынам выжыў і праз два гады купіў у Расіі Аляску.

Цытата дня:

«Хтосьці сказаў, што рабаўнікі патрабуюць кашалёк ці жыццё; а жанчыны патрабуюць і адно, і другое».

Сэмюэл Батлер (1835—1902), англійскі пісьменнік.

БЕЛЫ ТЫДЗЕНЬ

свет і сусвет чалавека

Апошнія шэсць дзён перад Вялікаднем у славян былі пазначаны статусам асаблівай павагі і прынцыпова дакладным стаўленнем да космасу свайго жытла і працы. Кожны з іх набліжаў чалавека да канчатковай перамогі Дня над Ноччу, а ў хрысціянскай традыцыі — Жыцця над Смерцю. Таму сустрэчы такой незвычайнай падзеі папярэднічала карпатлівае абнаўленне ўсяго навакольля. Першыя дні тыдня былі прысвечаны навядзенню парадку, спачатку, калі можна так сказаць, на перыферыйных абшарах сядзібы — у двары (у садзе, агародзе, хляве), а затым ужо ў хаце — у цэнтры сялянскага сусвету, таму гэтыя дні называлі «чыстыя»: Чысты панядзелак, Чысты аўторак, Чысты чацвер.

● У Чысты *панядзелак* пачыналі наводзіць парадак у двары, каля гумна, хлява, адусюль выграбалі мінулагодняе смецце. Абавязкова прыбіраліся ў садзе, спальвалі або закопвалі старое лісце і сухое галлё. Менавіта ў гэты дзень бялілі хату і ўсе дваровыя пабудовы. Наводзілі парадак і ў хляве: чысцілі хатнюю жывёлу, выкідвалі гной.

● У *аўторак* пачыналі наводзіць парадак у хаце. Усё хатняе начынне выносілі, перасушвалі, выбівалі пыл, вымывалі вокны, вымяталі з усіх закуткоў смецце, бялілі печ, абавязкова мылі бялізну: «У чысты панядзелак і аўторак няможна ў хаце трымаць чаго-небудзь нячыстага, бо на людзей і на гавяда нападуць паршы».

● У *сераду* на перадвелікодным тыдні трэба было вымыць усё драўлянае: дзяжу, хлебную лапату, выскрабалі сталы, лавы і г.д. Таму і дзень атрымаў такую незвычайную назву — Дравяная страсць.

● На працягу сямітыднёвага посту хлебная дзяжа шматразова бывала ў цэнтры ўвагі. Так, на Палессі ў першую суботу посту хлебную дзяжу трэба было вымыць, абкруціць ядлоўцам, пакласці на дно вугельчык і накрыць чыстым ручніком. Казалі, што ў гэты дзень адбываецца «споведзь дзежкі», таму трэба, каб яна была «прыбраная». Расчыняць у гэты дзень хлеб забаранялася. На Піншчыне дзяжу трэба было вымыць у суботу на Пахвальным (пятым) тыдні посту. Ваду пасля таго, як вымылі дзяжу, трэба было абавязкова выліць на сцяну хаты. Асаблівую ўвагу прыладам, з дапамогай якіх будзе выпечаны «велікодны хлеб» — дзяжы і хлебнай лапаце — надавалі ў сераду перад Вялікаднем.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Народны сродак: мачагоннае.

Бручку, рэдзьку, шчаўе, кветкі папараці і лісце лістоўніцы здрабніць і знішчыць. Замест гэтага выпіць восем куфляў піва.

☺

У кабінеце неўрапатолага:

— Вам даводзілася перажываць нервовыя ўзрушэнні?

— Аднойчы проста ў мяне на вачах кампутар спіртам прамылі!

☺

Існуюць пяць прычын, па якіх жанчыны купляюць сукенкі.

1. Каб спадабацца суседу.

2. Каб вывесці з сябе суседку.

3. Таму што ні ў каго няма падобнага.

4. Таму што ўсе такія носяць.

5. Таму што!

☺

Мой сусед купіў свайму пяцігадоваму дзіцяці PlayStation 3. І нават на піва цяпер не заходзіць...



БЕЛАРУСБАНК

ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

«Семьдесят первого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 09 апреля 2009 года в г. Минске.

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

Номера счетов	Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада	Номера счетов	Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада
А034	112 (Сто двенадцать)	А559	112 (Сто двенадцать)
А065	112 (Сто двенадцать)	А576	112 (Сто двенадцать)
А115	112 (Сто двенадцать)	А638	112 (Сто двенадцать)
А144	112 (Сто двенадцать)	А679	112 (Сто двенадцать)
А161	225 (Двести двадцать пять)	А687	112 (Сто двенадцать)
А225	112 (Сто двенадцать)	А734	112 (Сто двенадцать)
А252	112 (Сто двенадцать)	А789	112 (Сто двенадцать)
А313	450 (Четыреста пятьдесят)	А825	112 (Сто двенадцать)
А354	112 (Сто двенадцать)	А864	112 (Сто двенадцать)
А375	900 (Девятьсот)	А886	112 (Сто двенадцать)
А402	450 (Четыреста пятьдесят)	А944	112 (Сто двенадцать)
А440	112 (Сто двенадцать)	А965	225 (Двести двадцать пять)
А519	112 (Сто двенадцать)		

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т.е. за №№ А034, А1034, А2034 и т.д.

Председатель комиссии:
Галина Евгеньевна Канапацкая — начальник отдела организационно-кадровой работы Администрации Советского района г. Минска

Ответственный секретарь:
Татьяна Александровна Ясинская — заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Свидетельство о государственной регистрации Министерства торговли Республики Беларусь № 1367 от 27.03.2009 г.

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2008 г., млн. белорусских рублей.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2008 г.
Вклады до востребования	5,6	43,8	67,5	110,0	128,9	141,0	497,5	516,8	301,4	676,7	522,2	31729,2	34740,6
в том числе: в белорусских рублях	5,0	42,2	65,0	105,8	125,4	135,2	491,2	506,5	290,5	660,8	510,2	31627,1	34564,9
в иностранной валюте	0,6	1,6	2,5	4,2	3,5	5,8	6,3	10,3	10,9	15,9	12,0	102,1	175,7
Срочные депозиты	8577,5	10960,6	14850,6	10096,0	40533,6	64733,2	53206,9	45772,1	71982,2	57766,9	48722,4	85754,2	512956,2
в том числе: в белорусских рублях	8326,4	10439,5	10302,9	9800,2	30827,4	49986,5	42431,2	34762,4	57053,7	46908,0	37328,7	59971,3	398138,2
в иностранной валюте	251,1	521,1	4547,7	295,8	9706,2	14746,7	10775,7	11009,7	14928,5	10858,9	11393,7	25782,9	114818,0

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Узгадаць усіх

ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ, А ПАРАТУНКУ НЯМА

Малады магілёўскі скульптар Аляксандр Мінькоў перамог у творчым конкурсе на лепшы праект мемарыяльнага знака ў памяць пра пацыентаў Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы, якія былі забітыя нямецкімі акупантамі ў 1941-42-х гадах.

Гэты знак будзе ўсталяваны сёлета на старым бальнічным будынку, які захаваўся да нашых дзён. Менавіта там фашысты стварылі душагубку, дзе знішчылі каля 1,5 тысячы хворых і бездапаможных людзей, якіх лічылі непатрэбнымі грамадству і нявартымі жыцця. Іх атручвалі аўтамабільнымі выхлапнымі газамі, каб вызваліць будынкі псіхіятрычнай бальніцы для вайсковых мэтаў.

Сумесны беларуска-нямецкі праект «У памяць пра загубленыя душы» ініцыявалі калегі — медыкі з псіхіятрычнай бальніцы Магілёва і ўніверсітэцкай клінікі Хайдэльберга. Іх аб'яднала слушная выснова: хто забывае сваё мінулае, той асуджаны на яго паўтарэнне.

Да абмеркавання мемарыяльнага знака далучылася грамадскасць у абедзвюх краінах. У журы, якое вызначыла лепшы праект, увайшлі медыкі, мастацтвазнаўцы, ідэолагі, дэпутаты, прадстаўнікі ўлады. І немцы, і беларусы аднадушна аддалі першую прэмію Аляксандру Міньковy: ён здолеў перадаць трагедыю простымі формамі — усяго толькі чалавечай постаццю і маленькім ваконцам.

— Гэта сімвал, і не трэба словаў, каб яго зразумець, — пракаментаваў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**, які аддаў свой голас за гэту работу. — Чалавек гіне, і яго рукі цягнуцца да ратавання. Такі памятны знак робіць вялікае ўражанне.

— Тут зразумелая безвыходнасць: паратунку няма, а хочацца жыць, — дадаў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег САКАДЫНЕЦ**. — Чалавек, нават калі ён пазбаўлены розуму, адчувае пагрозу смерці. Ён цягнецца да святла і паветра. Але праз тое вакенца ўверсе толькі што душа адыдзе ў сусвет.

— Помнік выразны ў сваёй прастаце, — сказала Развіта Лаўтэр з Хайдэльберга. — Людзі любой нацыянальнасці зразумеюць яго сутнасць.

Сімвалічна, што аўтар лепшага праекта — малады магілёвец, які вырас непадалёк ад псіхіятрычнай бальніцы ў Пячэрску. Аляксандр Міньковy добра ведае гэтыя мясціны з дзяцінства і знаёмы з жахлівымі гісторыямі, якія з імі звязаны.

Напрыклад, у гэтай псіхбальніцы напрыканцы 1930-х гадоў скончылася жыццё Цішкі Гартнага. Цяпер непадалёк усталяваны стылізаваны пад крыж знак у памяць пра гэтага вядомага беларускага дзеяча, рэпрэсаванага пісьменніка.

Новы знак — памяць пра іншыя падзеі, але таксама малавядомыя ў Беларусі. Матэрыялы па знішчэнні хворых у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы фігуравалі ў якасці абвінавачання на знакамітым Нюрнбергскім працэсе. Страшным злачынствам супраць чалавецтва называюць праграму нямецкага рэйха «Эўтаназія», у выніку якой былі знішчаны тысячы псіхічна хворых людзей.

— Побач з памятным знакам мы хочам зрабіць інфармацыйную дошку на дзвюх мовах пра гэту трагедыю і яе ахвяраў, — патлумачыў **доктар медыцыны, супрацоўнік універсітэцкай клінікі Мюнхена Герыт ХОЭНДОРФ**. — Цяпер над гэтым працуюць студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аляксандр Міньковy атрымаў прэмію ў 200 еўра і заказ на выраб памятнага знака. Ён будзе ўсталяваны і ўрачыста адкрыты ў ліпені.

Ілона ІВАНОВА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1985. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12